Права на льготны крэдыт маюць грамадзяне, якія больш за 10 гадоў жывуць у інтэрнатах і не маюць ва ўласнасці жылля, прычым цяпер неабходна мець доказы, што яны там сапраўды жывуць, а не проста зарэгістраваны. СТАР 3

Ці варта Беларусі далучацца да ўдзелу ў міжнародных праграмах ацэнкі ведаў навучэнцаў PISA, TIMSS і іншых, або лепш стварыць на прасторах СНД ці ЕўрАзЭС сваю сістэму ацэнкі якасці адукацыі? СТАР 5

Аляксандр Рудскіх, заслужаны трэнер СССР, былы галоўны «коўч» зборнай Беларусі па лёгкай атлетыцы, шчыра распавёў пра тое, што хвалюе ў сённяшняй айчыннай лёгкай атлетыцы і спорце наогул. СТАР 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 КАСТРЫЧНІКА 2012 г. АЎТОРАК № 190 (27305) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СУМЕСНЫМІ НАМАГАННЯМІ МЫ МОЖАМ ВЫРАШАЦЬ САМЫЯ СКЛАДАНЫЯ ЗАДАЧЫ

У гэтай пяцігодцы ў Беларусі важнейшым прыярытэтам з'яўляюцца інавацыі, заявіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 1 кастрычніка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод.

«Высокія званні, ордэны і медалі — дастойная ацэнка вашай працы, гордасць для родных, блізкіх і тых, хто працуе побач з вамі. Вы дабіліся выдатных поспехаў, заслужылі павагу і прызнанне як сапраўдныя прафесіяналы і майстры сваёй справы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да ўзнагароджаных.

Прэзідэнт адзначыў: «Заўтрашні дзень Беларусі ў руках ініцыятыўных і мэтанакіраваных людзей, тых, хто хоча зрабіць жыццё лепшым і гатовы прыкласці для гэтага ўсе намаганні. Стараннасць і плённая праца заўсёды ўзнагароджваюцца. І сённяшняя наша цырымонія — яшчэ адно пацвярджэнне гэтага».

Сярод узнагароджаных — прадстаўнікі вытворчага сектара. Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў уклад у развіццё айчыннага прыборабудавання адкрытага акцыянернага таварыства «Пеленг», навукова-вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Атамтэх» і адкрытага акцыянернага таварыства «Дысплэй». Тут асвоілі выпуск канкурэнтаздольнай навукаёмістай прадукцыі, запатрабаванай не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Гэта прыборы для радыяцыйных вымярэнняў, оптыка-электроннае абсталяванне, авіяцыйныя маніторы.

«У бягучай пяцігодцы важнейшы прыярытэт — інавацыі. Таму асаблівая ўвага прыкавана да вашага пошуку, да рэалізацыі новых ідэй і асваення новых тэхналогій», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы асабліва адзначыў той факт, што ў Беларусі «зрабілі стаўку на эканоміку ведаў, а яна ў многім ствараецца намаганнямі дальнабачных кіраўнікоў, таленавітых інжынераў, рацыяналізатараў і вынаходнікаў».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу на поспехі работнікаў ЗАТ «Салігорскі інстытут праблем рэсурсазбяражэння», дзе асвоены выпуск сучаснага горна-шахтавага абсталявання. У аснову яго вытворчасці пакладзены вынаходствы і самыя перадавыя распрацоўкі, іх укараненне прыносіць ужо бачны эканамічны эфект.

У ліку ўзнагароджаных былі ваеннаслужачыя. «Абарона Айчыны ва ўсе часы лічылася ганаровай місіяй. І ў нашы дні вы карыстаецеся заслужанай павагай і даверам грамадства, і людзі на вас спадзяюцца, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы ганарымся тым, што, захоўваючы традыцыі, завешчаныя нам героямі мінулага, пастаянна ўдасканальваем тэхнічнае аснашчэнне Узброеных Сіл і падрыхтоўку асабовага складу. Вы прысвяцілі сябе служэнню Айчыне, ахове міру і спакою грамадзян. Прыміце словы ўдзячнасці за вашу самаадданасць, мужнасць і вернасць абавязку».

Кіраўнік дзяржавы ўзнагародзіў таксама групу спартсменаў і трэнераў: «Многія з вас заваявалі для сваёй краіны спартыўныя ўзнагароды на спаборніцтвах самага высокага ўзроўню або выхавалі чэмпіёнаў, на рахунку якіх нямала рэкордаў».

Высокімі званнямі і дзяржаўнымі ўзнагародамі адзначаны шэраг дзеячаў мастацтва. Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «У цяперашні няпросты час выключна важна, каб мастацтва заахвочвала да дабра і стварэння, сцвярджала маральныя каштоўнасці і пры гэтым ярка, праўдзіва расказвала аб сучасніках».

У ліку ўзнагароджаных былі прадстаўнікі самых розных прафесій. Звяртаючыся да іх, Прэзідэнт падкрэсліў: «Вашы дасягненні дэманструюць поспехі ў вельмі важных сферах жыцця беларускага грамадства. Яны сімвалізуюць тое, чаго краіна дабілася за апошнія гады ў галіне прамысловасці і развіцця тэхналогій, спорту і мастацтва. Вашы веды, вопыт і майстэрства служаць Беларусі і яе народу. Вы даказваеце, што любыя здзяйсненні нам пад сілу і разам мы можам вырашаць самыя складаныя задачы».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У БЕЛАРУСІ СТВАРАЕЦЦА ДЗЯРЖКАМІСІЯ ПА РЭФАРМАВАННІ ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ

Аб гэтым 1 кастрычніка заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам міністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча.

«Мінула, відаць, ужо дастаткова часу для таго, каб вы не проста ўвайшлі ў курс справы, а разабраліся з той сітуацыяй, якая складваецца ў МУС і падпарадкаваных структурах. На вашы плечы ўскладзена цяжкая задача па рэфармаванні МУС, — сказаў Прэзідэнт. — Я ўжо ўдакладняў гэту задачу публічна ў агульных рысах: нам не патрэбна ніякая ломка МУС, а таксама перайменаванняў, фармальных мерапрыемстваў быць не павінна. Мы павінны спакойна правесці гэта рэфармаванне, зрабіўшы некалькі крокаў. Калі мы гатовы зрабіць першы крок у нейкім напрамку, значыць, мы павінны зрабіць, не разбураючы структуру, не парушаючы прынцыпаў работы міліцыі». СТАР 2

ЖУРАЎЛІ ТАМ, ДЗЕ ЖУРАВІНЫ

Першае ў Беларусі свята ў гонар шэрага жураўля і галоўнай балотнай ягады — журавіны прайшло ў Мёрах. Птушку-чырвонакніжніцу і чырвоную сакавітую журавінку аб'ядноўвае тут адно з самых буйных у Еўропе балот — Ельня. Якраз цяпер на ім поўным ходам ідзе нарыхтоўка насельніцтвам журавінавых запасаў. І менавіта ў гэтыя дні да адлёту ў вырай рыхтуецца вялікая жураўліная чарада.

Арганізатары свята імкнуліся падкрэсліць унікальнасць Ельні, давесці да ўсіх неабходнасць яе захавання. Для ўдзельнікаў свята былі арганізаваны «агледзіны» журавоў непасрэдна на палетках, дзе перад выраем кормяцца тысячы птушак.

На гэтым святе дзеці і дарослыя спявалі пра жураваў, дбайныя гаспадыні частавалі кулінарнымі вырабамі з журавін. А ўдзельнікі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» змайстравалі з паперы самага вялікага ў Беларусі жураўля.

Напярэдадні свята абапал Ельні прайшоў штогадовы падлік жураваў, у правядзенні якога вялікую дапамогу аказаў праект ПРААН у галіне аховы навакольнага асяроддзя Беларусі. Было падлічана, што цяпер на Ельні знаходзяцца каля 4000 жураўлёў і 10 000 гусей.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Мёрскі раён.

Жураўлі на полі каля балота Ельня.

Дзеці з вёскі Дворнае Сяло дапамагаюць весці падлік жураўлёў.

Жыхарка вёскі Чэрасы Сняжана АКСЁНАВА з журавінамі, сабранымі на Ельні.

ВЫПРАБАВАННЕ ЗОРКАМІ

Сённяшнім вечарам на мінскім стадыёне «Дынама» барысаўскі БАТЭ правядзе свой другі матч у групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў. Сапернік нашага чэмпіёна адмысловай прэзентацыі не патрабуе. Мюнхенская «Баварыя» — чатырохразовы пераможца Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў, клуб, які больш за ўсіх (22 разы) перамагаў ва ўнутраным першынстве.

Аднак беларусы немцаў не баяцца. Зразумела, за мюнхенцаў гуляюць выдатныя майстры, сапраўдныя зоркі (Франк Рыберы, Анатоль Цімашчук, Марыё Гомес, Бастыян Швайнштайгер, Ар'ен Рабэн), але БАТЭ ўжо мае той еўракубкавы досвед, які дазваляе на важныя матчы выходзіць без дрыжыкаў у каленках. Тым больш нядаўна беларусы перамаглі французскі «Ліль» і атрымалі першую ў гісторыі лігачэмпіёнскую вікторыю.

— Мы маем вопыт падобных супрацьстаянняў, супакой перад гэтымі паядынкамі, — адзначае ў гутарцы з журналістамі Віктар Ганчарэнка, галоўны трэнер барысаўскага БАТЭ. — У «Баварыі» зараз цудоўная пераможная серыя. Але не трэба забывацца на тое, што мы таксама ў добрай гульнявой форме.

Акрамя таго, Віктар Міхайлавіч адзначыў, у калектыве пануе добры настрой, здавацца каманда не збіраецца, а разлічвае прадэманстраваць добры футбол і даць бой вядомаму сапернiку. Ганчарэнка прызнаўся, што ў юнацтве за «Баварыю» «не хварэў», больш папулярнай была італьянская «Серыя А». Але «Бундэслігу» ён лічыць турнірам, які вельмі прагрэсуе. «Там шалёная запаўняльнасць стадыёнаў. Матчы праходзяць на высокіх хуткасцях. Лічу гэты чэмпіянат адным з мацнейшых у Еўропе».

У сваю чаргу Арцём Радзькоў, абаронца БАТЭ, падкрэсліў, што ніякага піетэту да ног Франка Рыберы няма. Ёсць павага да сапернікаў, але не больш за гэта.

Балелыщыкі «Баварыі» сустракаюць сваіх любімцаў.

Пакуль супрацоўнікі арэны канчаткова ўпрыгожвалі стадыён, «Баварыя» прыехала на клубным аўтобусе да атэля «Краўн Плаза». Не, клуб, безумоўна, прыляцеў самалётам, але, як паведамілі ў прэс-службе «чырвоных», псіхалагічна камандзе больш утульна ў другіх гарадах рухацца на сваім транспарце. Любімчыкаў каля гатэльных муроў сустракала цэлая армада фанатаў. А самыя дасціпныя нават арандавалі жытло ў доме, што насупраць гасцініцы, вывесілі з акна палотнішча з лагатыпам нямецкай каманды. СТАР 4

ЧЫГУНКА — АМАТАРАМ ФУТБОЛА

Для перавозкі пасажыраў і балельшчыкаў на міжнародны футбольны матч групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў УЕФА паміж БАТЭ і ФК «Баварыя» будуць прызначаны прыгарадныя электрацягнікі.

Як удакладнілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, 2 кастрычніка гэта будзе электрацягнік Барысаў — Мінск адпраўленнем з Барысава ў 19.05, прыбыццём у Мінск у 20.13 (без прыпынкаў), 3 кастрычніка — электрацягнік Мінск — Барысаў, які адправіцца са сталіцы ў 1.07 і прыбудзе ў Барысаў у 2.18 (без прыпынкаў).

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 20
Віцебск	+ 13°
Гомель	+ 17°
Гродна	+ 17°
Магілёў	+ 13°
Мінск	+ 16°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.10.2012 г.

Долар ЗША	8410,00 ▼
Еўра	10820,00 ▼
Рас. руб.	269,00 ▼
Укр. грыўня	1032,16 ▼

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў КАСТРЫЧНІКУ

4, чацвер, 6.30 — 11.00
5, пятніца, 20.00 — 24.00
6, субота, 0.00 — 24.00
8, панядзелак, 7.30 — 24.00
9, аўторак, 0.00 — 10.30
10, серада, 20.30 — 24.00
11, чацвер, 0.00 — 18.30
13, субота, 3.30 — 22.00
15, панядзелак, 11.30 — 23.00
17, серада, 1.30 — 24.00
19, пятніца, 19.30 — 24.00
20, субота, 0.00 — 1.00
22, панядзелак, 2.30 — 4.00
24, серада, 0.30 — 10.00
26, пятніца, 14.00 — 18.30
28, нядзеля, 2.30 — 0.00
29, панядзелак, 0.00 — 5.00

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАВЕТРАНЫ ШАРЫК ВЫВЕЎ З ЛАДУ ГАЛОЎНЫ АВІЯРАДАР АФІН

Звычайны надзіманы шарык, напоўнены геліем, выклікаў перабоі ў рабоце галоўнага радара грамадзянскай авіяцыі ў Афінах ў мінулыя выхадныя, што пацягнула за сабой адмену некалькіх рэйсаў. Сувязь з радарам, які адсочвае сітуацыю ў небе ў раёне Афін і грэчаскай Македоніі, была перапынена ў суботу больш чым на адну гадзіну ў сувязі з адключэннем электраэнергіі, паведамілі ў Федэральным агенцтве паветранага транспарту Грэцыі.

РАСІЯН ПАЗБАВЯЦЬ МАГЧЫМАСЦІ ВЫБІРАЦЬ МЕСЦА НА МОГІЛКАХ

Федэральная антыманапольная служба РФ вырашыла паставіць расіян у чаргу па месцы на могілках з мэтай барацьбы з карупцыяй на гэтым рынку паслуг. Паводле новага законапраекта, грамадзяне больш не змогуць выбіраць упадабаныя ім месцы для пахавання. Папраўкі ў заканадаўства таксама прадугледжваюць адкрыццё прыватных могілак, якіх раней не было ў Расіі.

ШЭСЦЬ ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛІ ПРЫ КРУШЭННІ САМАЛЁТА Ў АЎСТРЫІ

Шэсць чалавек загінулі і яшчэ двое атрымалі раненні ў выніку крушэння невялікага прыватнага самалёта маркі Cessna на захадзе Аўстрыі, паведамляюць інфармагенцтвы. Самалёт, які накіроўваўся ў Іспанію з аўстрыйскага горада Інсбрук, зваліўся на зямлю праз 20 хвілін пасля ўзлёту ў гарах на вышыні 1600 м. Усе, хто быў на борце — грамадзяне Аўстрыі.

ДЛЯ ЛЯЧЭННЯ АПЕНДЫЦЫТУ АПЕРАЦЫЯ ЗУСІМ НЕ ПАТРЭБНА?

Эксперты даведаліся, што 8 з 10 выпадкаў апендыцыту можна вылечыць з дапамогай антыбіётыкаў, адмовіўшыся ад аперацыі. Як перадае The Telegraph, лекавая тэрапія такая ж эфектыўная, як і выдаленне апендыкса. Джанет Хансан з Універсітэта Гетэборга пасля аналізу клінічных даследаванняў прыйшла да высновы, што ў некаторых выпадках аперацыя — адзіны варыянт для пацыента, чый стан вельмі цяжкі. Але ў 80% выпадкаў праблему можна вырашыць з дапамогай антыбіётыкаў. Да таго ж лекавая тэрапія звязваецца з меншай колькасцю ускладненняў у параўнанні з аперацыяй.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У АФГАНІСТАНЕ ЗАГІНУЎ ДВУХТЫСЯЧНЫ САЛДАТ ЗША

Страты амерыканскай арміі ў Афганістане дасягнулі 2 тысяч чалавек.

Колькасць ахвяр нябўхільна расла на працягу некалькіх месяцаў. Трагічная мяжа была дасягнута ў мінулую суботу ў выніку чарговага сутыкнення паміж афганскімі сіламі бяспекі і войскамі міжнароднай кааліцыі ў правінцыі Вардак, паведамляе агенцтва АР. Цяперашняя сутычка забрала жыцці двух грамадзян ЗША — вайскоўца і супрацоўніка адной з фірмаў-падрадчыкаў кааліцыі. Акрамя таго, загінулі трое афганскіх салдат.

КАРОТКА

Па выніках работы за восем месяцаў сярэднямесячная заработная плата ў Мінску дасягнула памеру Br4 млн 393,3 тыс., у тым ліку ў жніўні работнікі атрымлівалі ў сярэднім Br5 млн 92,9 тыс. Найбольш высокаплатнымі застаюцца сферы: фінансавая (Br7 млн 877 тыс.), будаўніцтва (каля Br6,3 млн), транспарту і сувязі (больш за Br5,9 млн), прамысловасці (Br5,3 млн).

Дыферэнцаваная аплата электрычнай энергіі ў Беларусі будзе прывязана да даходаў насельніцтва. Аб гэтым заявіў віцэ-прэм'ер Анатоль Калінін. Ён таксама паведаміў, што знойдзены механізм дыферэнцыяцыі аплаты электраэнергіі для грамадзян з улікам сацыяльнага стандарту і аб'ёмаў спажывання. Пры гэтым за перарасход беларусы не будуць поўнасцю аплачваць рэальны кошт кілавата. А неабароненым слаям насельніцтва дзяржава дапаможа аплачваць камунальныя паслугі.

Па выніках на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы 1 кастрычніка да долара беларускі рубель зафіксаваў пазіцыю Br8 410/1$ (на папярэдніх таргах 28 верасня — Br8 500/1$), да еўра — Br10 820 за 1 еўра (28 верасня — Br10 990 за 1 еўра), да расійскага рубля — Br269 (28 верасня — Br275 за 1 расійскі рубель).

ЦІ СТАЛІ ДЛЯ ВАС ЗАНЯТКІ ФІЗКУЛЬТУРАЙ І СПОРТАМ НОРМАЙ ЖЫЦЦЯ?

Аляксандр СЕРГІЕНКА, выкладчык Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:

— Не тое што сталі нормай жыцця — фізкультура і спорт маюць проста каласальныя патэнцыяльныя магчымасці ў справе выхавання асобы. Адзін філосаф сказаў: хто падзяляе душу і цела, той не мае ні аднаго, ні другога. Таму калі вы хочаце развівацца гарманічна — займайцеся спортам. Спорт сёння замяняе, так бы мовіць, функцыю вайны, выхоўвае калектывізм. І самае галоўнае ў спорце — навучыцца бачыць у саперніку не свайго ворага, па сутнасці, свайго партнёра, сябра, трэнера. Бо гэты сапернік, калі ён мацнейшы, можа зрабіць мяне лепшым, чым я ёсць цяпер.

Аляксандр МІШЧАНКА, урач-тэрапеўт:

— Фізкультура і спорт — гэта неад'емная частка майго жыцця. Актыўна займаюся з дзяцінства, нават узнікла дылема: быць спартсменам альбо медыкам? У выніку выбраў медыцыну, але, тым не менш, не развітаўся і са спортам. Перавагу аддаю футболу, захапляюся і іншымі відамі. Гэта дае мне галоўнае — здароўе, якое дапамагае ў працы. Да таго ж спорт рыхтуе цябе да розных непрадбачаных, экстрэмальных сітуацый. Як бывае ў спорце — так здараецца і ў жыцці.

Уладзімір ДЗІКЛОЎ, старшыня рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў энергетыкі, электратэхнічнай і паліўнай прамысловасці:

— Спорт са мной на працягу ўсяго жыцця. Быў прафесійным футбалістам, гуляў за каманду майстроў «Дзвіна», у камандах «Лакаматыў», «Будаўнік». А ў рэспубліканскім камітэце прафсаюза стварыў фізкультурна-спартыўны клуб «Энергетык», які праводзіць рабочыя спартакіяды (зімовую і летнюю), спартакіяду кіруючых работнікаў. Таксама арганізуем міжнародны турнір па міні-футболе сярод энергетыкаў краін СНД, які праходзіць у Новалукомлі. Пры гэтым імкнуся не толькі арганізоўваць спаборніцтвы, але і ўдзельнічаць у іх. Напрыклад, летась каманда ветэранаў нашага галіновага прафсаюза (каму 40 і больш гадоў) стала чэмпіёнам рэспублікі.

Падрыхтаваў Барыс ПРАКОПЧЫК. Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

ДАДЗЕНА ВЫСОКАЯ АЦЭНКА АДНОСІНАМ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА З КІТАЕМ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Ху Цзіньтаа з нацыянальным святам — Днём утварэння КНР.

У віншаванні гаворыцца, што ў Беларусі шчыра рады росту ўплыву Кітая на сусветнай арэне і ўражальным поспехам кітайскага народа, дасягнутым пад мудрым кіраўніцтвам Камуністычнай партыі.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што рашэнні маючага адбыцца XVIII з'езда Камуністычнай партыі Кітая дадуць магчымасць вызначыць новыя грандыёзныя задачы па развіцці краіны і павышэнні дабрабыту кітайскага народа на чарговую пяцігодку. Прэзідэнт Беларусі пажадаў з'езду паспяховай і плённай работы.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў Ху Цзіньтаа за вялікі ўклад ва ўмацаванне беларуска-кітайскіх адносін і запэўніў, што супрацоўніцтва з вялікім Кітаем і ў далейшым будзе важнейшым напрамкам знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў: «Мы асабліва ўдзячныя брацкаму Кітаю за нязменную падтрымку праводзімага Рэспублікай Беларусь курсу на ўмацаванне суверэнітэту нашай дзяржавы, высока цэнім адносіны стратэгічнага партнёрства, заснаваныя на ўзаемным даверы, шчырай павазе і зацікаўленасці адзін у адным».

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ВАНЕСУ КАЛАДЗІНСКУЮ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па вольнай барацьбе Ванесу Каладзінскую з перамогай на чэмпіянаце свету па вольнай барацьбе. «Мэтанакіраванасць, самаддача і воля да перамогі вызначаюць сапраўднага спартсмена. Менавіта гэтыя якасці дапамаглі табе дабіцца першынства на такіх прэстыжных спаборніцтвах», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

ЗАВЯРШАЛЬНАЯ СЕСІЯ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ ЧАЦВЁРТАГА СКЛІКАННЯ АДКРЫЕЦЦА 2 КАСТРЫЧНІКА

Дзявятая сесія Савета Рэспублікі чацвёртага склікання адкрыецца 2 кастрычніка, паведаміла БЕЛТА ў прэс-службе верхняй палаты беларускага парламента.

Будуць сфарміраваны рабочыя органы сесіі: сакратарыят і падліковая камісія. Таксама будуць унесены змяненні ў рэгламент Савета Рэспублікі. З уступным словам перад парламентарыямі выступіць старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль Рубінаў. Пасля завяршэння першага пасяджэння дзявятай сесіі ў той жа дзень у Савеце Рэспублікі пад старшынствам Анатоля Рубінава пройдзе семінар, прысвечаны развіццю дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы інавацыйнай дзейнасці. Плануецца, што аб заканадаўчых асновах гэтага працэсу раскажа старшыня Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях Ігар Войтаў.

«Белая Русь» паспяхова рэалізуе свае праекты ў фармаце грамадскага аб'яднання

Такое меркаванне БЕЛТА выказаў старшыня аб'яднання Аляксандр Радзькоў, падводзячы вынікі мінулых парламенцкіх выбараў на пасяджэнні Прэзідыума Рэспубліканскага савета «Белай Русі» ў Мінску.

«Цяперашнія выбары ў парламент паказалі, што наша грамадскае аб'яднанне неадрыўнае ад народных інтарэсаў. І народ гэта ацаніў — 63 члены «Белай Русі» сталі дэпутатамі парламента», — сказаў Аляксандр Радзькоў. «Мы былі па-сапраўднаму актыўныя, сістэмныя ў рабоце, а адпаведна — рэзультатыўныя», — дадаў ён.

Аляксандр Радзькоў адзначыў, што грамадскае аб'яднанне актыўна выступала на баку кандыдатаў, якія падтрымліваюць дзеючую палітычную сістэму. У той жа час ён адзначыў, што некаторым трэба больш актыўна працаваць з патэнцыяльнымі выбаршчыкамі, аналізаваць кантынгент выбарчых участкаў, дакладна растлумачваць свае функцыі.

Прадстаўнікі «Белай Русі» працавалі ў складзе выбарчых камісій, выступалі на выбарах у якасці наглядальнікаў, працавалі на агітацыйных пікетах. Усяго па краіне была арганізавана работа больш як тысячы агітацыйных пікетаў. «Пры правядзенні выбарчай кампаніі мы выкарыстоўвалі наш ранейшы палітычны вопыт, аднак назапашаны патэнцыял неабходна рэалізоўваць паступова, прымаючы ўдзел у важнейшых сацыяльных, палітычных падзеях краіны», — сказаў Аляксандр Радзькоў.

Усяго ў арганізацыйна-практычных мерапрыемствах па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў прынялі ўдзел больш як 40 тыс. членаў РГА «Белая Русь», што складае 30 працэнтаў ад агульнай колькасці аб'яднання. Рэспубліканскі штаб, які быў створаны пры арганізацыі, узаемадзейнічаў з Цэнтральнай выбарчай камісіяй, сродкамі масавай інфармацыі, каардынаваў дзейнасць арганізацыйных структур аб'яднання па ўсіх напрамках. Сярод выбраных у дэпутаты членаў «Белай Русі» — педагогі, урачы, кіраўнікі сельскагаспадарчых і прамысловых прадпрыемстваў, дзяржслужачыя, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў чацвёртага склікання. Праведзеная выбарчая кампанія паказала, што ўсе структуры РГА «Белая Русь» працуюць зладжана, прафесійна, што спрыяе паспяховаму вырашэнню пастаўленых задач.

Што датычыцца планаў на будучыню, старшыня аб'яднання адзначыў: «Мы плануем і ў далейшым развіваць нашы сацыяльныя і палітычныя праекты». Члены арганізацыі будуць актыўна весці работу па палітычнай адукацыі грамадзян шляхам публікацыі аналітычных артыкулаў у цэнтральнай прэсе і рэгіянальных СМІ, правядзення круглых сталоў, выступлення на сходах пярвічных арганізацый з запрашэннем членаў працоўных калектываў па асноўных пытаннях дзяржаўнага кіравання і развіцця грамадзянскай супольнасці.

Колькасць РГА «Белая Русь» на 1 верасня 2012 года складае 132 тыс. 706 чалавек. Толькі за студзень—верасень у рады аб'яднання ўступілі 5 тыс. 804 чалавекі.

ЦЫГАРЭТЫ КРЫХУ ПАДАРАЖЭЛІ

З пачатку месяца ў краіне падаражэлі некаторыя маркі цыгарэт.

Гаворка ідзе пра тытунёвыя вырабы першай і другой цэнавых груп, якія рэалізуюцца ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» і ААТ «Тытунь-Інвест». Павелічэнне рознічнай цаны склала ад 1,9 да 12,9 працэнта. У рублёвым «вымярэнні» павелічэнне кошту цыгарэт складзе прыкладна 100-500 рублёў. Напрыклад, за пачак тытунёвых вырабаў «Фэст» цяпер трэба будзе аддаць на 100 рублёў больш, а пачак «Мінска» будзе каштаваць на 250-400 рублёў больш, чым дагэтуль.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ТОЛЬКІ СТРЭЛ СПЫНІЎ «П'ЯНЫЯ «ЖЫГУЛІ»

Пераслед аўтамабіля «ВАЗ 2110», кіроўца якога неадэкватна паводзіў сябе на дарозе, пачалося ў вёсцы Побалава Рагачоўскага раёна.

Інспектары на службовай машыне ДАІ зрабілі некалькі спроб з дапамогай маячкоў сіняга і чырвонага колеру і гукавой сігналізацыі спыніць 24-гадовага маладога чалавека, які раз'язджаў па раёне. Аднак кіроўца толькі рэзка павялічваў хуткасць і пачынаў хавацца. Не рэагуючы на патрабаванні спыніцца, мужчына двойчы на вялікай хуткасці выязджаў на аўтадарогу Мінск — Гомель, стварачы рэальную пагрозу іншым удзельнікам руху. Менавіта тады супрацоўнікамі ДАІ было прынята рашэнне выкарыстаць табельную зброю — аб чым звар'яцелага кіроўцу зноў жа папярэдзілі, у тым ліку стрэлам у паветра. Аднак прыпынілі яго рух толькі рэальныя 2 прыцэльныя стрэлы ў задняе левае кола. На закругленні дарогі кіроўца з'ехаў у кювет. Як высветлілася, акрамя зламысніка, у аўтамабілі знаходзілася яшчэ тры пасажыры. Пры затрыманні ніхто не пацярпеў, аднак кіроўца і пасажыр аўтамабіля аказалі супраціўленне супрацоўнікам міліцыі і былі дастаўлены ў мясцовы аддзел унутраных спраў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Калектыў Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта выказвае шчырыя спачуванні дэкану факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Ганне Іванаўне Басавай з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.

У БЕЛАРУСІ СТВАРАЕЦЦА ДЗЯРЖКАМІСІЯ ПА РЭФАРМАВАННІ ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў працэсе рэфармавання не павінна быць дэстабілізавана сама работа МУС. Больш таго, яна павінна быць палепшана. «Яна павінна быць больш эфектыўнай», — адзначыў Прэзідэнт.

«Ну а самае галоўнае — мы ні ў якім выпадку не павінны пакрыўдзіць людзей у пагонах. Гэта не нейкі папулісцкі лозунг — так сапраўды павінна быць. Таму што яны ж нікуды не дзенуцца, застануцца ў нашым грамадстве. А гэта найбольш уплывовыя людзі, да іх грамадства прыслухоўваецца, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Таму крыўдзіць людзей ні ў якім выпадку нельга. «Крыўдзіць» можна тых, хто не хоча працаваць, хто здраджвае інтарэсам службы. Вось з такімі трэба без шкадавання расставацца. Але калі хтосьці памыліўся, трапіў у міліцыю не па закліку сэрца, няхай ён ідзе на іншую работу».

«Мы павінны пакінуць здаровы, моцны не проста касцяк, а кулак у МУС, які дастойна будзе несці сваю службу і ў аснову не будзе ставіць нават грашовае забеспячэнне. Гэта, вядома, важна, але ён павінен найперш гаварыць аб службе. Я ўжо гаварыў, што вельмі дрэнна ўспрымаю ваенных, якія перш чым гаварыць аб службе, аб сваім абавязку, пачынаюць крычаць аб зарплаце і кватэрах. Зразумела, што гэтыя пытанні мы павінны вырашаць, і мы іх будзем вырашаць. Але, рэфармуючы МУС, падпарадкаваныя структуры, міліцыю наогул, мы павінны вельмі акуратна да гэтага падыходзіць. Лепш не спяшацца. Але галоўнае — не пакрыўдзіць людзей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама паведаміў, што рэфармаванне ў бліжэйшы час закране не толькі органы міліцыі, але і іншыя дзяржаўныя органы: «Я сёння даручыў стварыць дзяржаўную камісію. Яе ўзначаліць кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Памочнік кіраўніка дзяржавы Наталля Пяткевіч будзе ў яго намеснікам. Яны збяруць дзяржаўную камісію па рэфармаванні органаў дзяржаўнай улады».

«Лічу, што нам давядзецца значна скараціцца ў дзяржаўных структурах, думаю, працэнтаў, прыкладна, на 25-30. Унізе менш, уверсе больш, устараніўшы непатрэбныя функцыі і значна пасля павялічыўшы грашовае забеспячэнне і заработную плату дзяржслужачых. І адсюль — міліцыі, ваенным і гэтак далей, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Я разумею, што мы адразу з гэтай задачай не справімся, але яе таксама трэба пачынаць. Я гэта гавару таму, што вы павінны арыентавацца не на скарачэнне нейкіх структур з мэтай павелічэння іншых структур МУС, а на скарачэнне ў нейкай ступені ў патрэбных памерах таксама і нашых органаў міліцыі».

«Але мы павінны адразу падумаць аб павелічэнні ўлады міліцыі. Ні ўчастковы, ні міністр, ні іншыя, ніхто не павінен бегаць па дзесяць разоў па адным і тым жа месцы і ўгаворваць кагосьці. Міліцыянер павінен прыйсці і на падставе дакладна заканадаўча прапісаных норм запатрабаваць выканання абавязкаў той ці іншай асобай, і больш там не з'яўляцца, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Тады і колькасць не патрэбна такая».

«Гэта значыць узмоцніцца і адпаведная ўлада службовых асоб у міліцыі, і не толькі ў міліцыі. Тады мы значна можам скарачаць дзяржаўны апарат, міліцыю, іншыя падраздзяленні і значна павялічваць грашовае забеспячэнне і заработную плату. У адваротным выпадку народ не прыме павелічэнне заработнай платы, дапусцім, напалавіну. Народ не ўспрыме, калі ён будзе маленькую зарплату атрымліваць, а мы вялікі бюракратычны апарат будзем фінансаваць намнога вышэй, чым сярэдняя зарплата па краіне. Усё павінна быць сумленна, аб'ектыўна і справядліва. Гэта будучае», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Таму, можа, у нас і не атрымаецца, як мы раней планавалі, мець, дапусцім, участковага і яго памочніка. Можа, узмацніць значна ўладу ўчастковага, каб яму не давялося звяртацца да іншых рычагоў і іншых людзей для рэалізацыі сваіх паўнамоцтваў. Я асабіста гатовы на гэта пайсці. І, лічу, людзі нас зразумеюць. Галоўнае, каб быў мір, спакой у грамадстве і забяспечана бяспека людзей», — дадаў Прэзідэнт.

Ігар Шуневіч далажыў кіраўніку дзяржавы аб папярэдніх выніках работы па рэфармаванні сістэмы органаў унутраных спраў і планах на будучае. Гэты працэс развіваецца па трох асноўных напрамках: ідэалагічнае і кадравае забеспячэнне органаў унутраных спраў, рэфармаванне міліцыі грамадскай бяспекі і рэфармаванне крымінальнай міліцыі. Аляксандр Лукашэнка па выніках сустрэчы даў шэраг даручэнняў адносна далейшай работы ў гэтым ключы, намечаны асноўныя рубяжы і этапы ўдасканалення органаў унутраных спраў. Таксама вырашана, што ў бліжэйшы час на гэту тэму адбудзецца асобная нарада.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

■ Надвор'е

НАС ЧАКАЕ ЦЁПЛЫ КАСТРЫЧНІК

Сёння надвор'е ў Беларусі пагоршыцца. На большай частцы краіны пройдуць дажджы, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.

Тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 12 градусаў па поўначы да 22 цяпла на поўдні краіны. Дажджлівае надвор'е захаваецца і ў сераду. Тэмпература ўначы чакаецца 6—13 градусаў, удзень — 13—20 цяпла, а па паўднёвым усходзе Гомельскай і Магілёўскай абласцей — нават да плюс 21—23 градусаў.

Цёплае і сонечнае надвор'е вернецца да нас у чацвер, калі максімальная тэмпература ўдзень будзе ад 16 да 21 цяпла. Аднак у пятніцу ў заходняя рэгіёны Беларусі завітае чарговы франтальны раздзел з суседняй Польшчы. Амаль паўсюдна там будуць ісці дажджы і ў суботу. Тэмпература паветра ў пятніцу і суботу ўначы 6—13, удзень — 11—18 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ

АБЗАЦ

Завод па перапрацоўцы журавін плануюць пабудаваць у Мёрскім раёне. Тут штогод збіраюць вялікі ўраджай гэтых ягад — летась, напрыклад, 150 т. Аднак захаваліся звесткі, што ў пасляваенны час тут збіралі да 400 т журавін. На першым этапе плануецца арганізаваць прадпрыемства па замарозцы вітамінных ягад.

У Беларусі ўпершыню праводзіцца архітэктурны тыдзень. Ён стартаваў учора. Акцыю арганізуе Мінархітэктуры краіны пры падтрымцы Мінскага гарвыканкама, аблвыканкамаў, Беларускага саюза архітэктараў і Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.

Сям'я з чатырох чалавек загінула каля в. Гарошкі Мінскага раёна. Мінчанін 1991 г.н., які атрымаў правы некалькі месяцаў таму, на аўтамабілі «Альфа-Рамэа 166» пры абгоне зачапіў легкавік, што рухаўся ў сподарожным кірунку. Пасля гэтага аўто з нявопытным кіроўцам вылецела на сустрэчную і сутыкнулася ўлабавую з «Аўдзі-80». У выніку сутыкнення загінулі ўсе, хто быў у «Аўдзі» — кіроўца, жыхар Маладзечна, 1959 г.н., яго дачка, зяць і ўнучка. Трое апошніх памерлі ў бальніцы. Заведзена крымінальная справа.

Дзевяць мінскіх сем'яў — даўжнікоў за паслугі ЖКГ у 2012 годзе — пазбавіліся свайго жылля. Жыльцы дзвюх кватэр выселены без прадастаўлення іншай жылплошчы, да радні, жыльцы сямі кватэр пераехалі ў меншае па плошчы жыллё.

ПОЎНЫ АБЗАЦ

У Кіеве ў суботу, 29 верасня, у дварэ пяціпавярховага інтэрната Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Т. Шаўчэнкі 27-гадовы малады чалавек па невядомай прычыне прасунуў галаву ў металічную канструкцыю паркавай лавы. А вызваліцца самастойна ў яго не атрымалася. Інцыдэнт адбыўся а палове першай ночы. На дапамогу хлопцу прыйшлі выратавальнікі. Пры дапамозе бензарэза яны распілавалі лаву і выратавалі дзівака.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

По объекту: «Реконструкция жилого дома №4 по ул. Д. Сердича с надстройкой мансардного этажа»

Унитарное предприятие «Белоир» Общественного объединения «Белорусское общество инвалидов «Реабилитация» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

Заказчик-Застройщик – УП «Белоир» ОО БОИ «Реабилитация» зарегистрировано Минским горисполкомом, решение № 739 от 5 июня 2001 года в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100195041. Юридический адрес: 220006, г. Минск, ул. Маяковского, 18, к. 9.

Режим работы: понедельник – четверг с 9:30 до 17:00, пятница с 9:30 до 16:00, обед с 13:00 до 13:45, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение предыдущих трех лет организацией строительство не осуществлялось.

Функции заказчика осуществляются собственными силами.

Информация о проекте строительства:

Цель строительства – реализация проекта по договору № С-4 от 10 июня 2010 г. о реализации права проектирования и строительства объекта «Реконструкция жилого дома № 4 по ул. Сердича в г. Минске, с надстройкой мансардного этажа» с УП «ЖРЭО №2 Фрунзенского района г. Минска».

Объект долевого строительства – надстройка мансардного этажа с квартирами типовых потребительских качеств общей площадью – 1599,3 кв.м. Нормативная продолжительность строительства 8,5 мес. Проект реконструкции жилого дома с надстройкой мансардного этажа разработан с учетом проекта капитального ремонта жилого дома. Все архитектурные, конструктивные и инженерные решения увязаны для всего сооружения в целом.

Реконструкция осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – 2-й квартал 2012 года.

Окончание строительства – 1-й квартал 2013 года.

Месторасположение объекта – Фрунзенский район г. Минска, ул. Сердича, дом № 4.

Состав общего имущества: межквартирные лестничные клетки, лестницы, крыши, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, элементы озеленения и благоустройства.

Для привлечения физических лиц и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 г. № 396, по состоянию на дату опубликования проектной декларации, предлагается 8 (восемь) квартир, в т.ч.:

- трехкомнатных – общей площадью 60,0 кв. м. – 6 квартир;
- трехкомнатных – общей площадью 65,8 кв. м. – 2 квартиры.

Стоимость строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, – 8 410 000 (восемь миллионов четыреста десять тысяч) белорусских рублей за 1 кв.м, что эквивалентно 1000 долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

Отделка квартир не выполняется.

Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 кв.м общей площади квартир и их количество считается действительной до момента опубликования новой проектной декларации.

Застройщиком получены:

- Акт выбора места размещения земельного участка для строительства Минского городского исполнительного комитета от 16.03.2010 г.
- заключение РУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» №474-60/11 от 28 июня 2011 г.
- решение МГИ от 15 марта 2012 г. № 769 о разрешении строительства.

Сведения о договорах подряда:

Договор строительного подряда от 20.03.2012 г. № С-4-01, заключенный с ОДО «Стройтехоснова»;

Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, д. 18, тел. (017) 223-58-72.

15 октября 2012 года в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «ЭнКоСтрой»

Повестка дня:

1. О сделках общества.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.
Начало регистрации в 10.00

УНН 191303197

15 октября 2012 года в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Минскэнергострой».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О сделках общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.
Начало регистрации – 11.00.

УНН 100008291

Минский городской территориальный фонд государственного имущества отказывается от проведения аукциона по продаже имущества, находящегося в республиканской собственности, и имущества, находящегося в собственности ОАО «Полиграфкомбинат им. Я.Коласа», расположенного по ул. Красной, 23, объявленного на 15 ноября 2012 года. Извещение о проведении аукциона, опубликованное в газете «Звязда» 27 сентября 2012 г. № 187 (27302), считать утратившим силу. *УНП 100048181*

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0388495 **считать недействительным.** УНП 101883943

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской территориальный фонд государственного имущества извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества (далее – аукцион) **2 ноября 2012 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, д. 8, конт. тел. (8017) 200 20 89, каб. 227.

1	**Сведения о предмете аукциона и его месте нахождения**	На аукцион выставляется имущество, находящееся в республиканской собственности, и имущество, находящееся в собственности ОАО «Полиграфкомбинат им. Я.Коласа», расположенное по ул. Красной, 23 в г. Минске. Отчуждаемое имущество представляет собой комплекс зданий и сооружений, являющихся историко-культурной ценностью Республики Беларусь. Имущество расположено на земельном участке общей площадью 2,3552 га. В состав имущества входит: имущество, находящееся в республиканской собственности – изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-716921, общей площадью 317 кв.м, год постройки – 1953; имущество, находящееся в собственности ОАО «Полиграфкомбинат им. Я.Коласа», которое состоит из: изолированного помещения с инвентарным номером 500/D-707953349 (год постройки – 1953, помещение 4-этажное, общая площадь – 21674,5 кв.м, в помещении имеется 4 грузовых лифта), изолированного помещения с инвентарным номером 500/D-707953350 (год постройки – 1953, расположено в промышленном корпусе на 1 этаже, общая площадь – 573,5 кв.м, помещение общественного питания), капитального строения с инвентарным номером 500/C-8759 (котельная, год постройки – 1954, общая площадь – 910 кв.м), капитального строения с инвентарным номером 500/C-8764 (здание склада с трансформаторной подстанцией и мастерской, год постройки – 1954, общая площадь – 3212 кв.м), капитального строения с инвентарным номером 500/C-20781 (здание клуба, библиотеки, медпункта, склада, год постройки – 1965, общая площадь – 1751 кв. м), капитального строения с инвентарным номером 500/C-32294 (макулатурное здание, год постройки – 1995, общая площадь – 296 кв.м), капитального строения с инвентарным номером 500/C-32305 (производственное здание при макулатурном складе, год постройки – 1995, общая площадь – 166 кв.м), дорог на территории комбината, навеса сварочного, навеса рамы металлического, павильона металлического, ограды кирпичной, ограждения металлического, ограждения из железобетонных панелей, ограждений металлических (возле ПСХ), ограждения сетчатого для ресиверов, двух ворот распашных 5,0-2,5, брызгального бассейна, дымовой трубы металлической, водопровода наружного, канализации наружной, теплотрассы наружной, наружного газопровода, оборудования котельной. Инженерная инфраструктура развита и характеризуется наличием следующих систем коммуникаций: телефонизация, канализация, водоснабжение, электроснабжение, теплоснабжение, газоснабжение
2	**Начальная цена предмета аукциона**	407 206 509 800 белорусских рублей
3	**Сумма задатка и реквизиты расчетного счета**	40 000 000 000 белорусских рублей вносятся на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе
4	**Наименование продавцов предмета аукциона, их контактные телефоны**	Министерство информации Республики Беларусь, 220004, г. Минск, пр. Победителей, 11, конт.тел. (017) 203 92 31; ОАО «Полиграфкомбинат им. Я.Коласа», 220600, г. Минск, ул. Красная, 23, конт. тел.(017) 288 12 73
5	**Условия аукциона**	Заключение с Минским горисполкомом инвестиционного договора о реализации инвестиционного проекта по строительству гостиничного комплекса категории «пять звезд плюс» (не менее 250 гостиничных номеров) с сохранением исторического облика здания

Порядок проведения аукциона определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов, находящихся в республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30.03.2009 № 36.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 1 ноября 2012 года.

Победитель аукциона в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона, обязан возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под роспись.

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона.

Осмотр предмета аукциона участниками производится ежедневно в рабочие дни с 9:00 до 12:00 и с 13:00 до 16:00 заместителем директора ОАО «Полиграфкомбинат им. Я. Коласа» (Чиж Петр Аркадьевич, конт. тел. (017) 284 85 45, 288 12 75).

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Коралл» (продавец)

извещает о проведении 02 ноября 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11-00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Склад огнеупоров площадью 174,7 кв.м с металлическим сооружением (склад-навес) инв. №350/С-78697	г. Гомель, ул. Лепешинского, 7	280 000 000	28 000 000
2	Изолированное нежилое помещение (корпус вспомогательных цехов) площадью 7541,1 кв.м, инв. №350/Д-233010 со складом металлическим площадью 175 кв.м, с автомобильной дорогой к помещению площадью 876 кв.м		4 852 000 000	485 000 000
3	Изолированное нежилое помещение (здание главного корпуса) площадью 52440,4 кв.м, инв. №350/Д-149240		41 061 000 000	4 106 000 000
4	Незавершенное капитальное строительство (выносная камера кондиционирования) площадью 800,4 кв.м, инв. №350/U-129007		1 734 060 000	173 000 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Коралл».

Имущество расположено по адресу: 246000, г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Шаг аукциона – 5%.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет продавца (ОАО «КОРАЛЛ») №3012111889019 в Региональной Дирекции №300 ОАО «БПС-Сбербанк», по Гомельской области, МФО 15300369, УНП 400051785 **по 31 октября 2012 года включительно.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 от даты опубликования настоящего извещения **по 31 октября 2012 включительно**.

Заявления, поступившие после установленного срока не рассматриваются.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74-17-34, 74-89-64 и на сайте gomeloblreklama.by.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Коралл» (продавец)

извещает о проведении 05 ноября 2012 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11-00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Капитальное строение (здание кислородно-компрессорной станции) площадью 3903,6 кв.м, инв. №350/С-44942	г. Гомель, ул. Лепешинского, 7	1 596 000 000	159 000 000
2	Капитальное строение (здание столовой на 550 мест) площадью 3297,3 кв.м, инв. №350/С-49975. Склад металлический площадью 72 кв.м		2 394 000 000	239 000 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Коралл».

Имущество расположено по адресу: 246000, г. Гомель, ул. Лепешинского,7. **Шаг аукциона – 5%.**

К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 от даты опубликования настоящего извещения **по 01 ноября 2012 г.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, при этом данный участник аукциона приравнивается к победителю аукциона. Победитель торгов обязан: подписать протокол о результатах аукционных торгов; согласно счету-фактуре, выписанному организатором аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, оплата которого осуществляется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет № 3012111889019 в Региональной Дирекции № 300 ОАО « БПС-Сбербанк» по Гомельской области, МФО 153001369, УНП 400051785, ОА

■ Глыбінка

І БЕЛЫ КАТАР НА САЖЫ...

СЯРГЕЙ ДУБЯГА З ЧЭРЫКАЎСКАГА РАЁНА СТВАРЫЎ У ВЁСЦЫ МІРАНОШЧ ЯХТ-КЛУБ

Клуб называецца «Галс», і ў ім ужо 4 удзельнікі. База яхт-клуба — вясковая сядзіба, дзе гаспадарыць Сяргей Мікалаевіч Дубяга, афіцэр міліцыі ў адстаўцы і супрацоўнік «Белтэхагляду».

Мясцовая славутасць

Вёска Міраношч знаходзіцца літаральна за некалькі кіламетраў ад раённага цэнтра Чэрыкава. Гэта прыгожае месца: від з высокага берага на велічную раку Сож, якую яшчэ канчаткова не захапілі восеньскія фарбы. Унізе стаіць невялікі катар, зроблены ўласнымі рукамі Сяргея Мікалаевіча. У яго ўкладзена шмат часу і высілкаў — майстраваннем былі запоўнены вольныя ад працы дні на працягу амаль дзясятка гадоў. Выкарыстоўваліся самыя розныя падсобныя матэрыялы — ад металалому да рухавіка аўтамабіля «Жыгулі», які добра працуе на плавальным сродку на тым жа паліве АІ-92. Катар спрытна лётае па рацэ і ўжо стаў сапраўднай мясцовай славутасцю. Пакатацца можна ўсім: 140 тысяч рублёў за гадзіну на кампанію з 5 чалавек.

Увогуле Дубяга — чалавек сур'ёзны і слоў на вецер відавочна не кідае. Хаця, калі шчыра, спачатку ўсё гэта падаецца жартам. Яхты на Сажы? Беларуская вёска, і сапраўды, мала падобная на Сан-Трапэ. Як і самаробны катар Дубягі — на беласнежных гламурных «сабратаў» з міжземнаморскіх паштовак. Аднак і ў чэрыкаўскім варыянце, паверце, ёсць свая чароўнасць і арыгінальнасць.

Якар яго жыцця

На падворку яхт-клуба ёсць нямала цікавых рэчаў. Напрыклад, старая тэлефонная паўбудка з таксафонам. Нібыта з мінулага жыцця. «Званкі бясплатныя!» — жартуе гаспадар. Дарожны знак «Канец абмежаванняў» — гэта як дазвол расслабіцца, адкінуць ад сябе гарадскую мітусню і атрымліваць асалоду ад краявідаў і нетаропкіх зносін з прыродай і людзьмі.

Але самае незвычайнае тут — гэта музей якараў пад адкрытым небам.

— Шмат увагі нададзена колу ў жыцці і развіцці чалавека, але якар падаецца мне не менш важнай рэччу: без яго не абыдзецца ніводнае судна. І я вырашыў аддаць якару належнае, — лічыць Сяргей Мікалаевіч.

У яго прыватнай калекцыі — 26 якараў, ад маленькіх да вялікіх і магутных. Сябры Дубягі ведаюць, што можа быць для яго лепшым падарункам — старыя якар. Большасць экспанатаў датуецца XX стагоддзем: якары дасталі з ракі Сож у наваколлі, і яны, натуральна, усе ржавыя і з пашкоджаннямі. Аднак гаспадар вырашыў захаваць аўтэнтычны выгляд калекцыі і ні ў якім разе якары не фарбаваць.

— Ну, гэта было б дзіўна: нібыта бывалага марака, абветранага, як скала, апрануць у фрак з бабачкай, — смяецца Дубяга. — Трэба быць такімі, як ёсць, без упрыгожвання.

Відаць, і без упрыгожвання якары з'яўляюцца прыцягальнай рэччу, таму што самы першы з калекцыі Сяргея Мікалаевіча... укралі! Якар — гэта, вядома, не іголка ў стозе сена, таму экспанат хутка знайшлі... у суседнім горадзе і вярнулі на радзіму. Вось так і пачалося стварэнне музея якараў у Чэрыкаўскім раёне.

Агароджа з парусамі

Сяргей Мікалаевіч расказвае, што ў дзяцінстве хацеў стаць маракам, але жыццё склалася такім чынам, што не прафесіяй, але любімым хобі стала рачная справа. Цяпер Дубяга хоча рэалізаваць даўнюю мару — яхт-клуб і не лічыць яе за экзатычную і недасягальную.

— Сож — цудоўная прыгожая рэчка, тут проста наканавана развіваць суднаходства, і ў нас тут будуць катары, маторкі, байдаркі і іншае, — расказвае пра перспектывы гаспадар.

У перакладзе «галс» — значыць «кірунак», і ў Міраношчы ўзяты кірунак на аграэкатурызм з ухілам у рачную справу. У сядзібе Дубягі нават агароджа — з парусам і чайкамі, а ў хаце ёсць нямала марскіх рэчаў, прывезеных з розных куткоў. Карабельны звон, ужо рарытэтныя балоны для акваланга, выратавальны круг — усё гэта стала ўпрыгажэннем гасцёўні яхт-клуба. Адчуваецца, што гэта мужчынскае царства. Сяргей Мікалаевіч кажа, што жонка падтрымлівае яго справу і дапамагае. «Жанчыны нас дысцыплінуюць», — прызнаецца ён.

Яшчэ шмат давядзецца зрабіць, каб яхт-клуб у Міраношчы стаў рэальнасцю, у якую б адразу верылася. Але катар — гэта ўжо рэальнасць: вось ён прышвартаваны (падаецца, гэта так называецца?) каля берага, на сходнях спіць, нібыта вартаўнік, белы кот, а гаспадар на высокім беразе разам з сябрамі будуе планы на наступны сезон. Асабісты «галс» Сяргея Мікалаевіча Дубягі — на спраўджванне мар і цікавае жыццё.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.
Чэрыкаўскі раён

Таварыш БелАЗ

Кірыл Шымко стрымлівае ў фарсажы пару матацыклаў, а Вячаслаў Харанека садзіцца на шпагат з гірай на выцягнутай руцэ. Сёння ў Жодзіне святочныя вуліцы ды і людзі апрануты адпаведна. Дуэт карэспандэнтаў «Звязды» назіраў за тым, як у аўтаградзе святкавалі галоўнае тамтэйшае свята — Дзень машынабудаўнікоў.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Унікальнасць шоу ў тым, што падобнае ў нас паўтарыць ніхто не можа, — кажа райдар Віталь Пасевіч. — І для свайго ўзросту Мікіта катаецца на сусветным узроўні.

Волат Кірыл Шымко адзначыўся тым, што трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса, паспеў у адзіночку зрушыць з месца 55-тонны БелАЗ, самалёты Боінг-737, Іл-76, а разам з Паўлам Сарокам штурхнуў танк Т-34. Але ў гэты раз ніхто самазвалы не штурхаў. Шымко на радасць публіцы парваў ланцугі, з упэўненасцю забіваў рукамі ў дошку доўгія цвікі, разарваў надзьмутую грэлку і ў самым эндшпілі шоу здолеў стрымаць матацыклы, што раз'язджаліся ў розныя бакі!

У Жодзіне сапраўды восень залатая. І не толькі ад вялікай колькасці па-асенняму сонечнай лістоты. На выхадных тут адзначалі свята аўтабудаўнікоў — стваральнікаў жоўта-блакітных волатаў-самазвалаў. Уявіць айчыны аўтаград без БелАЗаў — гэта як Тальяці пакінуць без АўтаВАЗа. То бок ідэя марная, цяжкая для ўспрымання. Жодзіна і аўтазавод — гэта амаль сінонімы, словы роднасныя, якія існаваць адно без аднаго, напэўна, ужо не могуць. Паўстагоддзя таму прадпрыемства літаральна ажывіла невялічкі працоўны пасёлак, ператварыла яго ў горад, які дае працу 10 тысячам людзей і дорыць адзінае відовішча — футбол. Клуб «Тарпеда» хоць і не прызёр найноўшага футбольнага першынства, але баталіі з геаграфічным суседам, барысаўскім БАТЭ, заўжды збіраюць поўныя трыбуны. Напэўна, менавіта таму тут нават у песнях вядомы завод называюць і таварышам, і сябрам. Повязь настолькі непарыўная, што нават Дзень горада адзначаюць разам са святам аўтабудаўнікоў.

Гэтым разам у Жодзіне традыцыйна было шумна. Ахвотныя ўжо раніцай спрабавалі шашлык, запіваючы гарбатай, а астатнія праз шэрагі палаток з папкорнам і іншымі ласункамі імкнуліся трапіць на завод, на які ў свята пускалі ўсіх. Велізарнымі цэхамі і самазваламі жодзінцаў наўрад ці здзівіш. Тут амаль у кожнага сваяк працуе ці працаваў на БелАЗе. А вось экстрэмальнае шоу асілка Кірыла Шымко ўзрадавала гледачоў. Але спачатку пляцоўку каля вялікага цэха зборкі і выпрабаванняў аўтамабіляў і цягачоў гулам матацыклаў разрывалі хлопцы з каманды стрыт-байк фрыстайла FSB. 18-гадовы Мікіта Падольскі на сваім «Кавасакі» не толькі пусціў дыму, але і прадэманстраваў адмысловую мотаакрабатыку. Нават «сонейка» на матацыкле зрабіў.

Мясцовы жыхар Максім Зашчэпка не толькі сачыў за трукамі асілкаў, але і сам паспеў паўдзельнічаць у конкурсе — на хуткасць падымаў гіру.

— Свята мне вельмі падабаецца, — кажа задаволены хлопец. — Усё зроблена вельмі прыгожа. Па вялікім рахунку я не чакаў падобнага. Супер!

А яшчэ ўсе ахвотныя паспявалі фатаграфавацца на памяць, здымаць самую буйную на прасторах СНД аўтатэхніку. Асаблівая «фішка» — залезці ў кола вялізнага самазвала, стаць на прыступку 360-тонніка (дарэчы, самага буйнога з сямейства «тракаў»), і «сфоткацца». Здымкі пасля зоймуць сваё пачэснае месца ў глянцавых фотаальбомах. Маўляў, вось яны — самазвалы-гіганты, якія збіралі сваімі рукамі нашы бацькі, дзядулі, сваякі.

Тарас ШЧЫРЫ.
г. Жодзіна.

■ Ёсць пытанне

МЯДЗВЕДЗЬ З ПЛЯШКАЙ І ДАМОК ДЛЯ ШПАКА

ЧАМУ ТУРЫСТЫ ВЯЗУЦЬ АД НАС ТАК МАЛА СУВЕНІРАЎ?

У Парыжы, ля сабора Парыжскай Божай Маці, ля Эйфелевай вежы, каля Луўра, — ды кругом, дзе ходзяць турысты, нязменна круцяцца цемнаскурыя гандляры з прымітыўнай копіяй Эйфелевай вежы розных памераў, выкананай з незразумелага матэрыялу невядома дзе. Свой тавар яны не саромеюцца рэкламаваць настойліва і навязліва. І амаль ніводзін турыст не ўтрымліваецца ад спакусы ўзяць дзясятак такіх бірулек за тры еўра — на ўспамін. У колькі мільёнаў еўра выліваецца такі абарот, наўрад ці хто лічыў. Але ўрэшце ўсе яны асядаюць у краіне на карысць французскай эканоміцы.

Затое ў Белавежскай пушчы — брэндавым турыстычным аб'екце нашай краіны — турыст за наведванне пакідае на сувеніры ў сярэднім... 2360 рублёў. Разам з начальнікам упраўлення Камітэта дзяржкантролю Ганнай Грыгор'евай мы наведалі Брэсцкую фабрыку сувеніраў «Славянка», каб на месцы даведацца, як вытворцы задавальняюць попыт на сувенірную прадукцыю.

У савецкія часы на прадпрыемстве працавала дзве тысячы чалавек. І брэсцкія матрошкі, а таксама драўляныя шкатулкі з саламянай інкрустацыяй, добра прадаваліся як на тэрыторыі вялікай краіны, так і за яе межамі. Потым для фабрыкі надышлі не лепшыя часы. Сёння калектыў яе складае 120 чалавек. Работа цяжкая, зарплата невысокая. Але апошнім часам, як адзначаюць тут, «з'явілася надзея», — прадпрыемства ўпершыню за многія гады спрацавала з прыбыткам.

У святая святых «Славянкі» — дэманстрацыйнай зале — захоўваецца да 10 тысяч узораў прадукцыі, распрацоўкі ўласных мастакоў і дызайнераў. Вось дзе сапраўдная прыгажосць! Таму першае пытанне, гатовае сарвацца з вуснаў любога наведніка залы: «Чаму гэтага няма ў крамах?» Аказваецца, не ўсё так проста. Па сваёй магутнасці фабрыка можа выпускаць да 300 вырабаў за год. І ў першую чаргу тут робяць тое, на што ёсць заказы гандлёвых ці іншых арганізацый. Драўляныя матрошкі — па-ранейшаму запатрабаваны тавар.

Звярнулі на сябе ўвагу ў памянёнай зале арыгінальныя драўляныя талеручкі з выявай розных насельнікаў Белавежскай пушчы. Яны выглядаюць стыльна і элегантна за кошт разнога малюнка, і цана прымальная. Але, як патлумачылі нам, пакуль у продажы іх няма. Сувеніры знаходзяцца ў рабоце. Ну а калі парыбраць, спрабуем ўявіць, што ў нас ёсць нашага горада, у раёне, дзе мала бывае турыстаў.

Карпатлівая работа над шкатулкай на фабрыцы сувеніраў.

тыя вырабляецца, значыць, неўзабаве талеркі з'явяцца ў тых жа кіёсках і крамах пушчы.

Сама ж крама фабрыкі прапануе даволі шмат разнастайнай прадукцыі. Праўда, упор зроблены на дарагія рэчы ручной (або з элементамі ручной) работы. Так, выразаны з дрэва мядзведзь, якому, відаць, для прыцягнення ўвагі «далі» ў лапы пляшку ад гарэлкі, каштуе амаль два з паловай мільёны рублёў, а зубр — амаль паўтара мільёна... Можна выбраць даволі прыгожыя шкатулкі ад 68000 рублёў. А вось і сапраўдная знаходка: шпакоўня з выявай будучага гаспадара «апартаментаў» — усяго за 38000 рублёў. Ёсць і двух'ярусныя размаляваныя дамкі для птушак. І тут даводзіцца пашкадаваць, што крама знаходзіцца далекавата ад цэнтра

Брэсцкая крэпасць — самы галоўны турыстычны аб'ект нашага горада — мае адзін прыватны сувенірны кіёск у памяшканні музея абароны крэпасці. Талеркі, магніты, друкаваная прадукцыя, — тавары двух дзясяткаў фірмаў нашай краіны, паводле слоў прадаўца. Але не сказаць, каб нешта было вельмі цікавае, кідалася ў вочы, што падкрэсліла б адметнасць нашай краіны ў вачах замежнага турыста пасля яго вяртання дамоў...

Менавіта такой прадукцыі, якая б адлюстроўвала адметнасць, беларускі стыль, несла ў сабе пэўны эксклюзіў, і не хапае ў крамах турыстычных аб'ектаў, у бойкіх месцах горада. Яшчэ колькі гадоў таму ля Камянецкай вежы сядзелі месцічы і прадавалі драўляныя лыжкі, бірулькі, іншыя сувеніры. Цяпер гандляры паяўляюцца эпізадычна, і часцей прадаюць не свой тавар — відаць, што пасярэднікі. Белавежская пушча прапануе рамеснікам прадаваць свае вырабы выключна праз кіёскі нацыянальнага парку, і іншага варыянту няма... Людзі і хацелі б рабіць гэта самі. Так было б выгадна і пакупнікам, і самім майстрам. Але тут узнікаюць цяжкасці. У выніку турыст набывае вельмі мала сувеніраў, пакідае на гэта мізэрную суму, агучаную ў пачатку артыкула.

Але ў нас ёсць нямала цікавых майстроў, у розных мясцовасцях яны вырабляюць самую разнастайную прадукцыю. З адной толькі саломкі сапраўдныя дзівосы робяць! Ёсць цікавыя напрацоўкі з керамікі. На абласных дажынках школьнікі з Белаазёрска прадэманстравалі цэлы шэраг гліняных вырабаў свайго гуртка. На тых жа «Мотальскіх прысмаках», іншых падобных фэстах разгортваюцца цэлыя гарады майстроў. Як зрабіць, каб такія вырабы турысты павезлі з сабой за мяжу? Для гэтага, відаць, патрэбны нейкія прынцыповыя рашэнні мясцовай улады. Нічога не будзе дрэннага, калі больш людзей пакінуць на памяць аб наведванні беларускага горада ці пасёлка нейкую арыгінальную рэч. І нам выгадна, і гасцям прыемна.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Наўздагон

«Праз аўкцыён мы найперш вызначылі попыт»

З 250 лотаў, якія агулам ад усіх абласцей былі выстаўлены на першым аўкцыёне па продажы разавых дазволаў на здабычу той ці іншай паляўнічай жывёлы ў рамках правядзення міжнароднай спецыялізаванай выставы «Паляванне і рыбалоўства. Восень-2012», былі рэалізаваныя толькі 18. Тым не менш, каментуючы па просьбе журналіста «Звязды» вынікі гэтага мерапрыемства, першы намеснік старшыні праўлення «Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Мікалай Бамбіза ацаніў іх як нармальныя.

— Пры дапамозе гэтага аўкцыёна мы найперш вызначылі попыт, — сказаў, у прыватнасці, Мікалай Мікалаевіч. — Не бачу ніякай праблемы ў тым, што было рэалізавана толькі 18 лотаў. Гэта засведчыла, што паляўнічыя ідуць іншым шляхам.

— Калі ласка, патлумачце — якім канкрэтна?

— Паслуга па продажы разавых дазволаў на здабычу паляўнічых жывёл запатрабавана. І яна добра аказваецца паляўнічым на месцах.

— Няўжо тыя ж мінчане так актыўна выязджаюць туды?

— ...Акрамя таго, у краіне ёсць прадпрыемства, якое аказвае такога кшталту паслугі.

— Ці можаце агучыць рэкорды аўкцыёна, які прайшоў? Якім вам бачыцца яго далейшы лёс?

— Паколькі гэта першае мерапрыемства такога роду, рэкордамі можна лічыць абсалютна ўсё. Калі цікавіць найбольш грошы, за 18 лотаў было атрымана агулам 50 мільёнаў рублёў. Пераважна тут адзначылася Мінская вобласць. Калі гаварыць пра лёс аўкцыёна, дык будзем і надалей прапаноўваць... Калі? Думаем, наступнай вясной.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Да ведама

ПАЛЯВАННЕ НА КАПЫТНЫХ. А ХУТКА — І НА ЗАЙЦА

З 1 кастрычніка ў краіне распачалося загоннае паляванне на капытных. Здабываць лася, высакароднага і плямістага аленя, дзіка, еўрапейскіх казулю і лань такім спосабам можна будзе да 30 снежня.

— Да здабычы дазволены жывёлы любога полу і ўзросту. Дазваляецца зброевы спосаб паляванне. У светлы час сутак можна паляваць загонам і з сабакамі, з засады і з падыходу — цягам сутак, — нагадалі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.

Для палявання на лася, аленя, лань, плямістага аленя, дарослага дзіка старэй за два гады дазваляецца выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 3 000 Дж і гладкаствольную паляўнічую зброю з выкарыстаннем толькі кулявых патронаў. Для казулі і маладняку дзіка да двух гадоў — наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 1 500 Дж і гладкаствольную паляўнічую зброю з выкарыстаннем толькі кулявых патронаў і патронаў з карцеччу дыяметрам 6,5 міліметра і больш. Пароды паляўнічых сабак вызначаюцца па рашэнні карыстальніка паляўнічых угоддзяў.

З першай суботы кастрычніка па апошнюю нядзелю месяца ў светлы час сутак паляваць таксама можна будзе на зайца-беляка і зайца-русака. Для гэтага дазволены бяззброевы спосаб палявання з хартамі і лоўчымі птушкамі, а таксама зброевы — з гладкаствольнай паляўнічай зброяй з выкарыстаннем патронаў з дробам. Пры гэтым дазваляецца паляваць з паляўнічымі сабакамі. Гэта павінны быць ганчакі, якія маюць палявы дыплом па зайцы і (ці) лісе.

Сяргей РАСОЛЬКА

ЗРАБІЦЬ ЖЫЦЦЁ МАЛЯЎНІЧЫМ

У Мінску прайшоў фестываль 3D-малюнкаў «Вакол свету за 8 гадзін» па стрыт-арце. Такое мерапрыемства ў нашай краіне ладзілася ўпершыню. Восем каманд на працягу васьмі гадзін стваралі аб'ёмныя малюнкі на тратуарнай плітцы ў Цэнтральным дзіцячым парку імя Максіма Горкага. Створаныя шэдэўры павінны былі перанесці ўсіх прысутных у Лондан, Парыж, Нью-Ёрк, Шанхай і іншыя гарады свету.

Навіна аб мерапрыемстве не пакінула абыякавымі аматараў жывапісу і прыхільнікаў сучаснай культуры. Тут можна было не толькі атрымаць нейкі новы вопыт як мастаку, але і пазнаёміцца з новымі людзьмі, зрабіць некалькі памятных фатаграфій аб гэтым дні, увекавечыўшы 3D-малюнкі. Самае цікавае, што кожнаму, хто прыйшоў на фэст, была прадастаўлена магчымасць выказаць уласнае меркаванне, прагаласаваўшы за ўпадабаную карціну. Фестываль больш нагадваў сяброўскую сустрэчу, а не суперніцтва за месца фаварыта.

Вядома, аб'ёмныя малюнкі — адносна новы кірунак стрыт-арту, таму сярод удзельнікаў былі і тыя, хто ўпершыню быў задзейнічаны ў падобным мерапрыемстве. Для іх гэта быў першы падобны вопыт. Вельмі пашанцавала з надвор'ем, хаця многія і былі не задаволены... яркім сонцам, якое перашкаджала ўспрыманню 3D-карцін.

Гісторыя вулічнага мастацтва бярэ пачатак з другой паловы 1970-х. Сёння стрыт-арт — не проста неразборлівыя абстракцыі на вуліцах горада, а сапраўдныя творы мастацтва, якія ўпрыгожваюць шэрыя вуліцы гарадоў па ўсім свеце. Дзякуючы развіццю малюнка, новых тэхналогій і фантазіі мастакоў увесь свет напоўніўся яркасцю 3D-малюнкаў, якія нібы пераносяць гледача ў іншы свет.

Вядома, такія карціны не даўгавечныя. Некаторыя з іх малююць крэйдай, некаторыя — фарбамі з балончыкаў.

У нашай краіне гэты від мастацтва з'явіўся адносна нядаўна. Прайшоўшы фестываль, здаецца, і ёсць той самы першы крок для развіцця гэтага кірунку. Хто ведае, магчыма дзякуючы яму мы перастанем бачыць на будынках гарадоў незразумелыя надпісы графіці, якія ўсё роўна сатруць дворнікі...

Ганна БУРАК. Фота аўтара.

■ Наш фармат

На дзіцячым «Еўрабачанні» беларус спяе пра мора

12-гадовы мінчанін Ягор Жэшка з песняй «А мора-мора...» стаў абраннікам лёсу, публікі і прафесіяналаў музычнай галіны на Рэспубліканскім дзіцячым конкурсе «Песня для «Еўрабачання». У творчым спаборніцтве спявак, набраўшы больш за ўсіх балаў па суме галасоў тэлегледачоў і журы, абышоў 9 канкурэнтаў — артыстаў і калектываў з Мінска, Гомеля, Магілёва, Маладзечна, Светлагорска і Мазыра.

Што адметна — прафесійна вакалам юны артыст займаецца ўсяго два гады, у эстрадна-вакальнай студыі прадзюсарскага цэнтра «Залатыя галасы» пры арт-групе «Беларусы». Але ўжо летась творчы кіраўнік Ягора Валерый Шмат не пабаяўся выставіць свайго выхаванца на нацыянальны адбор дзіцячага «Еўрабачання». І яшчэ ўчора нікому не вядомы хлопец, між іншым, заняў другое месца ў фінале! А з другой спробы ўвогуле перамог — прычым, падаецца, зрабіў гэта без напружання, нібыта гуляючы.

Хоць творчы «стаж» у сёлетняга беларускага дэлегата на дзіцячым «Еўрабачанні» яшчэ невялікі, але за плячыма ў Ягора ўжо ёсць вопыт удзелу ў некалькіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. Юны артыст вучыцца ў 7 класе адной са сталічных гімназій, асаблівую ўвагу надае рускай літаратуры і гісторыі, з задавальненнем слухае Мікалая Баскава і Рыкі Марціна і лічыць вялікім камплімент, калі яго самога параўноўваюць з Раберціна Ларэці.

Такім чынам, на міжнародным дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне-2012», што адбудзецца 1 снежня ў Амстэрдаме, Беларусь прадставіць песня «А мора-мора...». На жаль, рускамоўная — але гэта ўжо зусім іншая гісторыя, з поспехамі ці няўдачамі нашых артыстаў на «Еўрабачанні» мала звязаная...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Фота БЕЛТА.

ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ: ІНШЫЯ ПРАВІЛЫ

Упарадкаванне льгот — не чыстка чэргаў, а пэўнае змяненне ўмоў крэдытавання

У адміністрацыі Ленінскага раёна Брэста прыём грамадзян па жыллёвых пытаннях вядзецца чатыры разы на тыдзень, у тым ліку і ў суботу. Як і было раней. Зараз проста больш людзей прыходзіць у прыёмныя дні. З'явіліся новыя заканадаўчыя акты, шмат рознай інфармацыі цыркулюе па сродках інфармацыі. Зразумела, што гараджане хвалююцца. Некаторыя пытаюцца: ці не выключылі іх з чаргі на будаўніцтва жылля? Але тут спяшаюцца супакоіць: усе 12790 сям'яў, якія сталі на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў, на ўліку і застаюцца. Выключаюцца з чаргі толькі тыя людзі, у якіх адпала патрэба. Часцей за ўсё гэта значыць, што яны пабудавалі альбо купілі дом ці кватэру.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАРАДЖАЦЬ ПА-РАНЕЙШАМУ ВЫГАДНА

Іншая справа, што льготны крэдыт у такіх памерах, як было раней, атрымаюць далёка не ўсе з вышэйназванай чаргі. Указ №13 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) альбо набыцці жылых памяшканняў», падпісаны 6 студзеня гэтага года, унёс істотныя змены ў ранейшую сістэму крэдытавання. Варта адразу заўважыць, што для шматдзетных сем'яў умовы сталі лепшымі. Фінансавая дапамога пры пагашэнні льготных крэдытаў ім аказваецца ў большых памерах. Як ужо неаднаразова паведамлялася, пры наяўнасці трох непаўналетніх дзяцей дзяржава гасіць 75% крэдытнай лініі (раней было — 50). А тым, у каго дзяцей чацвёра, кампенсуюць ужо 100% крэдыту, раней было 70. Нават калі мець на ўвазе неабходнасць плаціць 25% ад кошту — крэдыт даецца на 40 гадоў пад 1%, з улікам інфляцыі гэта фактычна азначае бясплатную кватэру. Так што быць шматдзетнай сям'ёй выгадна. Акрамя таго, такія сем'і ўключаюцца ў склад новых ЖБК у першую чаргу.

У Ленінскім раёне зараз стаіць на ўліку 259 сямей, якія маюць траіх і больш дзяцей. Але гэта не азначае, што ўсе проста чакаюць. 77 сямей з названай колькасці ўзводзяць індывідуальныя жылыя дамы па льготных крэдытах, 42 з іх будуюць кватэры ў жыллёва-будаўнічых кааператывах, 13 — будуюць кватэры на ўмовах долевага будаўніцтва. Астатнія будуць уключацца ў ЖБК па меры іх фарміравання.

Праўда, зараз гэты працэс крыху прыпыніўся. Патрэбны пэўны пераходны перыяд, каб падлічыць грошы, прывесці заканадаўчыя акты ў адпаведнасць з фінансавымі магчымасцямі. Нават на прыкладзе аднаго асобна ўзятага раёна відаць, якую высокую планку ўзялі ў свой час на шляху будаўніцтва жылля. Напрыклад, у 2005 годзе ў ЖБК пайшлі людзі, якія станавіліся ў чаргу ў названым раёне ў 1988-89 гадах, а ў 2011 крэдыты атрымалі чаргавікі 2002 года. Можна сабе ўявіць, якая велізарная колькасць крэдытаў была выдадзена амаль што за пяцігодку. І абсалютная большасць з іх выдавалася на льготных умовах. Таму жыццё прадыктавала патрэбу ў тайм-аўце і ў пэўным пераглядзе падыходаў. Але праз некаторы час, упэўнены спецыялісты жыллёвай службы, усё стане на свае месцы, пачнецца фарміраванне новых кааператываў і крэдытаванне па новых правілах.

ІЛЬГОТНЫЯ КАТЭГОРЫІ

Галоўны спецыяліст аддзела па ўліку і размеркаванні жылля Марыя ДАЦУК паказвае ў сваім камп'ютары папку «Ільготныя катэгорыі». Лічбы сведчаць пра тое, што чаргі на льготны крэдыт чакаюць не толькі шматдзетныя сем'і. Насамрэч такіх катэгорый нямала. Сем'і, у складзе якіх ёсць дзеці-інваліды, дарослыя інваліды I і II груп, інваліды і ўдзельнікі вайны, ветэраны баявых дзеянняў у іншых краінах, тыя, хто перанёс прамянёвую хваробу ў выніку аварыі на ЧАЭС, ваеннаслужачыя, іншыя катэгорыі. Яны атрымліваюць крэдыт пад 20% стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка, але не менш за 5% гадавых. На сёння гэта азначае, што крэдыт будзе выдадзены пад 6% гадавых. Але стаўка рэфінансавання мае тэндэнцыю да паніжэння, з чаго вынікае, што і льготныя крэдыты могуць патаннець.

Так, у раёне, які мы ўзялі да прыкладу, у чарзе стаяць 104 сям'і з дзецьмі-інвалідамі. Праўда, 15 з іх ужо будуюць дамы і 26 — кватэры. Ёсць яшчэ асабліва чарга з людзей, чыё жыллё прызнана непрыгодным для пражывання. Такіх грамадзян 37. Яны маюць права на льготны крэдыт. І 15 з іх будуюць дамы і кватэры. А некаторыя проста не хочуць увязвацца ў будоўлю, чакаюць, пакуль іх жыллё пойдзе пад знос. І ў гэтым ёсць свая логіка, бо многія жыльцы старых дамоў, асабліва тых, што бліжэй да цэнтра горада, дачакаліся бясплатных кватэр узамен на знесеныя квадратныя метры.

Няпростая сітуацыя з чаргой, якую ўтварылі ветэраны вайны. Яна фактычна не рухаецца. Варта заўважыць, што ветэранаў, якія б зусім не мелі жылля, у раёне няма. Заслужаныя людзі становяцца на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў па прычыне таго, што іх сем'і «абраслі» дзецьмі, унукамі, праўнукамі і вызначаных заканадаўствам метраў не хапае. Атрымліваць сацыяльныя кватэры паважаныя дзядулі адмаўляюцца, бо іх не прыватызуеш і не пакінеш дзецям. Уступаць у ЖБК і браць крэдыты яны таксама не хочуць, таму і чарга з пяці чалавек пакуль застаецца.

Правам на льготны крэдыт можна скарыстацца толькі адзін раз.

Дзеці-сіроты, якія выпускаюцца з дзіцячых дамоў (а часцей за ўсё прыходзяць пасля заканчэння прафесійных навучальных устаноў), таксама маюць права на атрыманне льготнага крэдыту. Такіх на ўліку 82 чалавекі. І толькі адзін з іх рызыкнуў пачаць будаўніцтва. Большасць з гэтых людзей разлічвае на сацыяльнае жыллё. І яны яго атрымліваюць. Вось і на мінулым тыдні аднапакаёвыя кватэры ў доме па вуліцы Гвардзейскай атрымалі 12 брастаўчан ва ўзросце ад 19 да 23 гадоў. Нядаўна быў здадзены сацыяльны дом па ўказанай вуліцы. Для маладых людзей гэта добры старт у самастойнае жыццё.

З уступленнем у сілу новага заканадаўчага акта падаражэлі крэдыты для сямей, якія маюць дваіх непаўналетніх дзяцей. Крэдыты ім будуць выдавацца на 20 гадоў пад працэнтную стаўку, роўную 50% ад стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка. Сёння гэта прыкладна 15,2% гадавых. А вось сем'і з адным дзіцем ільготу страцілі. І ўсё роўна, калі такая сям'я стаіць у чарзе, крэдыт для іх будзе значна таннейшым, чым для тых грамадзян, якія не маюць патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў: розніца складае каля 10 працэнтаў.

У ЧАРГУ — ПА-НОВАМУ

Што ж такое ўпарадкаванне льготных чэргаў, аб якім зараз так многа гавораць? Аляксандр САЎЧАНКА, начальнік аддзела па ўліку і размеркаванні жылля адміністрацыі Ленінскага раёна Брэста, гаворыць, што гэта не новая для іх кампанія. Такая работа вялася заўсёды. Штогод з 1 лютага да 1 мая вядзецца перарэгістрацыя тых, хто стаіць на ўліку. Для гэтага найперш накіроўваецца запыт у органы дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомасці. Пасля атрымання спіса грамадзян, якія пабудавалі або набылі жылыя памяшканні, рашэннем выканкама адміністрацыі раёна яны выключаюцца з чаргі. Так, у гэтым годзе знялі з уліку больш за 2 тысячы чалавек.

Зараз больш строгімі сталі падыходы да разгляду заяў аб будаўніцтве з прыцягненнем ільготных крэдытаў. Як вядома, права на льготу маюць грамадзяне, якія больш за 10 гадоў жывуць у інтэрнатах і не маюць ва ўласнасці жылых памяшканняў. Цяпер неабходна мець доказы, што яны там сапраўды жывуць, а не проста зарэгістраваны. Такая ж сітуацыя з тымі, хто заключае дагаворы найму жылога памяшкання. Напрыклад, чалавек прыехаў з вёскі, зняў кватэру ў абласным цэнтры, афарміў рэгістрацыю, але фактычна там не жыве. І калі апошняе будзе засведчана афіцыйнымі асобамі, такі грамадзянін выключаецца з чаргі.

Яшчэ адзін важны момант, на які параіў звярнуць увагу Аляксандр Саўчанка. Раней для пастаноўкі на ўлік бралася да ўвагі адсутнасць ва ўласнасці жылля ў пэўным населеным пункце. Таму сталі вядомыя выпадкі, калі сем'і, якія мелі кватэры ў адным горадзе, будавалі па льготным крэдыце жыллё ў іншым. Зараз плошча ва ўласнасці крэдытаатрымальніка і членаў яго сям'і будзе ўлічана па ўсёй рэспубліцы. Напрыклад, грамадзянін мае кватэру ў Баранавічах плошчай 45 квадратных метраў. Пры выдзяленні льготнага крэдыту на будаўніцтва жылля ў Брэсце з разліку агульнай сумы крэдыту ўказаныя «метры» будуць вылічаны. Такім чынам, ільготу ён атрымае толькі на астатнія метры ў адпаведнасці з патрэбай сям'і.

— Карысна ведаць і такую асаблівасць новых правілаў, — заўважыў Аляксандр Мікалаевіч. — Калі грамадзянін у парадку чаргі атрымаў зямельны ўчастак на будаўніцтва дома ў перыяд з 1 студзеня 2011 года, а потым яго прадаў, ён таксама выключаецца са спіса на паляпшэнне жыллёвых умоў. Тым, хто збірае дакументы для пастаноўкі на ўлік, важна ўлічваць і такія моманты: правам на льготны крэдыт можна скарыстацца толькі адзін раз. Такое права страчваюць грамадзяне з высокім даходам: калі сярэднямесячны даход на аднаго члена сям'і перавышае сёння 3 996 000 рублёў.

Як паведаміла галоўны спецыяліст камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Брэсцкага аблвыканкама Таццяна МАЦЭВІЧ, работа па ўдакладненні і ўпарадкаванні чэргаў ідзе ва ўсіх гарадах і раёнах вобласці. У адпаведнасці з даручэннем старшыні аблвыканкама гаррайвыканкамы павінны завяршыць яе да 1 студзеня наступнага года. Асаблівая ўвага надаецца момантам, якія ўдакладняюць сапраўдную патрэбу грамадзяніна ў жыллі. У населеных пунктах з колькасцю насельніцтва менш за 20 тысяч жыхароў ёсць свая спецыфіка: там льготныя крэдыты значна таннейшыя.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ Погляд

Аб сацыяльным паразітызме ў эканоміцы

Наш карэспандэнт абмяркоўвае з вядомым эканамістам, доктарам навук, прафесарам, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пятром НІКІЦЕНКАМ паходжанне застарэлых гаспадарчых праблем, якія тармозяць развіццё эканомікі і аб якіх ішла размова на нядаўняй нарадзе ў Прэзідэнта.

— Сітуацыя ў эканоміцы краіны на макраэканамічным узроўні пакуль адносна стабільная, але і шмат праблем, якія трэба не толькі бачыць, але і своечасова вырашаць. Аб гэтым, дарэчы, гаварылася на вышэйзгаданай нарадзе. Аднак многія нявырашаныя пытанні ўжо раней абмяркоўваліся, ды жыццё падштурхоўвае вяртацца да іх зноў і зноў. Возьмем, для прыкладу, упартае назапашванне гатовай прадукцыі на складах. Чаму, навошта?

— Ужо шмат разоў гучала крытыка на вышэйшым узроўні аб заганнасці такой практыкі. Але, тым не менш, многія кіраўнікі прадпрыемстваў з цяжкасцю развітваюцца з ёй. Хоць ужо ўсім даўно зразумела, што нам у рынкавых умовах не варта выпускаць прадукцыю дзеля вытворчасці. Нам неабходна вырабляць тавары, якія прадаюцца, не ляжаць доўгі час на складзе. І зарплату налічваць, беручы за аснову не аб'ёмы зробленай, а ўзровень даходу ад рэалізаванай прадукцыі. Большы даход — большая зарплата. Менш атрымалі даходаў — меншая зарплата ўсім. А вось што нярэдка атрымліваецца. Затарылі на складах усе свабодныя плошчы гатовай прадукцыяй, а выручкі, грошай не хапае на першачарговыя выдаткі. Тады прадстаўнікі завода ідуць у банк і бяруць крэдыт на выплату зарплаты, улазяць у пазыкі, выплачваюць зарплату з улікам інфляцыі і росту цэн.

Такая заганная практыка не спрыяе выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі, садзейнічае скажэнню статыстыкі, прыпіскам і г. д. А ў выніку персанал такога «паспяховага» прадпрыемства атрымлівае дастаткова высокую незароблену зарплату. Гэта непарадак, калі сёння рост зарплаты не звязаны з ростам эфектыўнасці працы. Таму невыпадкова на нядаўняй эканамічнай нарадзе ў Прэзідэнта паказчык выручкі быў вылучаны як адзін з галоўных у дзейнасці кожнага прадпрыемства. Ад узроўню даходу неабходна прапарцыянальна налічваць і зарплату. Яна павінна адлюстроўваць працоўны ўнёсак як усяго калектыву, так і кожнага працаўніка незалежна ад яго рабочага месца. Адсутнасць такога падыходу нараджае эфект сацыяльнага паразітызму, які ахапіў многія сферы дзейнасці.

— Што вы маеце на ўвазе пад сацыяльным паразітызмам?

— Сацыяльны паразітызм я разглядаю як не самую лепшую традыцыю савецкай эпохі, яе атавізм. Гэта калі пэўныя людзі, ведамствы-манаполіі дзяржавы напрамую ці ўскосна спрабуюць жыць за кошт працы іншых: адны прыдумваюць рознага роду, скажам, інфляцыйныя спекуляцыйныя грашовыя сістэмы, іншыя займаюцца імітацыяй сваёй дзейнасці (напрыклад, бюракратычнай рэарганізацыяй), наладжваюць гіганцкую папяровую перапіску без усялякай патрэбы, шукаюць і знаходзяць прычыны для росту цэн.

— Амаль заўсёды за чарговым павышэннем зарплаты назіраецца аўтаматычны рост цэн на прадукты харчавання, многія тавары паўсядзённага попыту, паслугі. І так кожны год. Чаму?

— Таксама не лепшая наша традыцыя. Калі адразу вырастаюць тарыфы, перапісваюцца цэннікі ў магазінах, то гэта, лічу, хутчэй, чыноўніцка-спажывецкая рэакцыя на рост даходаў насельніцтва, чым эканамічная. Зразумела, усім неабходныя грошы на рост зарплаты, на штрафы, выдаткі на рэкламу, працэнты банкаўскіх крэдытаў і г. д. Але трэба і меру ведаць. Таму я падтрымліваю ўвядзенне жорсткіх дзяржаўных патрабаванняў да ўсіх без выключэнняў суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку і арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Яны павінны не проста дэкларавацца новыя, больш высокія цэны ў органах дзяржаўнага кіравання, а даходліва абгрунтаваць і растлумачыць насельніцтву, чаму тое ці іншае ведамства прапануе ўзняць цэны на пэўныя віды паслуг. Якія для гэтага ўзніклі аб'ектыўныя прычыны? Выраслa зарплата ў людзей? Гэта не нагода. І не трэба гаварыць пра тое, які высокі сабекошт паслугі і як мала за яе прадастаўленне плаціць насельніцтва. Па-першае, хто правяраў чысціню гэтых разлікаў? Можа яны памылковыя, нам даюць не зусім дакладныя лічбы? Мне, напрыклад, цікава было б даведацца, якія меры і захады прымаюцца для мінімізацыі выдаткаў на сабекошт паслугі. Самае простае — узняць цану, скажам, на праваўезду на тэрыторыю рынку ў Ждановічах, што пад Мінскам. З якой нагоды? Таму, што выраслa стаўка першага разраду? Сумніўны для мяне аргумент як для эканаміста.

— Сёння ідзе грамадскае абмеркаванне прапановы Мінэнерга ўвесці так званы дыферэнцаваны падыход аплаты за электраэнергію. Сутнасць у тым, нагадаю, што насельніцтву будзе прапанавана за пэўны аб'ём яе спажывання плаціць па адным тарыфе, а звыш гэтага ліміту — па больш высокай цане. Галоўны тэзіс міністэрства — ва ўсім свеце за электраэнергію плацяць столькі, колькі яна каштуе...

— Хачу задаць паважанаму міністэрству сустрэчнае пытанне: чаму ў нашай краіне каэфіцыент выкарыстання энергетычных магутнасцяў 0,6—0,7? Ці не значыць гэта, што 40%—30% магутнасцяў не выкарыстоўваюцца эфектыўна для выпрацоўкі энергіі? Іх абслугоўванне патрабуе велізарных выдаткаў, якія потым закладваюцца ў цану электраэнергіі для насельніцтва. Увогуле ў нас шмат невытворчых выдаткаў, якія мы, радавыя спажыўцы, пакрываем са сваёй кішэні. Пад усякімі прыстойнымі намерамі нас угаворваюць, прымушаюць плаціць за паслугу па новай цане. Такая сістэма адпрацавана за многія гады. Аднак гэта зусім не значыць, што калі добра адной нейкай галіне, то добра і для спажыўцоў. Інтарэсы ведамства і чалавека часта не супадаюць.

Гэта зусім не значыць, што калі добра адной нейкай галіне, то добра і для спажыўцоў. Інтарэсы ведамства і чалавека часта не супадаюць.

Я не супраць, каб работнікі той ці іншай галіны мелі высокія заробкі, але гэта павінны быць, як справядліва гаворыць Прэзідэнт краіны, зароблены грошы за кошт продажу тавараў і паслуг. І яны — важная заўвага! — павінны рэалізоўвацца па падкантрольных дзяржаве цэнах. Бо нідзе няма чыстага цэнаўтварэння. Напрыклад, у самых эканамічна паспяховых Германіі і Злучаных Штатах, іншых развітых краінах цэны кантралююцца, асабліва на сацыяльна значныя тавары. Бо кожны гаспадарнік, вытворца знойдзе дастаткова аргументаў для таго, каб абгрунтаваць сваё жаданне ўзняць кошт на сваю прадукцыю. Год назад імклівы рост цэн тлумачылі рэзкім ростам курсу долара. Але чаму цяпер цэны растуць пры адносна стабільным курсе беларускага рубля? Гэта ёсць сацыяльны паразітызм тых структур, якія за кошт іншых імкнуцца няблага жыць. І гэта ў першую чаргу адносіцца да банкаўскай сістэмы. Неэфектыўнасць яе дзейнасці ў росце даўгоў, якія знаходзяцца ўжо на ўзроўні 2/3 валавога ўнутранага прадукту. Яшчэ 2-3 гады — і эканоміка краіны будзе працаваць на іх пагашэнне і ўмацаванне долара ЗША.

Сацыяльны паразітызм — не такая ўжо малараспаўсюджаная з'ява ў нашай эканоміцы. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічае велізарны папяровы абарот, які з кожным годам толькі расце: прымаецца шмат кантрольных дакументаў, пішуцца стосы даведак, складаюцца горы самых разнастайных справаздач, нікому, па вялікім рахунку, не патрэбных матэрыялаў на папяровых носьбітах. Карысць ад іх у тым, што яны потым выступаюць у ролі другаснай сыравіны. А тым часам выдумляюцца новыя справаздачы і паказчыкі. Справаздачнаць па адным паказчыку каштуе не менш 10 мільёнаў рублёў. Гэта выдаткі на паперу, камп'ютары і г. д.

— Што вы прапануеце?

— Рэзка зменшыць колькасць справаздачнай статыстыкі, вызваліць частку супрацоўнікаў, якія «сядзяць» на ёй, для дзейнасці на іншых кірунках. Паверце, так будзе лепш для эканомікі і грамадства.

— На прэзідэнцкай нарадзе прагучала крытыка ў бок губернатараў за тое, што яны недастаткова займаюцца рэальным сектарам эканомікі. Што яны могуць рэальна зрабіць для рэальнай эканомікі?

— Я думаю, што ў рэгіёнах мясцовай уладзе лепш усяго засяродзіцца на развіцці перапрацоўчай прамысловасці з мясцовай сыравіны: сельскагаспадарчай прадукцыі, выкапняў, драўніны, вады, солі, дарункаў лесу і г. д. Варта ўсяляк садзейнічаць малому і сярэдняму прадпрымальніцтву, спрыяць яго хутчэйшаму станаўленню і ўмацаванню.

— Асобныя беларускія аналітыкі і эканамісты прадказваюць чарговыя ўзрушэнні на валютным рынку краіны ў апошнія месяцы года. Маўляў, насельніцтва, прыватныя прадпрыемствы сёння актыўней, чым летам, купляюць замежную валюту. Сёння ходзяць чуткі аб магчымай дэвальвацыі беларускага рубля. Што вы думаеце на гэты конт?

— Я не ўпэўнены, што сёння такая пагроза моцная. Думаю, што з прызначэннем П. Пракаповіча памочнікам Прэзідэнта эканоміка атрымае больш дынамічнае і эфектыўнае развіццё, у тым ліку і банкаўская сфера.

Вядома, напярэдадні парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў звычайна ўзнікаюць (хутчэй, наўмысна распаўсюджваюцца) чуткі аб магчымых фінансавых і эканамічных непрыемнасцях у бліжэйшай перспектыве. Такія размовы, плёткі падагравацьць «інфляцыйныя» чаканні насельніцтва. Невыпадкова ў верасні некалькі ўзрос попыт на наяўную валюту. Між іншым, пасля апошніх выбараў мінуў пэўны час, але ніхто не штурмуе абменныя пункты. Кіраўнік Нацбанка гаворыць, што сітуацыя на валютным рынку пад кантролем, золатавалютныя рэзервы збалансаваныя, валюты досыць для таго, каб задаволіць попыт на яе.

Але, разам з тым, я не губляў бы пільнасці. Мы жывём у неспакойным свеце. Па-ранейшаму ліхаманіць еўразону, яна ніяк не можа выйсці з крызісу. Працягваецца нахабная далярызацыя сусветнай эканомікі, скачуць цэны на энерганосьбіты. Ёсць іншыя знешнія негатыўныя фактары, уплыў якіх можа разгайдаць сітуацыю на валютным рынку краіны. Таму супакойвацца не варта. На мой погляд, каб змякчыць уздзеянне негатыўных фактараў на эканоміку, варта было б звярнуцца на крэатыўнай аснове да досведу рэфармавання эканомікі ў савецкія часы, якое атрымала назву «касыгінская рэформа». Але гэта тэма для асобнай размовы.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА

■

ВЫПРАБАВАННЕ ЗОРКАМІ

Франк Рыберы прыехаў у Мінск у добрым настроі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першым ля атэля, з асобнага аўто, выйшаў сур'ёзны Улі Хёнэс, прэзідэнт клуба. Ну а хутка ў строгіх касцюмах з'явіліся футбалісты нямецкай дружыны. Асабліва фаны віталі француза Франка Рыберы, а крыху здзіўлены падтрымкай галкіпер Мануэль Ноер нават крыху затрымаўся і адказаў балельшчыкам шчырай усмешкай.

— БАТЭ — добрая каманда. Я іх яшчэ памятаю па тым часе, калі за «Зеніт» супраць іх гуляў, — кажа ўкраінскі паўабаронца мюнхенцаў Анатоль Цімашчук, якога карэспандэнт «Звязды» ледзь стрымаў ля атэльнага ліфта. — Барысаўчане добра стартавалі ў Лізе чэмпіёнаў. Сустракаюцца на гэты момант фаварыты групы. Мяркую, гульня будзе няпростая. Асноўная сіла БАТЭ — гэта Аляксандр Глеб і хлопцы, якія гуляюць напарадзе. Я з асалодай прыязджаю ў Беларусь і з асалодай тут гуляю. Атрымліваю задавальненне.

Дарэчы, падтрымліваць Анатоля Цімашчука і Ко будзе не толькі тысяча заўзятараў. Аказваецца, што з роднага Луцка «пахварэць» за Цімашчука прыедуць яго сваякі.

Цікава, як высветліў карэспандэнт, гатуе для баварцаў у гасцініцы свой кухар, які яшчэ загадзя прыляцеў у Мінск. Агародніна, макарона, мяса — усе прадукты набываліся ў Мінску і нічога з інгрэдыентаў каманда з Мюнхена ў Беларусь не везла.

Відавочна, да гульні з БАТЭ немцы рыхтуюцца сур'ёзна. Ці вытрымаюць беларусы выпрабаванне зорным «апанентам», даведаемся ўжо вечарам. Галоўнае — быць на стадыёне і падтрымліваць нашага адзінага еўракубкавага ўдзельніка. Пачатак сустрэчы ў 21.45.

Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.

ЗАХРАС ПА ГРУДЗІ Ў ГРАЗІ

А палове гадзіны ночы небарака, які патрапіў у бядотную сітуацыю, сам здолеў выклікаць дапамогу.

— У цэнтр аператыўнага ўпраўлення Клецкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях 37-гадовы грамадзянін паведаміў, што захрас у гразі на возеры паблізу вёскі Ляцешын Клецкага раёна, самастойна выбрацца не можа, — распавялі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС. — Да месца выкліку была накіравана група ратавання на водах, брыгада хуткай медыцынскай дапамогі. Выратавальнікі ўбачылі грамадзяніна, якому патрэбна была дапамога, за восем метраў ад берага — у берагавой паласе возера па грудзі ў грязі. Жыхара Клецка ў стане алкагольнага ап'янення даставілі на бераг, пасля чаго той быў шпіталізаваны ў раённую бальніцу з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне».

ЦІР БОЛЬШ НЕ «ВЫТРЫВАЎ»

У Пінску абрынулася столевае перакрыцце падземнага стралковага ціра, які не эксплуатаваўся з 2001 года.

Гэты цір быў пабудаваны на тэрыторыі цяперашняй гімназіі №1 у 1986 годзе. Падземная частка яго знаходзілася на глыбіні тры метры. Не эксплуатавалася памяшканне больш за дзесяць гадоў. Частковае разбурэнне плиты перакрыцця на плошчы 20 квадратных метраў адбылося па прычыне страты апорнай здольнасці будаўнічых канструкцый. Пацярпелых не было.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПРЫЗЯМЛЕННЕ... НА ДРЭВА

На вышыні звыш 30 метраў на таполі «завіс» парашутыст — стропы зачапіліся за дрэва. Старшы інструктар па парашутных скачках выклікаў на дапамогу выратавальнікаў, якія прыехалі на аэрадром Зябраўка, што ў Гомельскім раёне, і пры дапамозе аўталесак вызвалілі маладога чалавека з падвясной сістэмы парашута. 21-гадовы спартсмен траўмаў не атрымаў і дадатковая дапамога яму не спатрэбілася, у чым пераканаліся медыкі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПРАЕЗД У СТАЛІЧНАЙ ВОБЛАСЦІ ПАДАРАЖЭЎ

Гаворка ідзе аб праездзе ў гарадскім грамадскім транспарце: цяпер адна паездка ў аўтобусе звычайных і хуткасных маршрутаў рэгулярных зносін па горадзе будзе каштаваць на 100 рублёў больш — 1,4 тысячы рублёў, паведамілі рэдакцыі «Звязды» ў ААТ «Мінаблаўтатранс».

Правоз ручной паклажы таксама складзе 1,4 тысячы рублёў (пры аплаце выкарыстоўваюцца білеты на адну паездку). Калі білет набываць у кіроўцы, цана павялічыцца яшчэ на 100 рублёў. Гранічны максімальны тарыф на гарадскія перавозкі пасажыраў аўтобусамі экспрэсных маршрутаў (масай больш за 5 тон) вызначаны ў памеры 2 тысяч рублёў. Што датычыцца маршрутак, дык юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі могуць самастойна вызначаць фіксаваныя тарыфы на такія перавозкі на падставе плановых выдаткаў, падаткаў і іншых абавязковых плацяжоў і прыбытку, разлічанага з нарматыву рэнтабельнасці не больш за 15 працэнтаў. Апошні раз тарыфы на праезд у грамадскім транспарце Мінскай вобласці павялічваліся з 1,1 тысячы да 1,3 тысячы рублёў за адну паездку ў красавіку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПРОДАМ
Опель-рекорд 1986 г.в., 2,3 дизель по запчастям
8 029 3494893, 8 02153 23107

КІТАЙ ІНВЕСТУЕ Ў ІНДУСТРЫЯЛЬНЫ ПАРК 5,6 МЛРД ДОЛАРАЎ

Такую навіну на сустрэчы з журналістамі паведаміў пасол КНР у Беларусі Гун ЦЗЯНВЭЙ. Будаўніцтва індустрыяльнага парку — самы маштабны сумесны праект Беларусі і Кітая. Указ аб яго стварэнні быў падпісаны Аляксандрам Лукашэнкам сёлета ў чэрвені. Вышэйназваная сума будзе паступова асвойвацца на працягу 30 гадоў — такі тэрмін будаўніцтва парку. Зараз распрацоўваюцца дакументы па першай чарзе будаўніцтва. Яно будзе праводзіцца на плошчы 80 квадратных кіламетраў, аднак спадар Цзянвэй паабяцаў, што ва ўладальнікаў зямельных участкаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі будучага парку, зямлю ніхто не адбярэ.

Ішла размова і пра іншыя сумесныя праекты. Кітайскія інвестары прымуць удзел у рэканструкцыі аэрапорта «Мінск-2», будзе выдаткавана каля 600 млн долараў. У вырашальнай стадыі перамовы па стварэнні завода кітайскіх легкавых аўтамабіляў у Беларусі. У сваю чаргу, Кітай актыўна набывае беларускую тэхніку: камбайны «Гомсельмаш», самазвалы БелАЗ.

Пасол адзначыў адну з галоўных праблем у стасунках Беларусі і Кітая: сёння не існуе прамога авіярэйсу паміж нашымі краінамі. Спадар Цзянвэй расказаў, што на сабе адчуў усе нязручнасці, з якімі сутыкаюцца пасажыры падчас пералёту з перасадкамі. І паабяцаў заняцца іх вырашэннем асабіста. Сустрэча пасла КНР з беларускімі журналістамі была прымеркавана да нацыянальнага кітайскага свята — Дня абвяшчэння КНР, якое адзначаецца 1 кастрычніка.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

ЗРОБЛЕНА НА «ДЗЯСЯТАЧКУ» ЦІ НА «ПЯЦЁРАЧКУ»?

Прафесіяналы спрабуюць знайсці агульныя інструменты для ацэньвання якасці адукацыі

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ці варта Беларусі далучацца да ўдзелу ў міжнародных праграмах ацэнкі ведаў навучэнцаў PISA, TIMSS і іншых або лепш стварыць на прасторах СНД ці ЕўрАзЭС сваю сістэму ацэнкі якасці адукацыі? Па якіх крытэрыях можна і трэба ацэньваць эфектыўнасць работы навучальных устаноў, адукацыйных стандартаў і праграм павышэння кваліфікацыі настаўнікаў? Ці трэба слепа пераймаць чужы досвед або лепш стварыць уласны інструментарый для ацэнкі якасці адукацыі? Ці заўсёды прадстаўнікі СМІ карэктна трактуюць вынікі праведзеных у краіне ўступных іспытаў, а таксама вынікі аналітычных і рэйтынгавых даследаванняў у галіне адукацыі? Гэтыя і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі спецыялістаў, якія сабраліся ў Мінску, каб абмеркаваць практыкі правядзення ў краінах-удзельніцах міжнароднага семінара нацыянальных экзаменаў і маніторынгаў. Мерапрыемства сабрала навукоўцаў і практыкаў з сямі краін: Беларусі, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана і Азербайджана. Узяў удзел у ім і міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ.

На думку Сяргея Маскевіча, для нашых краін прынцыпова важна сфарміраваць адзіную сістэму ацэнкі якасці адукацыі і вучэбных дасягненняў, якой мы ўсе будзем даверяць:

— Няхай у эксперыментальным варыянце мы маглі б запусціць яе ў тых краінах, якія дадуць на гэта згоду. У сувязі з гэтым мы выйшлі з ініцыятывай сфарміраваць, можа быць, у рамках СНД або спачатку ЕўрАзЭС, сваю акрэдытацыйную кампанію. Для нас вельмі важна звяраць гадзіннікі ў сістэмах адукацыі, у першую чаргу, з нашымі з суседзямі, каб не згубіць канкурэнтаздольнасць беларускай сістэмы адукацыі.

— Шчыра кажучы, мы ўжо настолькі далёка разышліся, што нават у адно паняцце і ў адзін тэрмін сталі ўкладваць розны сэнс, — прызнаўся **віцэ-прэзідэнт Расійскай акадэміі адукацыі Віктар БОЛАТАЎ.** — У нас зусім розныя фарматы правядзення нацыянальных экзаменаў. І калі мы разважалі з Сяргеем Аляксандравічам над тым, якая ўсё ж такі ў нас адукацыйная прастора (адзіная ці агульная), то прышлі да высновы, што, напэўна, ўсё ж такі агульная. У нас агульныя праблемы ў адукацыі, але падыходы да іх рашэння ў кожнага свае. Мяркую, што на постсавецкай прасторы неабходна ажыццяўляць карэляцыю падыходаў і спосабаў ацэньвання вучэбных дасягненняў у адпаведнасці з міжнароднымі. Хоць трэба мець на ўвазе, што чужы досвед не кладзецца механічна на нашу рэчаіснасць. Іншаземцы даўно прайшлі той этап, на якім мы сёння з вамі знаходзімся, і яны проста не разумеюць нашых праблем. Мы супраць іх — як навічкі супраць чэмпіёнаў свету.

— Прынцып «Дзе лепш пішуць дыктоўкі, там лепшая сістэма адукацыі» даўно састарэў, — лічыць **дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Генадзь ПАЛЬЧЫК**. — Сёння прынцыпова важнае значэнне мае ўменне старшакласнікаў працаваць з інфармацыяй у плане яе атрымання, правільнага ацэньвання, выкарыстання і далейшай перадачы. Ад гэтага напрамую залежыць гатоўнасць нашых дзяцей жыць у сучасным свеце і арыентавацца ў патоках інфармацыі, якія штодня абрушваюцца на ўсіх нас. Значэнне мае не проста наяўнасць тых ці іншых ведаў, а ўменне падлеткаў прымяняць свае веды на практыцы.

Між іншым, Расія, у адрозненне ад Беларусі, ужо даўно далучылася да міжнародных праграм ацэньвання ведаў школьнікаў TIMSS і PISA. Прызначэнне PISA заключаецца якраз у праверцы ўзроўню кампетэнтнасці 15-гадовых падлеткаў: задачы тэстаў вызначаюць уменне школьнікаў прымяняць атрыманыя ў школе веды і ўменні ў канкрэтных жыццёвых сітуацыях. Між іншым, вынікі PISA

У Беларусі, як вядома, сёлета пасля правядзення ЦТ ніхто з абітурыентаў не меў ніякага ўяўлення аб тым, на якім свеце ён знаходзіцца ў параўнанні з іншымі прэтэндэнтамі на студэнцкі білет.

мелі ў свеце такі эфект, што з'явіўся нават выраз «PISA-шок». Напрыклад, Германія палічыла канфузам, скандалам і шокам 20-е месца па матэматыцы і прыродазнаўчых навуках і 21-е месца па чытанні, якія нямецкія школьнікі занялі па выніках PISA ў 2000 годзе. Высновы не прымусілі сябе доўга чакаць, і ўжо ў 2009 годзе Германія істотна палепшыла свае пазіцыі па кожным з тэставых прадметаў (па чытанні заняла 16-е месца сярод 65 краін, 10-е — па матэматыцы і 9-е — па прыродазнаўчых навуках).

Сёння сваё месца ў сусветным рэйтынгу па выніках PISA ведаюць на постсавецкай прасторы, акрамя Расіі, яшчэ Азербайджан, Малдова, Казахстан, Кыргызстан і краіны Балтыі. Беларусь жа пакуль толькі думае, ці варта ёй далучацца да міжнароднага даследавання.

Дырэктар Расійскага трэнінгавага цэнтра, загадчык лабараторыі маніторынгу якасці адукацыі Інстытута кіравання адукацыі Расійскай акадэміі адукацыі Ігар ВАЛЬДМАН расказаў пра досвед замежных краін у правядзенні нацыянальных маніторынгаў. Для прыкладу, у ЗША, пачынаючы з 1969 года, рэалізуецца праграма нацыянальнай ацэнкі прагрэсу ў адукацыі (NAEP). Для гэтага робіцца выбарка ў 4, 8 і 12 класах. Адна з умоў — гэта добраахвотнасць удзелу ў

Прынцып «Дзе лепш пішуць дыктоўкі, там і лепшая сістэма адукацыі» даўно састарэў. Значэнне мае не проста наяўнасць тых ці іншых ведаў, а ўменне падлеткаў прымяняць свае веды на практыцы.

маніторынгу. Вучэбныя дасягненні школьнікаў ацэньваюцца ў ключавых галінах: па матэматыцы, англійскай мове, сацыяльных навуках, эканоміцы, геаграфіі і гісторыі ЗША. Калі былі апублікаваны **першыя вынікі тэстаў NAEP, высветлілася, што 17-гадовыя чарнаскурыя школьнікі чытаюць і лічаць прыкладна так, як 13-гадовыя белыя.** Нельга сказаць, што атрыманыя звесткі былі сюрпрызам для педагогаў, але толькі пасля іх публікацыі на федэральным узроўні з'явіліся магчымасці палепшыць вынікі навучання чарнаскурых грамадзян. Вынікі NAEP публікуюцца ў нацыянальным дакладзе, які даносіць да шырокай грамадскасці інфармацыю аб акадэмічных дасягненнях амерыканскіх школьнікаў.

У 2002 годзе ў ЗША быў прыняты федэральны закон «Ніводнага непаспяховага дзіцяці». Гэты закон патрабуе правядзення штогадовага тэсціравання ўсіх школьнікаў у 3-8 класах і 1 раз у старэйшай школе па чытанні, матэматыцы і прыродазнаўчых навуках. На дзяржаўным ўзроўні была пастаўлена мэта: усе навучэнцы да 2014 года павінны дасягнуць «дастатковага» ўзроўню або прадэманстраваць вышэй за дастатковы ўзровень у тэстах свайго штата па матэматыцы і чытанні. Трэба штогод дэманстраваць прагрэс у выніках, інакш не выключана прымяненне розных санкцый да школ: гэта можа быць перавод навучэнцаў у іншую школу, увядзенне для навучэнцаў дадатковых заняткаў, замена настаўнікаў, увядзенне новага вучэбнага плана, павелічэнне часу навучання, закрыццё школы, перадача школы пад кіраванне прыватнай кампаніі або дэпартамента адукацыі штата.

У Аўстраліі дзейнічае нацыянальная праграма ацэнкі вучэбных дасягненняў NAPLAN, якая ахоплівае навучэнцаў 3, 5, 7 і 9 класаў. NAPLAN правярае веды і навыкі па чытанні, пісьме, правілах мовы і матэматыцы. Праграма праводзіцца штогод і адсочвае прагрэс кожнага навучэнца. Асобнай увагі заслугоўвае сайт «Мая школа», дзе прадстаўлены статыстычныя і кантэкстныя звесткі па кожнай школе, а таксама вынікі тэсціравання, якое праводзіцца ў рамках NAPLAN і якія можна супастаўляць з вынікамі, атрыманымі ў іншых школах з падобным кантынгентам навучэнцаў па ўсёй Аўстраліі.

Рэйтынгі і вынікі тэсціравання ў дзяржаўных школах публікуюцца і ў Чылі, дзе з 1988 года дзейнічае нацыянальная праграма ацэнкі якасці адукацыі SIMCE. У гэтай праграме ўдзельнічаюць навучэнцы 4, 8 і 10 класаў. У газетах затым публікуюцца як сярэднія балы школ, так і сярэднія балы па прадметах і класах, сярэднія па краіне балы, сярэднія балы школ з аналагічных сацыяльна-эканамічных груп. **І вось што характэрна: ніхто не робіць з гэтага дзяржаўную тайну!**

У Беларусі, як вядома, сёлета пасля правядзення ЦТ ніхто з абітурыентаў не меў ніякага ўяўлення аб тым, на якім свеце ён знаходзіцца ў параўнанні з іншымі прэтэндэнтамі на студэнцкі білет. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў сталіся ад журналісцкіх трактовак і высноў, якія «акулы пяра» самастойна робяць пасля абвяшчэння сярэдняга бала ўдзельнікаў ЦТ, таму і катэгарычна адмовіліся ў разгар прыёмнай кампаніі выносіць на суд грамадскасці хоць нейкія лічбы.

— Па выніках цэнтралізаванага тэсціравання абітурыентаў нельга рабіць ацэнку работы ўсёй школы, — упэўнены і Генадзь Пальчык. — У ЦТ — зусім іншыя функцыі і задачы...

У Расіі таксама з моманту ўвядзення Адзінага дзяржаўнага экзамену апошні пазіцыянуецца як ацэначная працэдура, якая дазваляе атрымаць інфармацыю аб стане адукацыі ў краіне і рэгіёне, меркаваць аб тэндэнцыях у адукацыі і ствараць аснову для кіравання якасцю адукацыі на ўсіх узроўнях. У сусветнай практыцы гэту функцыю выконваюць нацыянальныя маніторынгі, вынікі якіх і не цягнуць наступстваў для саміх навучэнцаў. Затое, абапіраючыся на вынікі маніторынгаў, прымаюцца рашэнні ў адносінах да адукацыйных устаноў і ўсёй сістэмы адукацыі. Расійскія спецыялісты скардзяцца: на жаль, нярэдка аналіз і інтэрпрэтацыя вынікаў АДЭ робяцца вельмі некарэктна, што прыводзіць да памылковых заключэнняў і высноў і да неадэкватных кіраўніцкіх рашэнняў...

Трэба дадаць, што з 2010 года ў Расіі запушчаны сумесны праект «РІА-навіны» і Вышэйшай школы эканомікі «Сацыяльны навігатар». Па задумках стваральнікаў праекта, «Сацыяльны навігатар» павінен стаць компасам для людзей, якія жадаюць даць сваім дзецям годную адукацыю. На інтэрнэт-сайце «Сацыяльнага навігатара» сёння можна знайсці вынікі і ўмовы адукацыйнай дзейнасці ВНУ, школ, дзіцячых садзікаў, кампаній, якія займаюцца арганізацыяй дзіцячага адпачынку. Напрыклад, там можна знайсці нават ТОП ВНУ, які складаўся, зыходзячы з даступнасці іх будынкаў для маламабільных груп насельніцтва, якім праблематычна жыць у асяроддзі, разлічаным на фізічна здаровых людзей.

На думку Віктара Болатава, цікавасць для грамадства прадстаўляюць не толькі маніторынгі вучэбных дасягненняў школьнікаў, але і іншыя маніторынгі, звязаныя з дзяцінствам. Зараз на партале «Саюзнага навігатара» можна знайсці, напрыклад, партрэт маскоўскага першакласніка, стратэгіі адукацыйнага маршруту, якія бацькі выбіраюць для сваіх дзяцей. І зусім «свежая» інфармацыя — заробкавыя чаканні выпускнікоў расійскіх ВНУ: на што разлічваюць уладальнікі тых ці іншых дыпломаў аб вышэйшай адукацыі...

Аўтары праекта спадзяюцца, што рэйтынгі з цягам часу стануць своеасаблівай формай грамадскага кантролю за ўстановамі адукацыі, зробяць іх дзейнасць больш адкрытай і празрыстай і, галоўнае, будуць стымуляваць канкурэнцыю.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Даведка «Звязды»

Вынікі маніторынгу асобаснага развіцця і ўзроўню выхаванасці навучэнцаў, праведзенага спецыялістамі Нацыянальнага інстытута адукацыі:

Адмоўны эмацыйны стан на вучэбных занятках пастаянна адчуваюць каля 10% старшакласнікаў. Апатыя і нудота — звычайны стан на ўроках для 13% навучэнцаў. Ад няўпэўненасці ва ўласных сілах церпяць 14% апытаных. Раздражненне, нежаданне штосьці рабіць падчас навучальнага працэсу адчуваюць каля 8% вучняў. Часцей за ўсё негатыўны эмацыйны стан, які ўзнікае ў навучэнцаў у працэсе вучэбнай дзейнасці ў школе, звязаны з бояззю атрымаць нізкую адзнаку або не такую высокую як бы хацелася, на што ўказалі 49,9% рэспандэнтаў, а таксама з неразуменнем вучэбнага матэрыялу (44,7%). Прыкладна ў чвэрці выпадкаў прычына эмацыйнага дыскамфорту навучэнцаў — страх перад кантрольнай работай (26,4%) ці страх адказваць каля дошкі (22,6%). Аналагічны стан могуць выклікаць таксама незразумелыя для вучняў патрабаванні настаўніка, на што ўказалі 14,9% рэспандэнтаў. 9% старшакласнікаў церпяць ад знявагі і ціску на іх з боку педагогаў, пастаяннага параўнання з іншымі вучнямі. 8% старшакласнікаў на пытанне аб тым, што можа выклікаць у іх негатыўныя эмоцыі на вучэбных занятках, адказалі: «Боязь насмешак з боку аднакласнікаў».

СМЯРОТНА НЕБЯСПЕЧНАЯ СЛІНА

За 8 месяцаў гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага колькасць захворванняў на шаленства жывёл знізілася ў нашай краіне з 999 да 303 выпадкаў. Важная роля належыць рабоце спецыялістаў органаў дзяржаўнага санітарнага і ветэрынарнага наглядаў.

Як паведамляюць у **аддзяленні асабліва небяспечных інфекцый Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя,** у выніку кантакту з хворымі на шаленства жывёламі ў арганізацыі аховы здароўя звярнулася 356 чалавек, што практычна ў два разы менш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Часцей за ўсё па меддапамогу звярталіся пацярпелыя ад сабак і катоў. За 6 месяцаў зарэгістравана 11 выпадкаў масавага кантакту людзей з хворымі на шаленства жывёламі, у выніку чаго пацярпелі 74 чалавекі.

Шаленства застаецца сур'ёзнай, на жаль, нявырашанай праблемай у свеце. Размова ідзе аб інфекцыйным вірусным захворванні, якое перадаецца іншым жывёлам (заражацца могуць лісіца, янотападобны сабака, ваўкі, сабакі і каты, буйная рагатая скаціна, коні і іншыя траваедныя жывёлы) і людзям пры кантакце са слінай інфіцыраваных жывёл. Першыя сімптомы могуць праяўляцца свербам і болем па ходзе нерваў у месцы пашкоджанай у выніку ўкусу скуры. Хвароба хутка прагрэсуе і пагражае гібеллю ад спынення дыхання і сардэчна-сасудзістай дзейнасці.

ПЕРАЛІЧЫЛА ГРОШЫ... У СВАЮ КІШЭНЮ

Бухгалтара Ветрынскай дзяржаўнай агульнаадукацыйнай базавай школы-інтэрната Полацкага раёна прыцягнулі да крымінальнай адказнасці: яе асудзілі на 5 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і з пазбаўленнем права займаць пасады, звязаныя з улікам, захоўваннем і распараджэннем матэрыяльнымі каштоўнасцямі, тэрмінам на два гады.

Цэлы шэраг парушэнняў быў выяўлены Полацкім міжраённым камітэтам дзяржаўнага кантролю падчас праверкі. Высветлілася, што кіраўніцтва бухгалтэрыяй у школе-інтэрнаце ажыццяўлялася спецыялістам, які да паступлення на працу ў школу-інтэрнат у якасці галоўнага бухгалтара меў сярэднюю спецыяльную адукацыю і не меў вопыту работы на такой пасадзе.

Кантроль за вядзеннем касавых аперацый з боку кіраўніцтва і галоўнага бухгалтара ва ўстанове не ажыццяўляўся, што прывяло да абуральных фактаў. Бухгалтар незаконным шляхам прысвоіла грошы — 58,7 мільёна рублёў. Пры налічэнні заработнай платы работнікам завышалася выніковая сума ў аплатных ведамасцях — шляхам завышэння адпрацаванага часу асобнымі работнікамі, а розніца паміж атрыманымі ў банку грашовымі сродкамі і выплачанымі па ведамасцях — прысвойвалася. Усяго за перыяд праверкі выяўлены 141 расходны касавы дакумент, не падпісаны кіраўніком установы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КАБ АБАРАНІЦЦА АД ШАЛЕНСТВА НЕАБХОДНА...

- ❑ штогод паказваць сабак і катоў ветэрынару для правядзення прафілактычных прышчэпак супраць шаленства.
- ❑ у выпадку змянення паводзін жывёлы звярнуцца да ветспецыяліста для назірання або высвятлення прычыны смерці.
- ❑ не дазваляць дзецям кантактаваць з безнаглядными жывёламі.
- ❑ нагадаць дзіцяці аб неабходнасці расказваць пра нязначныя пашкоджанні, нанесеныя жывёламі.
- ❑ паказаць ветурачу падабраную дзікую ці безнаглядную жывёлу.
- ❑ не браць жывёлу «на летні дачны сезон», пакалькі, выкідваючы яе пасля, вы павялічваеце тым самым колькасць безнаглядных жывёл і павышаеце рызыку ўзнікнення шаленства ў гэтым рэгіёне.
- ❑ устанавіць за жывёлай, якая пакусала або падрапала, 10-дзённае назіранне.
- ❑ прыняць меры засцярогі пры з'яўленні дзікай жывёлы на падворках сельскай мясцовасці (здаровая дзікая жывёла, як правіла, пазбягае сустрэчы з чалавекам).
- ❑ нават пры кантакце са знешне здаровай жывёлай неабходна на працягу 15 хвілін прамыць рану вадой з мылам, апрацаваць яе край 5-працэнтнай настойкай ёду і тэрмінова звярнуцца ў медустанову.
- ❑ правесці імунізацыю супраць шаленства як мага хутчэй.

Святлана БАРЫСЕНКА.

З-ЗА ПАМІНАЛЬНАЙ СВЕЧКІ Ў СЛОНІМЕ АДБЫЎСЯ ПАЖАР

Яго ў жылым доме па вуліцы Гагарына, на шчасце, заўважыў выпадковы сведка. Ён жа здолеў вынесці з агню чалавека.

— Сігнал пра здарэнне паступіў у 23.46. Калі праз восем хвілін на месца прыбылі нашы падраздзяленні, дом гарэў адкрытым полымем, — паведамілі ў цэнтры прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Высветлілася, што напярэдадні ў гаспадара дома, 59-гадовага мужчыны, памерла маці. Разам з сястрой (на два гады маладзейшай) яны развітваліся з родным чалавекам. Увечары заснулі, пакінуўшы запаленую памінальную свечку каля труны, і не заўважылі, як тая ўпала і полымя перакінулася на мэблю.

Відавочца, які выклікаў выратавальнікаў, патрапіў у дом і вынес на свежае паветра сястру гаспадара жылля, якая атрымала апёкі першай-трэцяй ступені спіны, грудзей, рук, твару (35 працэнтаў паверхні цела), апёк верхніх дыхальных шляхоў. Жанчыну шпіталізавалі ў рэанімацыйнае аддзяленне Слонімскай цэнтральнай раённай бальніцы ў цяжкім стане. Гаспадар дома не пацярпеў. У выніку пажару ў жыллі пашкоджаны сцены, дах, маёмасць унутры.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Мядельского райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:

Лот № 1: здание теплицы, инвентарный номер 633/С-10407, об. пл. 1135,3 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, Мядельский район, г. Мядель, ул. Новая, д. 15.

Начальная цена с НДС – 504 000 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,7701 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования.

Ограничения в использовании: водоохранная зона озера Мястро, вне прибрежной полосы, пл. 0,7701 га; охранная зона линий электропередач напряжением 35 кВ, пл. 0,0032 га).

Лот № 2: здание магазина, инвентарный номер 633/С-10862, об. пл. 61,2 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, г. Мядель, ул. Новая, д. 4а.

Начальная цена с НДС – 53 000 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,0579 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования.

Ограничения в использовании: водоохранная зона озера Мястро).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 27.06.2012; 28.06.2012.

Аукцион состоится **02.11.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **31.10.2012** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Столбцовский райагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

производственной базы,

расположенной по адресу: Минская обл., г. Столбцы, ул. 17-го Сентября, д. 50, в составе зданий:

административное здание (инв. № 622/С-20880), об. пл. 684,8 кв.м; ремонтная мастерская (инв. № 622/С-20878), об. пл. 1405,6 кв.м; гараж (инв. № 622/С-20883), об. пл. 1366,1 кв.м; здание по заправке (инв. № 622/С-37759), об. пл. 60,5 кв.м; будка смотровая (инв. № 622/С-20881), об. пл. 30,3 кв.м; здание кузницы (инв. № 622/С-37758), об. пл. 17,0 кв.м; **сооружений:** ограждение (кирпичное; ж/б), площадка на территории (асфальтобетон), ворота въездные, цистерна (25 куб.м), цистерна (50 куб.м), противопожарный резервуар, грязеотстойник (ж/б кольца), будка сторожевая, эстакада для мойки машин; **передаточных устройств:** телефонные внеплощадочные сети, внутриплощадочные электросети, внутриплощадочные теплосети, внутриплощадочные сети водопровода, внутриплощадочные сети канализации, внеплощадочные сети канализации, газопровод.

Начальная цена с НДС – 3 361 089 600 бел. руб.

Площадь земельного участка – **3.4839 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **5** (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение **30** (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www. rlt.by.

Аукцион состоится **01.11.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.10.2012** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

по продаже неиспользуемого имущества с установлением начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине

Наименование неиспользуемого имущества	**ЗДАНИЕ СТОЛЯРНОГО ЦЕХА**
Местонахождение неиспользуемого имущества	Республиканское унитарное производственное предприятие «Гранит» тел.: (01647) 4 34 89, 4 34 51 факс (01647) 4 36 00
Продавец неиспользуемого имущества	Брестская область, Лунинецкий район, г. Микашевичи, ул. Маяковского, 37
Сведения о неиспользуемом имуществе и информация о земельном участке	Здание, 1-этажн., 1990 г.п., общая площадь – 99,0 кв.м. Земельный участок площадью 0,0255 га, срок аренды – 49 лет, ограничения в охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт на площади 0,0025 га, использовать земельный участок для размещения производства, общественного питания, торговли, услуг
Обязательные условия аукциона	- после регистрации перехода права собственности недвижимого имущества, а при необходимости после проведения ремонта или реконструкции создание не менее 3 рабочих мест; - после регистрации перехода права собственности недвижимого имущества, а при необходимости после проведения ремонта или реконструкции осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте не менее 5 лет; - запрещение покупателю продажи, иного отчуждения неиспользуемого имущества до выполнения им условий договора купли-продажи
Начальная цена неиспользуемого имущества (в базовых величинах)	1
Размер задатка (в базовых величинах)	1
Реквизиты счета для перечисления задатка	р/с 3642941148018 дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области, код банка 739, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе.
Организатор аукциона	**Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: (0162) 21 19 82, 23 44 06, 23 44 78, www.brest-region.by**

Аукцион проводится **26 октября 2012 года** в **11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11 марта 2010 г. № 342.

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, внесшие задаток в установленном порядке, подавшие заявление с приложением необходимых документов с соответствии с вышеназванным Положением, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Участник, выигравший торги (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или о признания аукциона несостоявшимся возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона с начальной ценой, равной одной базовой величине, либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, после чего, но не позднее 2 рабочих дней в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Информация о ранее проведенном аукционе была опубликована в газете «Звязда» от 15 августа 2012 г. № 156.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу:
г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413 фонд «Брестоблимущество»
с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням
со 2 октября 2012 г. по 25 октября 2012 г. включительно

Уважаемые акционеры ОАО «Агрофирма «Рассвет»

1 ноября 2012 года СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Агрофирма «Рассвет»,

расположенного по адресу: Минский район, агрогородок Новый Двор

Собрание пройдет по адресу:
Минский район, агрогородок Новый Двор, административное здание.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Избрание счетной комиссии.
2. Избрание наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
3. Утверждение размера и порядка выплаты вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
4. Утверждение:

- Регламента работы ОАО «Агрофирма «Рассвет» с реестром владельцев ценных бумаг.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минский район, агрогородок Новый Двор, административное здание **в рабочие дни с 15 по 31 октября 2012 года (время работы с 9.00 до 16.30) либо 1 ноября 2012 года с 14.30 по месту проведения собрания.**

Регистрация участников собрания — в день проведения собрания 1 ноября 2012 года с 14.30 до 14.50 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 1 ноября 2012 года в 15.00.

При регистрации участники обязаны предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Представители участников обязаны при регистрации предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также доверенность, удостоверенную в установленном законодательством порядке.

УНП 600052822

Ігуменскі тракт

№ 10 (10)

«ФІШКІ» НАШАЙ САМАБЫТНАСЦІ

Вылучыў першы з'езд экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў

Сёння модна самому вандраваць па свеце, не шукаць падказак і не слухаць каментарыяў. Знайсці маршрут і кароткія звесткі пра аб'ект наведвання ў сеціве — што можа быць прасцей? Аўтастоп, турызм «дзікунамі» — свет быццам спрашчаецца і здаецца зусім знаёмым. Адолець дзясяткі ці сотні кіламетраў, убачыць тое, што намечана, а пасля... казаць усім: «Так, я там быў». Аднак што застанецца не толькі ва ўспамінах, але і ў галаве, і ў сэрцы? Бо часам проста адзін раз убачыць — мала. Трэба яшчэ пару разоў пачуць, што гэта такое і хто і чаму яго прыдумаў. Таму людзі, якія гатовы сеяць разумнае, добрае, вечнае пра сваю гісторыю і культуру ў сэрцах суайчыннікаў і замежнікаў, усё-такі ёсць. Экскурсаводы і гіды-перакладчыкі заяўляюць пра сябе, сабраўшыся на свой першы з'езд.

Абмяркоўвалі на з'ездзе, у прыватнасці, кошты на нашы турыстычныя паслугі. Іх ацэньвала **Галіна ПАТАЕВА — дацэнт геаграфічнага факультэта БДУ, дырэктар таварыства з дадатковай адказнасцю «Віаполь»**. Фірма, якую яна ўзначальвае, адна з найбольш аўтарытэтных у турысцкай сферы Беларусі: на тыдзень яны праводзяць 33 экскурсіі. Накіраваць вялікія турыстычныя патокі ў нашу краіну складана з-за слаба развітай інфраструктуры, мяркуе Патаева:

— Вялікая адказнасць ляжыць на фірмах, якія займаюцца ўязным турызмам, па прычыне няяркасці нашага турыстычнага прадукту. Аднак кошт на туры ў Беларусь з тых жа Масквы і Санкт-Пецярбурга вышэйшы, чым на тую ж колькасць дзён ва Украіну ці нават у Прагу. Таму што ў наш турыстычны прадукт трэба шмат усяго ўкладаць. Мы не Парыж, гэта ў Парыжы галоўная мэта наведвання — сам горад, яго аўра. Там не важна, дзе жыць, можна і на ўскраіне, не важна, дзе харчавацца: ёсць вялізная колькасць кавярняў. На кожным кроку — сувенірныя крамы. У нас жа, каб стварыць высокаэфектыўны турыстычны прадукт, даводзіцца ўсе гэтыя кампаненты ўкладаць у кошт. Жыць на ўскраіне Мінска нельга, бо тады горад не зайграе. А жыць у атэлі менш чым тры зоркі не атрымаецца, таму што ў сталіцы іх папросту няма. І, напрыклад, у Дудутках ці Нясвіжы немагчыма сказаць: «Зараз у вас вольны час, можаце выпіць кавы, паабедаць», — бо ўсе месцы заняты, трэба загадзя замовіць, аплаціць. Усё гэта і абумоўлівае высокі кошт на нашы турыстычныя паслугі.

Адзначалі на з'ездзе і тое, што складана прывабіць турыстаў на «нехітовыя» маршруты — калі гэта не Мір, Нясвіж, Ружаны, Крычаў, Косава — на так званыя маршруты «і гэтак далей», пра якія мала хто ведае з-за адсутнасці рэкламы. Да прыкладу, тут згадваўся маляўнічы палескі Пінск. Аднак **дырэктар фонду «Краіна замкаў» Алесь ВАРЫКІШ** выказаў іншую думку. Ён упэўнены, што калі маршрут не брэндавы, важна рабіць акцэнты, выкарыстоўваць мясцовыя «фішачкі». Дзесьці гэта ружавашчокі жыхар пушчы, дзесьці бабуля, што распавядзе пра тое, як і што тут было раней на яе памяці, і яблыкамі пачастуе, і пакажа, дзе вожыкі дарогу перабягаюць; дзесьці гэта чалавек, які ўласнымі сіламі аднаўляе цэлы замак. У такіх умовах, упэўнены Варыкіш, экскурсавода нельга ўспрымаць у традыцыйным разуменні. Ён становіцца і публіцыстам, і аналітыкам, і краязнаўцам, і агітатарам.

Хутка экскурсаводы і гіды-перакладчыкі будуць мець права праводзіць толькі тыя экскурсіі, па якіх яны атэставаны. Наспела неабходнасць рэарганізацыі экскурсійнай працы на заканадаўчым узроўні. **Дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзім КАРМАЗІН** адзначыў, што падрыхтаваны дакументы аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у праект пастановы Савета Міністраў аб парадку правядзення прафесійнай атэстацыі экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў. Будуць уведзены абавязковыя адукацыйныя курсы для праходжання прафесійнай атэстацыі. Прадугледжаны таксама аналіз якасці экскурсій на маршрутах. Атэстацыйная камісія будзе мець права забіраць пасведчанне з-за няякасных экскурсій або скаргаў турыстаў. Атэстацыя стане платнай — каб пакрыць выдаткі працы камісіі.

Адзначыў Кармазін і тое, што зараз у нас рыхтуецца зашмат спецыялістаў экскурсійнай справы, таму іх адукацыйная сфера будзе рэфармавана. Сёння падрыхтоўку ў сферы турызму ажыццяўляюць 20 ВНУ і 8 ССНУ. Для маленькай краіны гэта занадта. Калі падлічыць, то да 2015 года, калі ўсе выпусцяць сваіх студэнтаў па спецыяльнасці, атрымаецца 3000 спецыялістаў. У той час як зараз у турфірмах краіны спецыялістаў з такой адукацыяй працуе 3200 чалавек. Атрымліваецца, можна амаль цалкам змяніць іх склад. Кармазін задаецца пытаннем: ці патрэбна нам столькі адукацыйных устаноў у гэтай сферы?

Абмяркоўваліся на з'ездзе і найбольш папулярныя і перспектыўныя сёння маршруты. Дырэктар Дэпартамента па турызме адзначыў, што пэўную цікавасць выклікаюць экскурсіі з выкарыстаннем нематэрыяльнай спадчыны, калі на фестывалі прыязджаюць арганізаваныя групы турыстаў. Так, на фестываль «Мотальскія прысмакі» ўжо традыцыйна любяць завітваць як суайчыннікі, так і госці з-за мяжы. Аднак, каб даты такіх падзей прызначаліся раней, было б значна прасцей фарміраваць турыстычныя групы. Гэта пацвердзіла і **дырэктар аддзялення «Мазовія» Польскага турысцка-краязнаўчага таварыства Хелена СУГЕР**. Яна адзначыла, што ў Беларусі ладзіцца шмат добрых фестываляў, польскія турысты з задавальненнем прыязджалі б на іх, аднак месяц правядзення ім трэба ведаць мінімум за паўгода, каб паспець прэзентаваць падзею на турыстычнай выставе і зрабіць візу.

Старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў Мікола ЧЫРСКІ адзначыў, што вялікую папулярнасць зараз атрымліваюць прыродазнаўчыя маршруты. На аснове турысцкіх рэкрэацыйных тэхналогій можна стварыць этнакультурныя цэнтры ў Нацыянальным парку «Белавежская пушча», на Браслаўскіх азёрах, у Прыпяцкім запаведніку. Нельга не выкарыстоўваць прыродныя багацці Беларусі для адпачынку, аздараўлення і лячэння з прымяненнем мінеральных вод і гразяў, якімі багатая наша краіна. Арганізацыя водных, пешых і конных маршрутаў — адны з самых актыўных відаў адпачынку турыстаў у прыродным асяроддзі, на якія таксама трэба звярнуць увагу.

Мікола Чырскі адзначыў і тое, што нельга не выкарыстоўваць у экскурсійнай справе і выгаднае геаграфічнае становішча нашай краіны і, суадносна, распрацоўваць турыстычныя маршруты сумесна з іншымі краінамі — напрыклад, экскурсійны маршрут «З варагаў у грэкі»:

— Лёсу Беларусі наканавана знаходзіцца на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў — на стыку гістарычных і культурных традыцый заходняй і ўсходняй цывілізацый. Таму ў развіцці стымулявання турысцкага сектару паслуг важную ролю павінна стварыць развіццё транс'еўрапейскага камунікацыйнага калідору Заходняя Еўропа — Беларусь — Расія. Мы павінны прапанаваць на сусветны рынак, у першую чаргу, транзітныя турысцкія маршруты, таксама калідор Санкт-Пецярбург — Адэса, які звязвае скандынаўскія краіны з Чарнаморскім басейнам. Яго беларуская частка (Полацк — Віцебск — Магілёў — Гомель) — гэта турыстычны маршрут «З варагаў у грэкі», які можа стаць адным з самых папулярных.

З'езд паказаў, што ў Беларусі экскурсійная справа не перажывае свайго буму. Аднак зразумела: тое, што мы можам найлепш прадаць, гэта самабытнасць. Толькі пра вандроўку, у якую ўкладзена душа экскурсавода, турысты змогуць сказаць: «Такога няма нідзе».

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Правер сябе

(ТУР 4)

ПЫТАННІ ДЛЯ ЦІКАЎНЫХ

Вітаю ўсіх аматараў гісторыі! Час ідзе, незаўважна для нас мы і самі робімся гісторыяй. Сыдуць дзесяці- або стагоддзі — і застанецца эпоха, «кантэкст», у якім нам давялося жыць. Самая значная падзея, што адбылася якраз два стагоддзі таму, — вайна 1812 года. Столькі часу мінула, аднак мы не перастаём узгадваць, быць можа, з-за гераічнасці і легендарнасці яе ўдзельнікаў або, мабыць, з-за лёсавызначальнасці атрыманай перамогі.

Не забываеце пра той далёкі час і вы, шаноўныя чытачы, у вашых лістах: шмат правільных адказаў на пытанні па вайне 1812 года. Абсалютным пераможцам нашага конкурсу стаў **Аляксандр Ганчароў** з п.а. Нісімкавічы Чачэрскага раёна. Правільныя адказы былі такімі. 1. Кавалерыя; 2. Луі Нікаля Даву; 3. Дзень народзінаў Напалеона Банапарта; 4. Пляц Напалеона, плошча Свабоды; 5. Ян Ходзька; 6. П.І Багратыён; 7. Сурдут, ці на рускай мове — «сюртук»; 8. Крамянёвае ружжо.

Цяпер давайце накіруем нашу машыну часу яшчэ далей, згадаем залаты век Вялікага Княства Літоўскага і Рэч Паспалітую. Прапануем вам наступныя пытанні:

1. Пры дварах якога караля пачаў сваю палітычную кар'еру Леў Сапега?

2. «Кароль сабе каралём у Кракаве, а я ў Нясвіжы...» Якой гістарычнай асобе належаць гэтыя словы?

3. Форма параднага партрэта, характэрная для мастацтва Рэчы Паспалітай пераважна часоў барока (XVI — XVIII стст.).

4. Міфічны продак магнацкага роду Радзівілаў.

5. Выява якой птушкі размешчана на полі шчыта герба роду Завішаў?

6. З якім архітэктурным помнікам горада Мінска звязаны род Вайніловічаў?

7. Дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае пячаткі і гісторыю іх існавання.

8. Чыё княжанне «... лічаць усе летапісцы росквітам Княства Літоўскага нашага краю» паводле твора Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра»?

■ Скарбонка спадчыны

ПА СЛЯДАХ ПАЎСТАНЦАЎ

Мясціны, звязаныя з падзеямі 1863 года, хутка будуць унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Гэта было вырашана на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры. Рада абмеркавала, ці адпавядаюць гэтыя памятныя мясціны тым крытэрыям, па якіх іх павінна ахоўваць дзяржава, і, зрабіўшы станоўчую выснову, унесла прапанову ў Савет Міністраў аб наданні ім статусу гісторыка-культурнай спадчыны.

Крыжу і каплічцы ў памяць пра загінулых у бітве пад Мілавідамі, побач з вёскай Калпакі Баранавіцкага раёна, прапанавана прысвоіць 2-ю катэгорыю помніка гісторыі (нацыянальнае значэнне). Магіле паўстанцаў у вёсцы Плябань Маладзечанскага раёна, за 300 м на паўднёвы захад ад вёскі на старых рымска-каталіцкіх могілках — як помніку гісторыі з прысваеннем катэгорыі 3 (мясцовае значэнне). Магіле паўстанцаў 1863 года ў горадзе Косава Івацэвіцкага раёна, на тэрыторыі рымска-каталіцкіх могілак на паўднёва-ўсходняй ускраіне горада — таксама прызнанне помнікам гісторыі і прысваенне катэгорыі 3.

Прапанову ў Міністэрства культуры аб наданні гэтым мясцінам такога статусу даслала Добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Гэтыя мясціны выбраны не выпадкова: у таварыстве ўжо рыхтуюцца да святкавання ўгодкаў, што прыпадаюць на 2013-ы. Там адзначаюць: «У юбілейны, 150-ты год паўстання мы крочым з пэўнымі дасягненнямі».

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

БУЦІК-АТЭЛЬ, ПРОЖНЯ, ЦЫРК

З небыцця — на дзяржаўны конкурс

Былы дом, у якім некалі жылі наёмныя рабочыя гаспадароў сядзібы, стаў буціком-атэлем. На месцы старой кузні з'явіўся рэстаран этнічных кухняў. Стайні вернуты ранейшы выгляд, і зараз у ёй, як некалькі стагоддзяў таму, разводзяць пародзістых коней. У старым зарослым парку з'явіліся дарожкі і ліхтары. Усё, сказанае вышэй, — пра «Панскі маёнтак» у вёсцы Сула Стаўбцоўскага раёна — менавіта ён атрымаў першы прыз у конкурсе «Лепшы прыклад аховы гісторыка-культурнай спадчыны».

Сёлетні пераможца Андрэй Запольскі, што ўзначальвае аднаўленне сядзібы ў вёсцы Сула, займаецца бізнэсам, адкуль і чэрпае неабходныя сродкі. Ён распавёў, што ў палацава-паркавым комплексе «Маёнтак Сула» размяшчаецца буцік-атэль з унікальнымі па аздабленні нумарамі: кожны нумар адпавядае пэўнай гістарычнай персоне. Зроблены рэстаран этнічнай кухні, дзе прапагандуюцца кулінарныя традыцыі ўсіх народнасцяў, што некалі насялялі нашу тэрыторыю. Зразумела, гэта беларуская этнічная кухня, элементы ўкраінскай, польскай, літоўскай, татарскай, яўрэйскай. Створана невялікая музейная экспазіцыя, што распавядае пра гісторыю сядзібы, пра людзей, якія некалі ў ёй жылі. Можна нават убачыць, у якім стане ўладальнікам дасталася сядзіба і якой яны яе зрабілі.

Сёння яна ўяўляе сабой 4,5 гектара акультуранай тэрыторыі: выкананы ўсе ландшафтныя работы ў адпаведнасці з эпохай XVIII стагоддзя. Гэта значыць, дзе магчыма, клалі не сучасную плітку, а брукаванку. Зрабілі падсветку ліхтарамі, якія можна было бачыць у тыя часы. Пасадзілі такія ж дрэвы, якія раслі ў сядзібе ў той час.

Запольскі распавёў, што яшчэ ў 2006 годзе на месцы сядзібы былі звычайныя руіны. Ён з кампаніяй сяброў часам наведваў іх, смажыў шашлыкі каля ручая, што цячэ паблізу. Кожны год яны мелі магчымасць назіраць, як сядзіба ўсё больш сыходзіць у небыццё. Ідэя аднавіць гэты аб'ект з'явілася нечакана. Вырашылі яе ажыццявіць, нягледзячы на тое, што спатрэбяцца і сур'ёзныя капіталаўкладанні, і час, і чалавечы рэсурс. Сяброў-бізнэсмены сабралі дастаткова сур'ёзную каманду, падрыхтавалі дакументы, звярнуліся ў Міністэрства культуры, зацвердзілі праект і прыступілі да аднаўлення.

Андрэй Запольскі адзначыў, што за ажыццяўленне гэтай ідэі яны ўзялі далёка не з-за разлікаў атрымаць выгаду. Тыя грошы, якія яны накіравалі на ўзнаўленне комплексу, пры самых сціплых падліках (нават калі штодзённа ўвесь атэль і пасадачныя месцы ў рэстаране будуць запоўнены) да канца жыцця (у сярэднім 80 гадоў) не вернуцца. Таму гэта не камерцыйны праект. Цяпер сябры бачаць перспектыву на расшырэнне: аднавіць капліцу і радавы магільны склеп. Яны будуць працаваць над тым, каб узнавіць парк (выкласці сцежкі, прарэдзіць яго, ачысціць дрэвы), каб сапраўды надаць гэтаму комплексу статус сядзібна-паркавага.

Паслухаўшы развагі Запольскага, лаўлю сябе на думцы, што выпадковыя людзі за такія праекты не бяруцца.

— Можна зарабіць грошы, заплаціць падаткі і патрапіць іх на тыя рэчы, якія застануцца толькі на плёнцы і ва ўспамінах. А можна ўкласці сродкі ў такія праекты, за якія не будзе сорамна перад нашчадкамі. Каб яны сказалі, што іх папярэднікі (гэта значыць мы) не дарэмна патрацілі свой час. Пэўна, Бог дае грошы невыпадкова. Правільна распарадзіцца імі — таксама адна з задач, — заўважае бізнэсмен.

Урачыстасць па ўзнагароджанні пераможцаў конкурсу адбывалася ў Мінскай гарадской ратушы. Нехта з удзельнікаў заўважыў, што такую цырымонію можна праводзіць і з большым размахам: да́мы ў вячэрніх строях, кавалеры ў фраках, чырвоныя дыванковыя дарожкі... На гэты раз на ўрачыстасці прысутнічаў міністр культуры: Павел Латушка ўручаў дыпломы пераможцам. Ён адзначыў:

— Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай культурнай палітыкі. Вельмі важным для нас з'яўлялася прадэманстраваць усяму грамадству, усім тым, хто прымае ўдзел у рэстаўрацыйным працэсе, самыя лепшыя прыклады гэтай працы. Фактычна ў нас праводзіцца даволі шырокая і мэтанакіраваная палітыка ў гэтым кантэксце. З рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў выдаткоўваюцца вялізныя сродкі, каб захаваць тое, што дайшло да нас, і перадаць гэта наступным пакаленням. Усе гэтыя помнікі на слыху: Нясвіжскі палац Радзівілаў, Мірскі замак, галерэя Міхаіла Савіцкага, палац Пацёмкіных, Гомельскі палацава-паркавы ансамбль і шмат іншых. Вельмі важна, што ў гэтым конкурсе ўдзельнічалі як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя ўстановы — фактычна ўсе нашы грамадзяне прымаюць удзел у аднаўленні гісторыка-культурнай спадчыны.

Пра тое, што гэты кірунак працы важны для дзяржавы, сведчаць і лічбы, агучаныя міністрам. Павел Латушка расказаў, што за апошнюю пяцігодку толькі з рэспубліканскага бюджэту было выдаткавана каля 250 мільёнаў долараў на аднаўленне і захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцяў. У межах праграмы «Замкі Беларусі» часткова распланаваны бюджэт на наступны год, засталося толькі зацвердзіць яго ў Савеце Міністраў і кіраўніка дзяржавы. На рэстаўрацыю і кансервацыю Навагрудскага замка плануецца выдаткаваць каля 10 млрд рублёў. Крэўскі замак, верагодна, атрымае 5 мільярдаў рублёў, Ружанскі — таксама 5 млрд.

Конкурс на «Лепшы прыклад аховы гісторыка-культурнай спадчыны» ладзіўся Міністэрствам культуры ўпершыню і быў прымеркаваны да еўрапейскіх дзён спадчыны. У будучым жа ён стане традыцыйным, пераможцы будуць вызначацца ў розных намінацыях. Акрамя таго, лепшыя змогуць атрымаць не толькі статуэтку ў выглядзе Камянецкай вежы, але і грашовую прэмію.

Другое месца было прысуджана фермерскай гаспадарцы «Быхаўцаў Уладзімір Іванавіч» за рэстаўрацыю і аднаўленне ветранога млына XIX ст. на хутары «Міколаў востраў» Светлагорскага раёна. Трэцяе месца атрымала праектнае камунальнае прадпрыемства «Мінскпраект» за аб'ект «Добраўпарадкаванне тэрыторыі былых Мінскіх могілак» і стварэнне мемарыяльнага комплексу «Памяці воінаў Першай сусветнай вайны 1914-1918 гг.» па Старавіленскім тракце ў Мінску.

Лаўрэатамі конкурсу былі прызнаны яшчэ дзве ўстановы са сваімі праектамі: упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама (дырэктар Дзмітрый Віскулёнак) за рэканструкцыю будынка Беларускага дзяржаўнага цырка па праспекце Незалежнасці, 32 у г. Мінску і Гродзенскае гарадское ўнітарнае прадпрыемства «Лімож» (дырэктар Святлана Галаўнёва) за рэканструкцыю кавярні з размяшчэннем кандытарскай па вуліцы Савецкай, 7 у г. Гродна).

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Кавярня-пірожня ў Гродне.

Хол мінскага цырка.

Кулінарная Энцыклапедыя Мікалая Нікіфароўскага

ХЛЕБ З ТОРФУ АБО ГЛІНЫ? У АДЧАЙНЫЯ ГАДЫ...

Усё не бяда — калі ёсць хлеб ды вада. І гэта не проста словы — гэта жыццё, таму што жыта, з якога выраблялі хлеб нашы продкі, мае аднолькавы корань са словам «жыць». ***У нарысе «Старцы» Нікіфароўскі піша: «Мужик сыт до Филиппова поста (перадкалядны пост — А.В.); с наступлением последнего он целиком остается на яровом хлебе, проедает его за время продолжительного поста так, что в послерождественский мясоед он приобретает в свою очередь крохи «еминного» ярового хлеба да мясные остатки».*** **І калі ў сям'і заканчваўся хлеб-карміцель, заставалася адно: «прычапіць торбу к горбу» і адправіць аднаго або некалькіх членаў сям'і па міласціну Хрыстовую. Таму для віцебскага селяніна хлеб быў тым надзейным плытом, які трымаў яго на паверхні бурлівага жыццёвага мора і не дазваляў затануць у яго глыбінях. Мікалай Якаўлевіч у кнізе «Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности» называе наступныя**

Гатункі хлеба хатняга прыгатавання:

1. «Чыстый». Гэты хлеб гатаваўся з правеянага на таку жыта, якое потым малацілася ў ступе, сушылася ў печы, малолася, а мука прасейвалася праз густое рэшата. Этнограф заўважае: *«Потребители чистого хлеба бывали редки, и достаточно сказать, что такой-то «есь» чистый хлеб, чтобы в окружище о нем заговорили как о богаче».* Калі ў цеста для выпякання «чыстага» хлеба дадавалася соль, то ён атрымоўваў назву пірага і выкарыстоўваўся ў дарозе або для паднясення ў якасці дарунка для ганаровых гасцей.

2. «Градовый» — хлеб з жыта, якое не асабліва старанна правейвалася на таку і куды трапляла пілюха. Нагадаю, што частку пілюхі складае абалонка, якая змяшчае зерне ў коласе, і яна валодае выключнымі спажыўнымі і лекавымі якасцямі. Нашы продкі гэта добра разумелі і лічылі, што менавіта ў такім хлебе ёсць «по́сілак». Цікава, што нават шляхетныя паненкі любілі паласавацца мужыцкім хлебам і выменьвалі яго ў сялян на панскія булкі або пернікі.

3. «Пушнэ́й» хлеб, або святая «пушнінка», як з гумарам называлі яго сяляне, гатаваўся з неправеянага жыта, куды дадаваліся мякіна і пілюха. Такому хлебу ніхто не зайздросціў, але яго ўжывальнікі не лічыліся беднякамі, бо яны ўсё-такі елі «аржаніну».

4. «Пыловэ́й» хлеб, ён жа «пыловушка». Гэты хлеб толькі напалову складаўся з жыта, а яго другая частка была з ячменю, аўсу, грэчкі і нават пшаніцы. Зрэдку дадавалася гарохавая або бабовая мука. Такі хлеб хутка прыядаўся, і яго ўжыванне сведчыла аб недародзе жыта. Вось што пісаў аб такім хлебе Адам Багдановіч: *«Такой хлеб был тяжелый, плотный, неудобоваримый, и если злоупотребляли подбавкой неумеренного количества мякины, то он царапал глотку, но был вкусен и отличался приятным запахом. Это особенно ценилось. Надо было иметь здоровое брюхо, чтобы безнаказанно справляться с таким хлебом».*

5. «Бульбянэ́й» хлеб напалову складаўся з жытняй мукі і напалову з мятай або надзёртай на тарцы пачышчанай сырой бульбы. Такі свежы хлеб меў прыемны смак, але хутка чарсцвеў, губляў смак і прыемны белы колер.

6. «Мякінны», або «мякінка» — апошні хлеб, да якога сям'ю даводзіла выключная галеча, беднасць і перыядычныя хлебныя недароды. Пра такі хлеб сяляне казалі так: «По ём кылі і черт пыбягіць, дык ногу зыскабіць!» Большую частку падобнага хлеба складала мякіна, а крышкі жыта дадавалася толькі для таго, каб яе склеіць. Ужываючым «мякінку» не зайздросцілі нават беднякі, а жаласлівыя людзі стараліся дапамагчы такой сям'і сапраўдным хлебам.

7. У «балезныя» (або галодныя) гады, на якія прыпадалі войны, эпідэміі, рэгулярныя хлебныя недароды, сяляне былі вымушаны ўжываць хлеб з лебяды, балотнага бабоўніку, драўляных гнілушак, дадаючы ў іх торф або гліну. Такімі адчайнымі гадамі пісьменнік называе 1812, 1831 і 1863. Не трэба быць вялікім знаўцам гісторыі, каб даведацца, пра якія падзеі ідзе гаворка. Прыгадаю, што і першыя гады Савецкай улады, і ў гады Вялікай Айчыннай вайны беларусы былі вымушаны зноў зведаць такога «хлеба».

Святы рытуал

Нікіфароўскі піша: *«Каков ни был бы по свойству муки предполагаемый хлеб — чистый, градо́вый, пушнэ́й, половэ́й, бульбянэ́й, мякинный — хлебная основа под именем «утво́ры» имеет преобладающее количество ржаной муки, именно потому, что она скорее дает правильную «ки́силь» тесту. Если квашня (драўляная дзежка, пажадана — дубовая. А. В.) исправна, пришлась по дому и по стряпухе, «утво́ра или учи́на» делается часов за 10—12 перед печеньем хлебов, что происходит после полудня, от 3—8 часов вечера. Некоторые причуды квашни требуют: а) чтобы она установлена была на одежную подстилку — шубу, армяк, балахон; б) чтобы слегка теплая вода пропускалась в нее чрез решето, а в крайнем случае — чрез ладонь и пальцы левой руки стряпухи; в) чтобы «учи́нныя» мука всыпалась руками стряпухи; г) чтобы «утво́ра» взбалтывалась специальною колотовкою, которая должна оставаться в ней и д) чтобы квашня была прикрыта опять же верхнею одеждою в таком расчете: если под квашней женская одежда, на квашне должна быть мужская и наоборот. Те же причуды квашни требуют, чтобы она занимала неизменное место от «утво́ры до заме́сы» и чтобы с нею во все время до выскреба теста ведалось одно лицо».*

Заўважце, што калі пад дзяжу падкладвалася жаночае адзенне, то накрывалася яна мужчынскім, або наадварот. Гэта звязана з тым, што сімволіка дзяжы расшыфроўваецца з улікам пазіцыі: мужчынскі — жаночы, а ў шматлікіх рытуалах дзяжа ўвасабляе жаночае чэрава, рост плоду ў якім атаясамліваўся з падыходам цеста.

Былі пэўныя патрабаванні і да жанчыны, якая гатавала хлеб. Аб іх узгадвае Адам Багдановіч на ўспамінах: *«Хлеб для белоруса — святыня. Его приготовление — истое священнодействие (я говорю о своем времени). Начать с того, что его приготовлять может только женщина «чистая», т. е. не во время «месячных» и не спавшая накануне с мужем. Иначе это значило бы хлеб поганить и оскорблять. Он будет коробиться, трескаться, и нет в нем надлежащего «по́сілку»... Руки обязательно мыть до локтей. Это ритуальное омовение. Дежу-хлебницу (кадку), раскрыв, прежде чем влить теплой воды для раствора (расчыны), непременно «жэгна́ючь» (крестят); сделав раствор, тоже «жэгна́ючь»; месят с молитвой и, замесив, не только «жэгна́ючь», но, погладив поверхность, пересекают глубоким крестом».*

Што ж адбывалася далей? Нікіфароўскі піша: *«К утру, часа за два до печенья хлебов «утво́ра» дает «расчи́ну» — вскисшее жидкое тесто. Тогда квашня с подстилкою и покрышкою перемещается на лавку, скамью или на специальный «криж»: тут совершается «заме́са» теста, т. е. сгущение его надбавочною мукой и ручным обстоятельным месивом. После этого тесто «подхо́диць», и квашня остается в покое до приготовления печи к посадке хлебов. Каждая местная «бу́лка» печется в 8—20 фунтов (1 фунт — прыкладна 409 г. А. В.), за исключением пресняков и «поскробыша», что зависит от семейных привычек; от тех же привычек зависит и форма «бу́лки» — совершенно круглая и овальная. Сноровка стряпухи позволяет ей брать для «булки» почти безошибочное количество теста, которое она перекинет над квашней несколько раз с руки на руку и опускает на лопату. Последняя обязательно имеет «подсыпку» или «подси́лку»: первою бывают различные отруби, даже мякина — овсяная, гречневая, а второю — широкие листья некоторых овощей, листья клена, аира. На лопате «бу́лка» получает надлежащую выправку в форме, причем поверхность ее выглаживается мокрыми руками той же стряпухи; в последнем виде «бу́лка» поступает в печь».*

Мужыцкі хлеб быў велічынёй з сапраўднае рэшата. Успомнім «Тараса на Парнасе»: «І як жарон, букатку хлеба, прынёсшы, — бразь сярод стала!» Такі вялікі бохан доўга не чарствеў, ды і чарствець яму ў шматлікай сялянскай сям'і звычайна не даводзілася.

Каб атрымаўся добры хлеб, печ выпальвалі бярозавымі дровамі, якія даюць моцны жар, а потым вуголле і попел старанна вымяталі памялом, бо бляшаных формаў тады яшчэ не існавала і хлеб пяклі на подзе печы. Печ закрывалі засланкай, і наступныя адна-дзве гадзіны былі для дзяцей самымі працяглымі, бо хлебны водар, напаўняючы рот слінай, прыемна казытаў ноздры, а дурэць не дазвалялася, каб хлеб не сапсаваўся. Для дзяцей звычайна выпякалі маленькі хлеб — «паскро́быш», а кавалачак цеста пакідалі ў дзяжы для ўтрымання «ки́сили». Гатоўнасць хлеба на Віцебшчыне правяралі, датыкаючыся носам да бохана: калі моцна пячэ — яшчэ сыры, калі цяпло прыемнае — гатовы! Потым верхнюю скарынку для мяккасці змочвалі вадой, а ніжнюю адчышчалі ад лісцяў або аеру. Стол засцілалі абрусам, клалі на яго хлеб, накрывалі абрусам і чакалі, пакуль ён не астыне. Хлеб спечаны, а значыць — жыццё працягваецца!

А ці можна зараз прыгатаваць сапраўды старажытны хлеб у хатніх умовах? Можна! Аб гэтым пойдзе размова ў наступных артыкулах.

Аляксандр ВАШЧАНКА.

«Звязда» пачынае новы праект, прысвечаны кулінарным традыцыям нашых продкаў. Вынікам праекта будзе выданне кнігі з аўтэнтычнымі рэцэптамі беларускіх страў і апісаннем традыцый харчавання. Вы, шаноўныя чытачы, можаце прыняць удзел у нашай задуме. Для гэтага дасылайце рэцэпты страў вашых бабуль і прабабуль на адрас рэдакцыі або e-mail, а таксама на e-mail аўтара (seem52@mail.ru). Толькі не трэба занатоўваць рэцэпты з сучасных друкаваных выданняў: нам патрэбна аўтэнтыка! Лепшыя з вашых сямейных запісаў з указаннем прозвішчаў даслаўшых будуць надрукаваны ў кнізе.

■ Экслібрыс «Звязды»

ФРАКТАЛЬНАЯ ПАЭЗІЯ

Рагнед Малахоўскі
«У дзённай мітусні».
Адам Шостак
«4.33».
Дар'я Лёсава
«Туга зямная».
Надзея Філон
«Кроплі святла».
Вершы.
«Харвест», 2012.

У прыродазнаўчых навуках ёсць паняцце пра «фракталы». Гэта аб'екты, часткі якіх падобны да ўсяго аб'екта цалкам. У навукоўцаў фракталы выклікаюць прафесійнае замілаванне: прырода паўтарае саму сябе ў дробязях і дэталях; у камп'ютарнай графіцы фракталы цэняць за тое, што яны вельмі лёгка ствараюцца праз шматкротны паўтор. Але што рабіць з фракталамі ў паэзіі?

Кнігі чатырох аўтараў, амаль равеснікаў, двух хлопцаў і дзвюх дзяўчат, раптам выявіліся ўвасабленнем фрактальнасці: амаль кожны верш ёсць квінтэсенцыяй кнігі цалкам. Гэта можна было б спісаць на канцэптуальнасць, калі б не ўбачылася тут нагода для эканоміі чытацкіх высілкаў: дастаткова прачытаць адзін верш, каб мець уяўленне пра кнігу. Тады навошта кніга?

А кніга насамрэч вельмі патрэбна. Кніга для паэта з'яўляецца своеасаблівым падсумаваннем, без якога творчае развіццё аўтара запавольваецца ці нават спыняецца. Эвалюцыя пісьменнікаў немажлівая без гэтых своечасовых спыненняў, асэнсаванняў, магчымасці зірнуць збоку. Зваротная сувязь ад крытыкаў і чытачоў — нагода прыслухацца да сябе і вырашыць — нават адчуць — куды рухацца далей.

Магчыма, ад маладых пісьменнікаў не чакаюць абавязковых эстэтычных адкрыццяў ці трывала сфарміраванага стылю і погляду на свет, але новая кніга — гэта заўсёды нагода для знаёмства (ці працягу знаёмства, як у выпадку з Р. Малахоўскім і А. Шостакам, кожны з якіх цяпер мае па дзве кнігі). Аўтар адкрывае сваю душу чужым людзям. Гучыць досыць банальна, але колькі тут рызыкоўных момантаў: а раптам не захочуць глядзець? А раптам пасмяюцца? А раптам вырашаць, што не было чаго паказваць?

Высвятляецца, што «распрануцца перад публікай» не кожны можа і не кожны ўмее. Бо раптоўна выспельваецца незразумелае жаданне «апраўдаць давер» — і замест сутарэнняў і лабірынтаў пісьменніцкай душы чытач бачыць стараннае дэфіле ў фраках і ўрачыстых строях лірычных герояў, зашпіленых на ўсе гузікі (як у Рагнеда Малахоўскага), герояў-хіпстараў (як у Адама Шостака), і лірычных гераінь, экзальтаваных любоўю (да народа — у Дар'і Лёсавай і да Бога — у Надзеі Філон).

Па-чалавечы гэта можна зразумець: самалюбства і славалюбства творчых асоб традыцыйна не мае межаў. І тыя творчыя стратэгіі, якія выбіраюцца маладымі аўтарамі, звычайна сведчаць пра стэрэатыпы наконт таго, што ў адпаведным культурным асяродку цэніцца, ухваляецца, з'яўляецца шляхам да поспеху. Паспрабую скарыстацца нагодай, каб абмеркаваць гэтыя стэрэатыпы і міфы.

Паэзія мусіць быць філасофскай, інтэлектуальнай. З аднаго боку, так нібыта і ёсць, попыт на разумовае ў пачатку XXI ст. павысіўся, але з іншага боку, назіраць за тым, як малады лірычны герой натужліва ўзіраецца ў свет і нараджае мудрасць, нібыта пад прымусам, — сумніўнае інтэлектуальнае задавальненне. Марнымі выглядаюць прэтэнзіі на мудрасць. А вось досвед, адпаведны ўзросту аўтара, фіксуецца ў вершах лепей:

у дзённай мітусні
спазніўся на спатканне
са мной
на лавачцы
адпачывае ліст

(Рагнед Малахоўскі)

Паэзія мусіць быць канцэптуальнай. Сёння выдаецца мала кніг з прадуманай канцэпцыяй. Верагодна, аўтары ці не рэфлексуюць наогул над сваімі творамі, ці робяць гэта па выданні кнігі. Адам Шостак нібыта адчуў, што яго расхрыстанаму, нелагічнаму і непаслядоўнаму лірычнаму герою патрабуюцца разумовыя межы ў выглядзе канцэпцыі (хіба што «публічная бязгучная адзінота» — спрэчны выбар). Праўда, варта пазначыць, што лірычны герой не мусіць быць лагічным, але герой А. Шостака ў сваім суме, чаканні ці назіранні не дагаворвае свае адчуванні і думкі не для таго, каб чытач перажыў эмпатыю і дадумаў сам, а таму, што адчуванне ці думка ў героя не сфарміраваліся дарэшты, абарваліся.

За акном
толькі дождж,
але смак усіх рэкламных бігбордаў
не разбудзіць да ранку
разам з кавай астылай

(Адам Шостак)

Паэт мусіць думаць пра Радзіму. Я зараз дазволю сабе цынічную фразу: паэт можа думаць пра Радзіму, калі гэтая думка можа Радзіме дапамагчы. Янка Купала, чые вершы спрычыніліся да працэсаў нацыятварэння і паўплывалі на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, меў права на развагі пра «спадчыну». Але цяпер, калі мы, беларусы, ёсць, рафаснае абвяшчэнне сваёй прыналежнасці да народа выглядае банальнасцю. Шчырую любоў да Радзімы варта вітаць, але ў стылі «нашаніўскага перыяду» яна сведчыць хутчэй пра несучаснасць аўтара, які не адчувае, не разумее, якімі праблемамі жыве яго народ. Такі аўтар нібыта ўцякае ад людзей, і тады лірычны герой (дакладней, гераіня), упэўненая ва ўласнай унікальнасці, выглядае шараговай.

Не баюся нічога болей,
Больш няма ўжо такіх перашкод,
Якіх гонар мой не адолеў.
Я — дачка твая,
Мой народ!

(Дар'я Лёсава)

Вершы-прысвячэнні не вельмі ўдала атрымліваюцца нават у сталых паэтаў: то зрываюцца ў нецікавае чытачу панібратства, то ў непрымальны гумар, то ў такі ж непрымальны пафас. І маладыя аўтары, гледзячы на сваіх куміраў знізу ўверх, часта не могуць пераадолець уласнае захапленне.

Сяргею Грахоўскаму
Я жаўрай ціўкнула ля броў,
Сінічкай — каля сэрца.
І Ён ажыў! Нібы любоў,
Што не баіцца смерці!

(Дар'я Лёсава)

Таму, мяркую, варта ўвесці дзесяцігадовы мараторый на вершы-прысвячэнні слынным сынам і дочкам Беларусі.

Паэт мусіць памятаць пра Бога. І не згадваць Яго імя марна. Можна зразумець, напрыклад, жаданне афарміць вершам сваю экзальтаваную веру, але такія вершы не маюць права на банальнасць. Кепскі верш пра Бога і веру дэвальвуе гэтую веру, гэтага Бога і гэтага паэта ў вачах чытачоў.

Калі ўзыходзіць сонца над зямлёй
І бачу ў небе светлае праменне,
Імкнуся да Цябе я, Божа мой,
Дзень новы сустракаю на каленях

(Надзея Філон)

Што рабіць далей маладым аўтарам? Не дбаць пра філасафічнасць і канцэптуальнасць, Радзіму і Бога? Вядома, не! Варта быць самім сабой, натуральным, у момант пісання твораў — і варта ўмець зірнуць на сваю кнігу крытычным, незамыленым вокам. Быць акуратнымі з «вечнымі тэмамі», пакуль не з'явіцца ўласны моцны голас. І пазбягаць фракталаў у паэзіі.

Аксана БЯЗЛЕПКІНА
■

** Кнігі прадастаўлены Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (г. Мінск, пр. Незалежнасці, 116).*

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА КАСТРЫЧНІК

2 кастрычніка, аўторак. Дзень не падыходзіць для стрыжкі і афарбоўвання валасоў.

3 кастрычніка, серада. Выдатны перыяд для афарбоўвання валасоў і хімічнай завіўкі. Стрыжка абяцае знаёмства ці ўмацаванне адносін з цікавым чалавекам.

4 кастрычніка, чацвер. Для павышэння сваёй энергіі жанчынам стрыжка і афарбоўванне валасоў спрыяльныя, а вось мужчынам лепш са стрыжкай пачакаць.

5 кастрычніка, пятніца. Неспрыяльны дзень, ад стрыжкі і афарбоўвання валасоў пажадана ўстрымацца.

6 кастрычніка, субота. Падыходзячы для стрыжкі час наступіць толькі ўвечары.

7 кастрычніка, нядзеля. Стрыжка ў гэты месяцовы дзень катэгарычна не рэкамендуецца. Аднак улічыце, што ён пачынаецца толькі ўвечары, раніцай вялікі ўплыў папярэдняга месяцовага дня, які спрыяе стрыжцы і афарбоўванню валасоў. Выбар застаецца за вамі.

8 кастрычніка, панядзелак. Устрымайцеся ад стрыжкі ў гэты дзень. Астролагі рэкамендуюць па максімуме абмежаваць водныя працэдуры (у тым ліку і мыццё валасоў) у перыяд, калі Месяц знаходзіцца ў водным знаку задыяка.

9 кастрычніка, аўторак. Устрымайцеся ад стрыжкі.

10 кастрычніка, серада. Сёння стрыжка супрацьпаказаная людзям з парушэннямі вочнага ціску.

11 кастрычніка, чацвер. Дзень можа прайсці напружана і эмацыянальна, аднак стрыгчы валасы можна і трэба.

12 кастрычніка, пятніца. Спрыяльны для стрыжкі і афарбоўвання валасоў дзень. Жыццёвы шлях будзе бяспечным і радасным.

13 кастрычніка, субота. Стрыжка ў гэты дзень можа справакаваць сварку.

14 кастрычніка, нядзеля. Сёння дзень не падыходзіць для стрыжкі, лепш адкладзіце візіт да цырульніка на іншы час.

15 кастрычніка, панядзелак. Стрыгчы валасы ў перыяд нараджэння новага Месяца не рэкамендуецца.

16 кастрычніка, аўторак. Непажадана мачыць валасы ў вадзе. Адкладзіце візіт да цырульніка на іншы дзень.

17 кастрычніка, серада. Неспрыяльны для стрыжкі і афарбоўвання дзень.

18 кастрычніка, чацвер. Дзень падыходзіць для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Стрыжка здольная ўмацаваць ваша здароўе. Пасля афарбоўвання валасоў у гэты перыяд будзе даўжэй трымацца колер.

19 кастрычніка, пятніца. Спрыяльны дзень. Калі пастрыгчы сёння валасы, яны стануць хутчэй расці. Таксама яны добра ўбіраюць усё, што наносіцца на іх — няхай гэта будзе маска, фарба ці раствор для завіўкі.

20 кастрычніка, субота. Стрыжка ў гэты дзень аказвае дабратворны ўплыў на ўвесь арганізм і станоўча ўплывае на прывабнасць. Стрыжка трымае форму даўжэй, валасы адрастаюць не так хутка.

21 кастрычніка, нядзеля. Дзень падыдзе для афарбоўвання валасоў. А вось стрыгчыся сёння не рэкамендуецца.

22 кастрычніка, панядзелак. Добры дзень для таго, каб схадзіць у салон — стрыжка павінна атрымацца ўдала, а валасы будуць выглядаць вельмі дагледжанымі. Папесціце свае валасы маскай, якая ўвільгатняе ці сілкуе, эфект будзе ўзрушальны.

23 кастрычніка, аўторак. Цяжкі па сваёй энергетыцы дзень. Не плануйце на сёння ніякіх маніпуляцый з валасамі.

24 кастрычніка, серада. Добры час для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Новая стрыжка ў гэты дзень здольна павялічыць вашу ўнутраную сілу. Але ёсць рызыка алергічных рэакцый.

25 кастрычніка, чацвер. Калі падстрыгчы сёння валасы, то ваш уплыў на людзей павялічыцца. Будзьце акуратныя з незнаёмай касметыкай, калі вы схільныя да алергіі.

26 кастрычніка, пятніца. Стрыгчы валасы не рэкамендуецца.

27 кастрычніка, субота. Удалы час для стрыжкі.

28 кастрычніка, нядзеля. Цяпер значна лепш пазбаўляцца ад непажаданых валасоў, таму што яны будуць расці слабымі і кволымі.

29 кастрычніка, панядзелак. Стрыжка можа атрымацца вельмі добра, а з адстрыжанымі кончыкамі вы можаце адстрыгчы і вашы бягучыя клопаты.

30 кастрычніка, аўторак. Стрыгчы і афарбоўваць валасы сёння шкодна і неспрыяльна для вашага самаадчування.

31 кастрычніка, серада. Адкладзіце візіт да стыліста на іншы час. Сёння стрыгчы валасы не рэкамендуецца.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ДВАДЦАТЬ ПЯТОГО ВЫПУСКА ПРОЕКТНОГО ЧАСТНОГО УНИТАРНОГО ПРЕДПРИЯТИЯ «ДАМААН»

ПРАЕКТНАГА ПРЫВАТНАГА ЎНІТАРНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА «ДАМААН»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)
на русском языке: Проектное частное унитарное предприятие «ДАМААН» (далее по тексту Эмитент).
на белорусском языке: Праектнае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «ДАМААН»
Сокращенное наименование эмитента:
на русском языке: УП «ДАМААН»
на белорусском языке: УП «ДАМААН»

2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр. Победителей, д. 73/1, к. 5, тел./ф. 233-33-33, e-mail: a-100@a-100.by.

3. Основным видом деятельности Эмитента является: операции с собственным недвижимым имуществом.

4. Номер расчетного счета Эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, наименование обслуживающего банка:
Денежные средства при проведении открытой продажи жилищных облигаций эмитента (далее по тексту – облигации) будут поступать на счет эмитента № 3012001233010, открытый в ОАО «БПС-Сбербанк», код банка 369.

5. Депозитарное обслуживание Эмитента осуществляет ОАО «Технобанк». Место нахождения депозитария: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44. Депозитарий зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь решением № 47 от 05.08.1994 года, имеет лицензию № 02200/0385568 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданную Министерством финансов Республики Беларусь, действительную до 22 июня 2014 года.

6. Размер уставного фонда Эмитента составляет 2 400 000 (два миллиона четыреста тысяч) белорусских рублей.

7. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность Эмитента – «Экономическая газета».

8. Решение о двадцать пятом выпуске облигаций принято Учредителем Эмитента 7 сентября 2012 года.

9. Облигации являются именными, выпускаются в бездокументарной форме в виде записей на счетах.
Общий объем эмиссии облигаций Эмитента в денежном эквиваленте составляет 20 300 000 000 (двадцать миллиардов триста миллионов) белорусских рублей.
Количество выпускаемых облигаций – 5 075 (пять тысяч семьдесят пять) штук.

10. Номинальная стоимость одной облигации 4 000 000 (четыре миллиона) белорусских рублей и имеет эквивалент номинальной стоимости равный одному квадратному метру в квартире в строящемся многоквартирном 10-этажном крупнопанельном жилом доме серии М 464-10-У1 по генплану № 21 в агрогородке Лесной Минского района.

11. Выпуск облигаций осуществляется в целях обеспечения привлечения денежных средств юридических, физических лиц, индивидуальных предпринимателей для осуществления строительства многоквартирного 10-этажного крупнопанельного жилого дома серии М 464-10-У1 по генплану № 21 в агрогородке Лесной Минского района, а также для строительства других объектов недвижимости.

Средства, полученные от размещения облигаций, будут направлены в первую очередь на строительство жилого дома серии М 464-10-У1 по генплану № 21 в агрогородке Лесной Минского района, во вторую очередь на финансирование строительства других объектов недвижимости в Минске и в Минском районе.

12. Информация об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.
Исполнение обязательств Эмитента по облигациям обеспечивается поручительством юридического лица – ООО «МариНад», предоставленным согласно Договору о предоставлении поручительства от 07.09.2012 № 07/09 (далее – Договор поручительства), соответствующим решению о выпуске облигаций Эмитента двадцать пятого выпуска и настоящему проспекту эмиссии, а также действующей типовой форме договора о предоставлении поручительства, утвержденной Советом Министров Республики Беларусь.

13. Период проведения открытой продажи облигаций
Датой начала открытой продажи облигаций является 2 октября 2012 года.
Датой окончания открытой продажи является дата продажи последней облигации, но не позднее 28 июня 2013 года.

14. Открытую продажу облигаций осуществляет Эмитент ежедневно (кроме субботы и воскресенья) с 09.00 до 18.00 по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, агрогородок Лесной, ул. Александрова Н.Н., д. 1, помещение товарищества собственников «Квартал Зеленый бор».

15. Срок обращения облигаций – 271 календарный день – с 2 октября 2012 года по 30 июня 2013 года.

16. Дата начала погашение выпуска облигаций серии ОД-25 – 30 июня 2013 года.
Дата формирования реестра владельцев облигаций для погашения: 30.06.2013 года.

17. Досрочное погашение облигаций начинается после ввода жилого дома в эксплуатацию и технической инвентаризации и государственной регистрации жилого дома в уполномоченном органе.
Владелец пакета жилищных облигаций, общий эквивалент номинальной стоимости которых равен 100% (сто процентов) целых квадратных метров общей площади квартиры (без учета дробных значений), расположенной в многоквартирном 10-этажном крупнопанельном жилом доме серии М 464-10-У1 по генплану № 21 в агрогородке Лесной Минского района, имеет право на досрочное погашение облигаций и приобретение при этом жилого помещения.
Досрочное погашение облигаций возможно при принятии Эмитентом решения о досрочном погашении облигаций двадцать пятого выпуска (части выпуска облигаций), а также в случае, если стоимость чистых активов Поручителя станет меньше объема находящихся в обращении облигаций Эмитента двадцать пятого выпуска.
Досрочное погашение облигаций осуществляется на основании письменного заявления владельца облигаций с приложением выписки со счета «депо», подтверждающей наличие требуемого количества облигаций и возможность их отчуждения (отсутствие ограничений, связанных с обременением облигаций иными обязательствами).
Досрочное погашение облигаций оформляется актом приемки-передачи жилого помещения либо актом исполнения обязательств по выплате денежных средств владельцу облигаций и переводу ценных бумаг на счет «депо» Эмитента.
Владелец облигаций в течение срока обращения облигаций вправе требовать досрочно погасить облигации по номинальной стоимости. О своем намерении получить при досрочном погашении облигаций денежные средства в размере их номинальной стоимости владелец облигаций обязан уведомить Эмитента не менее чем за тридцать дней до даты досрочного погашения облигаций.
Дата, на которую формируется реестр владельцев облигаций, при досрочном погашении облигаций определяется как дата технической инвентаризации и государственной регистрации жилого дома в уполномоченном органе либо датой принятия Эмитентом решения о досрочном погашении облигаций.
При досрочном погашении облигаций не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления на счет владельца облигаций (выплаты владельцу облигаций) денежных средств, необходимых для погашения облигаций, либо передачи жилого помещения, владелец облигаций обязан осуществить перевод погашаемых облигаций на счет «депо» Эмитента, открытый в депозитарии ОАО «Технобанк».

18. При погашении владелец облигаций вправе получить денежные средства в размере их номинальной стоимости или приобрести жилое помещение.
Правом на приобретение жилья при погашении облигаций обладают владельцы облигаций серии ОД-25, общий эквивалент номинальной стоимости которых равен общей площади квартиры (за исключением дробных значений), расположенной в квартире в многоквартирном 10-этажном крупнопанельном жилом доме серии М 464-10-У1 по генплану № 21 в агрогородке Лесной Минского района.
О своем намерении получить при погашении облигаций денежные средства в размере их номинальной стоимости или приобрести жилое помещение владелец облигаций обязан уведомить Эмитента не менее чем за тридцать дней до даты начала погашения облигаций.

19. При погашении (досрочном погашении) облигаций не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления на счет владельца облигаций (выплаты владельцу облигаций) денежных средств, необходимых для погашения облигаций, либо передачи жилого помещения, владелец облигаций обязан осуществить перевод погашаемых бездокументарных облигаций на счет «депо» Эмитента.

20. При запрещении выпуска облигаций Эмитент обязан в месячный срок с момента получения от Департамента по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь уведомления о запрещении выпуска ценных бумаг возвратить владельцам облигаций средства, полученные в оплату размещенных ценных бумаг, и письменно уведомить регистрирующий орган о возврате указанных средств владельцам облигаций в полном объеме.

21. Дата и номер регистрации облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь: 5-200-02-1655 от 27.09.2012.

22. С более подробной информацией, в частности с Проспектом эмиссии двадцать пятого выпуска жилищных облигаций УП «Дамаан», можно ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) с 09.00 до 18.00 по адресу: Минская область, Минский район, агрогородок Лесной, ул. Александрова Н.Н., д. 1, помещение товарищества собственников «Квартал Зеленый бор».

Директор Татьяна Анатольевна Жук

Главный бухгалтер Любовь Львовна Смусина

УНП 600394168

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА.

Продавец — Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области

Лот	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1	Земельный участок в агрогородке Раков, улица Набережная, № 28 площадью 0,1500 гектара	Кадастровый номер участка 622085715642000022. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется возможность подключения электричества, водопровода и природного газа.	42 000 000	4 200 000
2	Земельный участок в деревне Бузуны, ул. Лесная площадью 0,1500 гектара	Кадастровый номер участка 622085702101000267. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется возможность подключения электричества и водопровода. Расстояние от аг. Раков – 3 километра.	15 000 000	1 500 000
3	Земельный участок в деревне Михалово площадью 0,1500 гектара	Кадастровый номер участка 622085711601000239. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Новый район застройки. Удалённость от аг. Раков – 5 километров.	12 000 000	1 200 000
4	Земельный участок в деревне Лесковка, 20 площадью 0,1500 гектара	Кадастровый номер участка 622085709601000023. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются подъездные пути, электричество. Удалённость от аг. Раков – 8 километров.	12 000 000	1 200 000

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **02 ноября 2012 года (пятница) в 10.00** по адресу: агрогородок Раков, площадь Свободы, 11, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 29 октября 2012 года (включительно) до 17.00** по адресу: аг. Раков, пл. Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактные телефоны: (8 01772) 30 305; 8029 1405437.

ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

29 ноября 2012 г. проводит открытый аукцион с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Площадь, га	Целевое назначение	Качество земли	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, инженерно-технических условий	Объекты недвижимости, подлежащие сносу	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков, и сносом расположенных на них объектов, возмещаемых победителем аукциона, землепользователям, бел. руб.	Срок аренды (лет)	Затраты на подготовку документации, бел. рублей	Начальная стоимость, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	пер. Строителей, 3а	0,1466	строительство крытой выставочной площадки мототехники (объекта иного назначения)	к землям сельскохозяйственного назначения не относятся	Победителю аукциона либо единственному участнику аукциона: получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание, подготовить проектную документацию на строительство объекта с учетом ее государственной экспертизы и предоставить в республиканское дочернее унитарное предприятие «Проектный институт «Гомельгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утвержденной части строительного проекта, в течение года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка	металлические склады (5 объектов)	632 800 000	50	3 115 274	282 360 753	28 236 000
2	ул. Юбилейная, 9а	0,0618	строительство объекта культурно-просветительского и зрелищного назначения, физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения или здания специализированного для бытового обслуживания населения		Победителю аукциона либо единственному участнику аукциона: расположить объект с учетом линии застройки ул. Юбилейной; проектом благоустройства предусмотреть строительство фонтана. Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, водоснабжения. Подъезд к участку осуществляется по существующей дорожной сети (ул. Юбилейная). Объект должен располагаться с учетом линии застройки ул. Юбилейной, а также проектом должно быть предусмотрено строительство фонтана.	капитальное строение с инв. № 350/С-89938	323 399 000	20	1 367 563	66 621 520	6 662 000
3	ул. Советская, в районе жилых домов №163А и № 167А	0,7418	строительство бизнес-центра		Победителю аукциона либо единственному участнику аукциона: осуществить проектирование и строительство здания не менее 7 этажей с использованием современных строительных материалов; обеспечить строительство парковочных мест согласно действующим градостроительным нормам; объемы благоустройства прилегающей территории согласовать с администрацией Железнодорожного района г. Гомеля. Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Участок имеет ограничения в использовании: охранная зона ливневой канализации, подземной кабельной линии связи, водопровода, подземной кабельной линии электропередачи. Подъезд к участку осуществляется по существующей дорожной сети (ул. Советская).	капитальное строение с инв. № 350/С-80025 по ул. Советская, 163А; капитальное строение с инв. № 300/С-2766 по ул. Советская, 165А; капитальное строение с инв.№ 300/С-1806 по ул. Советская, 167А; зеленые насаждения, г. Гомель, ул. Советская, 163А; зеленые насаждения, г. Гомель, ул. Советская, 165А; зеленые насаждения, г. Гомель, ул. Советская, 167А.	302 140 000	50	5 555 303	481 769 526	48 176 000
4	в районе проспекта Октября– ул. Карбышева	0,7678	многофункциональный торгово-развлекательный комплекс с объектами культурно-просветительского и зрелищного назначения, общественного питания и физкультурно-оздоровительного назначения (объекта розничной торговли, культурно-просветительного и зрелищного назначения, общественного питания, физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения)		Получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание, подготовить ПСД на строительство объекта с учетом ее государственной экспертизы и предоставить в республиканское дочернее унитарное предприятие «Проектный институт «Гомельгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утвержденной части строительного проекта, в течение года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка. Ограничения в использовании: водоохранная зона р. Сож, охранная зона кабеля связи – 0,1058 га, охранная зона электрокабеля и теплотрассы – 0,0073 га, охранная зона водопровода и канализации – 0,0152 га.	здание административно-хозяйственное с инв. № 350/С-103879, по ул. Карбышева, 5 здание одноэтажного каркасно-засыпного облицованного кирпичом жилого дома с инв. № 350/С-75729 по ул. Карбышева, 1 и многолетние зеленые насаждения капитальное строение по ул. Карбышева, 9 изолированное помещение № 300/D-004724, по ул. Карбышева, 9 изолированное помещение по ул. Карбышева, 9 с инв. №300/D-004727 изолированное помещение по ул. Карбышева, 9 с инв. № 300/D- 004726	576 393 907	99	8 797 290	2 187 542 820	218 754 280
5	ул. Севастопольская	0,6486	строительство здания специализированного розничной торговли (объекта розничной торговли)		Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание, подготовить ПСД на строительство объекта с учетом ее государственной экспертизы и предоставить в республиканское дочернее унитарное предприятие «Проектный институт «Гомельгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации - архитектурного проекта или утвержденной части строительного проекта, в течение года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка. Ограничения в использовании с связи с расположением в водоохранной зоне оз. Шапор, площадью 1,1777 га – охранная зона кабеля связи и канализации, площадью 0,2921 га – охранная зона водопровода, 0,4733 га – охранная зона электрокабеля, площадью 0,4803 га – охранная зона теплотрассы и газопровода. Условия: расселение жилых домов, вынос инженерных сетей, организация парковочных мест.	жилые дома по ул. Севастопольской №№ 56, 58, 60, 62, 62-а	2 440 692 210	50	11 729 430	1 655 704 370	165 570 436
6	пересечение ул. Б.Хмельницкого и ул. Быховской	1,3837	многофункциональный торговый комплекс с предприятиями общепита с организацией парковочных мест для автомобилей (объекта неустановленного назначения)		Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание, подготовить ПСД на строительство объекта с учетом ее государственной экспертизы и предоставить в республиканское дочернее унитарное предприятие «Проектный институт «Гомельгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утвержденной части строительного проекта, в течение года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка. Ограничения в использовании: охранная зона электрокабеля, водопровода и канализации – 0,1075 га, охранная зона электрокабеля – 0,0165 га, охранная зона теплотрассы – 0,0225 га.	Капитальное строение по ул. Б.Хмельницкого, 78А; автомобильная стоянка со зданием проходной по ул. Б. Хмельницкого, 76А	1 477 380 000	50	6 246 968	3 487 456 430	348 745 640

1.Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2.Объект выставляется на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту в натуре, с проектом договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

3. Аукцион состоится 29 ноября 2012 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляются:

4.1 юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

4.2 иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

4.3 представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

4.4 при подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

5. Победитель обязан:

5.1 кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходов, связанных с изготовлением участникам документации, необходимой для его проведения, выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии и предоставлении земельного участка, которые подлежат выполнению до обращения государственной регистрации в отношении земельного участка.

5.2. Победитель аукциона обязан подписать договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) не позднее 2 рабочих дней после совершения действий, указанных в п. 5.1.

6. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням с 9-00 до 17-00 по 23 ноября 2012 г. включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21, каб. № 4. Заключительная регистрация участников аукциона с 14-00 до 14-40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

Лоты 2-4 выставляются на аукцион повторно. Извещения опубликованы в газете «Звязда» от 12.05.2012 г.

Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www.gorod.gomel.by.

■ Прамоўленае

«ДЗІВА, КАЛІ СПАРТСМЕН КІРУЕ ТРЭНЕРАМІ»

Фота Надзеі БУКАН.

Здавалася б, апошнія акорды брытанскіх музыкантаў на заканчэнні сёлетняй Алімпіяды прагучалі яшчэ ў жніўні, але галоўныя старты чатырохгоддзя яшчэ гучаць у галовах, трымаюць, прымушаюць думаць, разважаць, аналізаваць. І гэта не танцавальныя, святочныя матывы, а крыху сумнае адажыа. Узгадваецца не хуткі, як гепард, бліскучы, нібы дзяўчына з глянца, ямайскі бягун Усэйн Болт. Узгадваецца допінгавы скандал Надзеі Астапчук, нечаканая асечка цяжкаатлеткі Настассі Новікавай і правал зборнай па лёгкай атлетыцы. Зразумела, агулам каманда назбірала не самы благі 12-медальны ўраджай, але сапраўды магло быць і лепш... Напэўна, глыбей за ўсіх нас гэта разумее Аляксандр Рудскіх. Заслужаны трэнер СССР, былы галоўны «коўч» зборнай Беларусі па лёгкай атлетыцы, ён блізка ўспрыняў лонданскія няўдачы суайчыннікаў. Мой старэйшы калега нават раіў, каб не турбаваў спецыяліста. Маўляў, ён усё, што мог, ужо сказаў. Але Аляксандр Рыгоравіч пайшоў насустрач карэспандэнту «Звязды» і шчыра распавёў пра тое, што хвалюе ў сённяшняй айчыннай лёгкай атлетыцы і спорце наогул.

— Няўдача, якую пацярпелі ў Лондане нашы лёгкаатлеты, мяне, безумоўна, гняце, — з жалем кажа суразмоўца. — Я не чакаў падобных вынікаў. У горшым выпадку разлічваў, што яны завалююць 3 медалі. Думаў і пра 5 узнагарод. Але ў складзе, які быў прадстаўлены ў Лондане, было шмат турыстаў. І многім спартсменам з той лёгкаатлетычнай дружыны там было няма чаго рабіць.

❑ ❑ ❑

— 7 гадоў, як змянілася кіраўніцтва зборнай. За гэты час эксплуатаваўся той матэрыял, які раней быў уведзены ў каманду. На мой погляд, на працягу гэтых 7 гадоў няшмат увагі надавалася падрыхтоўцы рэзерву. Было кола элітных спартсменаў, якія прыносілі медалі. І ўсе гэтым былі задаволены. Аднак патрэбнага попыту з тых людзей, хто павінен быў забяспечыць падрыхтоўку рэзерву, не было. І гэта пры тым, што дзяржава ўкладвала і ўкладвае вялікія грошы. Праўда, на жаль, сёння шмат грошай не толькі ў лёгкай атлетыцы, але і ў іншых відах спорту проста закопваюцца ў пясок, не могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі спартсменаў.

❑ ❑ ❑

— Метадычныя хібы — гэта асноўныя моманты фіяска нашых лёгкаатлетаў на Алімпійскіх гульнях. На спартсмена працуюць адмысловыя тэхналогіі. І калі тэхналогіі недасканалыя — гэта непатрэбны кірунак, які вядзе не да поспеху, а да вынікаў, якія мы атрымалі на Гульнях. А яны смешныя: 50 спартсменаў атрымалі ў суме 7 балаў. Гэта нонсэнс! Падобнага дасягнуць мусіць адзін спартсмен, а тут 50 чалавек... Я падобнага не разумею.

❑ ❑ ❑

— Сёлета ў Беларусі галоўным было заваяванне алімпійскіх ліцэнзій. А што гэта такое? Ліцэнзія дае права ўдзельнічаць на Алімпіядзе. Аднак і гэтая задача, як і медальны план, таксама была не выканана. Чатыры гады таму алімпійскіх ліцэнзій у нас было значна больш. І мне здаецца, што празмерная ўвага спартыўных чыноўнікаў да заваявання ліцэнзій крыху падтупіла адказнасць саміх спартсменаў да іх выступлення ў Лондане. Для іх самым галоўным было трапіць на Алімпіяду.

❑ ❑ ❑

— Сёння аднаго вопыту і інтуіцыі трэнера ўжо недастаткова, каб падрыхтаваць спартсмена медальнага ўзроўню. Трэнер павінен атрымліваць пэўныя параметры навукова-медыцынскага характару, якія павінны пацвярджаць, што мы ствараем чэмпіёнаў. Інфармацыю, якая паказвае развіццё спартсмена, а не абстракцыю.

❑ ❑ ❑

— Калі ты не штурхаеш ядро за 20 метраў, не трэба выхваляцца, што заваюеш медаль. Павел Лыжын штурхнуў яго на 20,60 метра і заняў 8 месца. Гэта тычыцца і дзяўчат. І калі прааналізаваць вынікі Наталлі Міхневіч, дык яна і летась, і зараз накіроўвала ядро на 19 метраў. Меркаваў, што яе ўсплёск адбудзецца на Алімпіядзе. Не атрымалася. У Андрэя Міхневіча здарылася бяда з трэнерам. Ён доўга працаваў з Уладзімірам Сіўцовым, але той перанёс цяжкую аперацыю і ў Лондан не паехаў. Магчыма, гэта і паўплывала на дрэннае выступленне Міхневіча ў Лондане, але яго вынік не ўкладваецца ў галаве. І ён насамрэч не адлюстроўвае тых кандыцый, якія мае Андрэй.

❑ ❑ ❑

— Я лічу, што толькі дзве дысцыпліны на Алімпіядзе выканалі свае прагнозныя паказчыкі. Гэта мастацкая гімнастыка і веславанне на байдарках і каноэ. Астатнія праваліліся. Так, вы можаце ўзгадаць тэніс. Аднак у тэніснай камандзе сабралі Вікторыю Азаранку і Максіма Мірнага, двух вялікіх тэнісістаў, якія выхоўваліся на тэхналогіях Іспаніі і ЗША. І не выкарыстаць патэнцыял гэтых спартсменаў было б мяжой невуцтва і поўнага абсурду.

❑ ❑ ❑

— Мне здаецца, што, нягледзячы на два бронзавыя медалі, цяжкая атлетыка не выканала свае абавязкі. Бо ў асноўным мы разлічвалі не на Ірыну Кулешу і Марыну Шкерманкову, а на тых, хто «праваліўся». І сітуацыя з Андрэем Арамнавым — гэта дзіва! Тым больш калі спартсмен кіруе міністрамі і трэнерамі. І для чаго? А для таго, каб жыць цудоўна і нябедна, атрымліваць прэзідэнцкую стыпендыю. Але, калі яго пазбавілі стыпендыі, ён ледзь не стаў самым бедным чалавекам у краіне. Прычым не ўсе памятаюць, што ён яшчэ без падаткаў атрымаў грошы за перамогу на Алімпіядзе, трохпакаёўку. І як хапае сумлення чалавеку заяўляць, што яму няма за што паесці. Ён проста ўсіх замучыў. Гэта проста некультурны чалавек, які падвёў нашу краіну.

❑ ❑ ❑

— Заўжды неабходна сумнявацца. І трэнеру, і атлету. Чагосьці баяцца. Тады будзе мабілізацыя на правільную працу. А калі «мы ўсё ведаем, можам», як былы трэнер зборнай Анатоль Бадуеў, які абяцаў 7-9 медалёў, а ў выніку — нуль, дык гэта проста зневажальна для спецыяліста.

❑ ❑ ❑

— Усе нашыя лідары лёгкаатлетычнай зборнай — узроставыя спартсмены. І да Гульняў у Рыа-дэ-Жанейра могуць не дацягнуць. Аднак я не бачу ім замены. І за 4 гады яна не з'явіцца. Я не бачу замены кідальніку молата Івану Ціхану. Калі б дапусцілі Ціхана да спаборніцтваў, напэўна, ён заваяваў бы залаты медаль. І калі разглядалі допінгавую пробу Ціхана, павінны былі прагледзець 4 тысячы іншых проб, якія назбіралі ў Афінах. Аднак праверылі выбарачна толькі Ціхана. Але чаму? Так быць не павінна.

❑ ❑ ❑

— У допінгавых пытаннях спартсмен перш-наперш павінен спадзявацца на сябе, бо правілы няўмольныя. Я ўзгадваю штурхальніцу ядра Яніну Карольчык, якую дыскваліфікавалі за ўжыванне кленбутэролу на 2 гады. Па правілах, кантэйнеры, у якія разліваюць мачу, павінны быць апламбаваныя. А Карольчык паставілі адкрыты кантэйнер. Яна ўсё выканала і шчаслівая сышла, а калі знайшлі прэпарат, тады ўжо і загаласілі. Ведаеце, дастаткова толькі спаласнуць кантэйнер і пакінуць без змесціва, каб там захавалася рэчыва. Таму адказнасць у спартсменаў у гэтым пытанні каласальная.

Калі правільна падысці да медалеёмістых відаў, эфектыўна выкарыстоўваць фінансаванне, Беларусь можа дасягнуць сапраўды многага, бо інфраструктура і ўмовы для гэтага створаны.

❑ ❑ ❑

— У нацыянальнай зборнай па лёгкай атлетыцы трэба замяніць галоўнага і палову старэйшых трэнераў. Яе павінен узначаліць чалавек, які разумее сучаснае развіццё лёгкай атлетыкі, можа стварыць добры мікраклімат і атмасферу адной сям'і. Патрэбна, каб ён быў прынцыповым, строгім. Каб бачыў, што, калі спартсмен едзе за мяжу і дэманструе вынік, які дасягнуў яшчэ дома, але зараз не трапіў нават у дваццатку, шлях адзіны: не спартсмен вінаваты, а ўсе мы разам. Бо не навучыліся працаваць на тым узроўні, які павінен забяспечыць нам завяванне медалёў.

❑ ❑ ❑

— У нас трэнерскі корпус пастарэў. І гэта галоўнае пытанне наконт трэнерскага штаба. І ўжо зараз трэба дакладваць Прэзідэнту, што трэба паляпшаць умовы працы і заробак пачынаючым трэнерам. Гэта хто зараз будзе за 500 тысяч набіраць 60 дзетак для заняткаў? Калі мы не зробім высноў, тыя кадры, якія яшчэ ёсць, нешта зробяць, аднак пасля будзе катастрофа. Трэба правільна пабудаваць палітыку на медальныя віды спорту.

❑ ❑ ❑

— Трэнер без самаадукацыі ніхто. Ён зачахне, «заскарузне».

❑ ❑ ❑

— Аляксандра Герасіменя адна ў плаванні заваявала 2 медалі, а амерыканец Майкл Фэлпс — 5-6 медалёў. Вось дзе закладзены прагноз на 25 алімпійскіх медалёў. Калі правільна падысці да медалеёмістых відаў, эфектыўна выкарыстоўваць фінансаванне, Беларусь можа дасягнуць сапраўды многага, бо інфраструктура і ўмовы для гэтага створаны.

❑ ❑ ❑

— Замежных спецыялістаў мы можам запрашаць у тыя віды, дзе не можам выкарыстоўваць перадавыя тэхналогіі. Нам дакладна не пашкодзіў бы трэнер высокай кваліфікацыі і ў бегавых дысцыплінах. Але тут не толькі мы, але і амаль уся Еўропа адстае. Але адзінкі таленавітых бегуноў у нас усё ж такі нараджаюцца. Напрыклад, савецкі спрынтар Валерый Барзоў, наша Юля Несцярэнка, якая перамагла ўсіх у Афінах. Гэта сведчыць пра тое, што падобныя спартсмены з'яўляюцца ў нашым асяродку. Важна іх толькі знайсці і правільна развіць арганізм спартсмена.

❑ ❑ ❑

— Мяркую, кадравыя перамены будуць. І, магчыма, вельмі значныя. Найперш яны павінны быць у лёгкай атлетыцы. Ну а далей павінны стварыць сістэмную падрыхтоўку. Але ў нас нават даручэнні Прэзідэнта не выконваюцца. Пасля пазамінулай Алімпіяды ён сказаў на нарадзе, што дае 3 месяцы, каб склалі канцэпцыю падрыхтоўкі рэзерву. Ужо прайшло 4 гады. Я яе не бачыў.

Тарас ШЧЫРЫ

Сад стары пра дзяцінства маё нагадаў
Ажылі ва ўспамінах далёкія дні —
Дзед вучыў, як рыдлёўку трымаць, і казаў:
«Асцярожна рабі, каранёў не крані!»

Доўга я той няхітры наказ спасцігаў,
Не злічыць, колькі сцежак прайшоў і садоў,
Безліч крон-прыгажунь на шляху сустракаў
І дазнаўся пра кошт векавых каранёў.

У спякоту натоляць мяне карані,
Не дазволяць замерзнуць ў завеі ліхой,
Карані — гэта памяць мая з глыбіні,
Гэта тое, чым звязаны з роднай зямлёй.

А як век мой міне — лягу ніц ля дарог,
І дарогі на гэтым не скончацца, не!
На аджыўшым карэнні зялёны расток —
Прадаўжэнне былога у новай вясне.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

ФОТА СЛОВА

■ Ну і ну!

ПАГАСЦІЎ І ПАЕХАЎ НА АЎТО ГАСПАДЫНІ

35-гадовая жанчына раніцай паведаміла ў міліцыю аб тым, што ад дома, дзе яна жыве, угналі аўтамашыны «Ровер». Ужо праз дваццаць хвілін супрацоўнікі аддзела ДАІ Лёзненскага раённага аддзела ўнутраных спраў знайшлі аўтамашыну з тэхнічнымі пашкоджаннямі каля вёскі Міхалінава Лёзненскага раёна.

Папярэдне ўстаноўлена, што ноччу, знаходзячыся ў гасцях у жанчыны, 32 гадовы рабочы, раней судзімы, украў ключы ад яе аўтамашыны. Аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Даты | Падзеі | Людзі

1819 год — нарадзіўся (вёска Смолічы, зараз Дзяржынскі раён) Аляксандр Незабытоўскі, беларускі пісьменнік, філосаф, гісторык. Вучыўся ў прыватным французскім пансіёне ў Варшаве, Дэрпцкім універсітэце. У 1844-1847 гадах наведаў Францыю, Аўстрыю, Італію, Іспанію, Партугалію, Англію. За спробу перавезці свае і чужыя нелегальныя выданні быў арыштаваны. У ананімных кнігах, якія выдаваў у Вільні і Парыжы, а таксама ў рукапісах, заклікаў народ на барацьбу супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, патрабаваў адмены паншчыны. Аўтар мемуараў «Мае запіскі», прысвечаных паўстанню 1830-1831 гадоў. Памёр у 1849 годзе.

1869 год — нарадзіўся Махандас Карамчанд Гандзі. Людзі назвалі яго Махатма — гэта значыць «вялікая душа». Яго паважаў Леў Талстой і недалюбліваў Уінстан Чэрчыль. Яго лічылі рэвалюцыянерам, рэакцыянерам, дробнабуржуазным ідэолагам, «вялікім сынам Індыі», «бацькам нацыі», «архітэктарам свабоды», «сумленнем чалавецтва», прарокам і святым. Ён навучыў Індыю ўпарціцца ў праўдзе, не праяўляючы насілля, і павёў яе да свабоды і незалежнасці, кажучы: «Ненасілле, якое я прапаведую, — гэта актыўнае ненасілле моцных». «Ён стаў каля парога хацін тысяч абяздоленых, апрануты гэтак жа, як яны, — пісаў Рабіндранат Тагор. — Ён звярнуўся да іх на іх мове. У адказ на кліч Гандзі Індыя зноў была гатова для вялікіх здзяйсненняў».



1949 год — нарадзіўся (горад Мінск) Уладзімір Аляксандравіч Хрыпач, беларускі вучоны-хімік. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (2000), доктар хімічных навук (1990), прафесар (1997). З 1982 года — загадчык лабараторыі Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Беларусі. У 1992-1997 гадах з'яўляўся намеснікам галоўнага вучонага сакратара НАН Беларусі. Аўтар больш як 500 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій, больш за 60 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў. Праводзіў даследаванні ў галіне біяарганічнай хіміі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996).

Было сказана

Іпацій ПАЦЕЙ (1541—1613), царкоўны і дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, пісьменнік-палеміст:

«Любоў ёсць патрэба, каторай не меўшы, не трапіш на неба».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Хлеб. Агентура. Квадра. Бутэрброд. Кні-га. Аўт. Чабор. Рчынь. Аўтограф. Зра. Абзац. Пана. Тона. Ра. Аліна. Ешка. Кран. Бочка. Тэндар. Тагу. Кат. Лабаз. Бар. Засека. Тэраса. Шар. Кій. Пальчык. Аркан. Нюх. Нант. Задавака. Енк. Дадз. Атон. Танкер. Марыцца. Сноп. Канюк. Амар. Хаярзма.

Па вертыкалі: Аксельбант. Таіт. Жэтон. Абакан. Ікра. Аліна. Ешка. Кран. Бочка. Тэндар. Тагу. Кат. Лабаз. Дом. Горкі. Антэна. Тарэлі. Пол. Дама. Тэат. Алешына.





СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.14	18.43	11.29
Віцебск	7.04	18.31	11.27
Магілёў	7.04	18.33	11.29
Гомель	6.59	18.30	11.31
Гродна	7.29	18.59	11.30
Брэст	7.29	19.00	11.31

Месяц

Поўня 30 верасня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Марыі, Аляксея, Давіда, Ігара, Канстанціна, Мікалая, Ніла, Трафіма, Фёдара.*
К. *Дыянісія, Тэафіла.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+16..+18°С	КІЕЎ	+21..+23°С	РЫГА	+12..+14°С
ВІЛЬНЮС	+14..+16°С	МАСКВА	+11..+13°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+13..+14°С

УСМІХНЕМСЯ

Правільна выхаваны сын у старасці прынясе не шклянку вады, а кухаль цёмнага нефільтраванага.

— Я не істэрычка!

— Так, а хто ж ты, калі, пакуль я спаў, ты са мной пасварылася?

Метад «сухога мыцця» — гэта калі са скрыні з брудным адзненем дастаецца што-небудзь самае чыстае.

— Я завёў дома афрыканскага кракадзіла.

— А суседзі не скардзяцца?

— Якія суседзі!?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.130. Індэкс 63850. Зак. № 4393.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 1 кастрычніка 2012 года.